Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

***А. Я. Леванюк***

# ПАЦЕРКІ ЖЫЦЦЁВАЙ МУДРАСЦІ

***Беларускія літаратурныя афарыстычныя выслоўі***

Репозиторий БрГУ

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2018

УДК 821.161.3–84(038)
ББК 83.3–449 (4 Беи)я21
Л34

*Рэцэнзенты:*
першы прарэктар ДУА «Брэсцкі абласны інстытут развіцця адукацыі»,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**С.Р. Рачэўскі**

дацэнт кафедры беларускай філалогіі
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**У.А. Сенькавец**

Репозиторий БрГУ

**Леванюк, А. Я.**
Л34 Пацеркі жыццёвай мудрасці : слоўн. беларус. літ. афарызмаў / А. Я. Леванюк ; Брэст. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, каф. агульнаадукац. дысц. і метод. іх выкладання. – Брэст : БрДУ, 2018. – 266 с.

Слоўнік афарызмаў “Пацеркі жыццёвай мудрасці” з’яўляецца працягам выдання “Майстры кажуць” (Брэст, 2010). Выданне знаёміць чытачоў з яскравымі афарыстычнымі выслоўямі некаторых беларускіх майстроў слова. Прадстаўлена ўласная афарыстычная творчасць аўтара слоўніка. У канцы выпуску маецца спіс крыніц, афарызмы з якіх прыводзяцца ў кнізе, а таксама алфавітны паказчык імёнаў аўтараў.

Выданне адрасавана выкладчыкам, настаўнікам, студэнтам, усім, хто зацікаўлены праблемамі роднай мовы.

УДК 821.161.3–84(038)
ББК 83.3–449 (4
Беи)я21

# ЗМЕСТ


“Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму” (замест прадмовы) ....... 4
МЫ – БЕЛАРУСЫ ........................................................................................ 7
НАРОД І РАДЗІМА .................................................................................... 11
ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ...................................................................... 19
ВАЙНА І МІР .............................................................................................. 23
ВЕЧНАЕ І ЧАСОВАЕ.................................................................................. 25
УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА ......................................................................... 31
ВОЛЯ І СВАБОДА ..................................................................................... 35
СВАЁ І ЧУЖОЕ .......................................................................................... 37
ТВОРЧАСЦЬ І ІНТЭЛЕКТ.......................................................................... 41
МЭТА І СРОДКІ ЯЕ ДАСЯГНЕННЯ .......................................................... 47
ПАЧАТАК І КАНЕЦ.................................................................................... 51
ЛЁС І ШЛЯХ ............................................................................................... 53
ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ ..................................................................................... 57
ІСЦІНА І ХЛУСНЯ...................................................................................... 81
ПАМЯЦЬ І ЎСПАМІНЫ ............................................................................. 85
РАДАСЦЬ І СМУТАК ................................................................................. 89
ДАБРО І ЗЛО.............................................................................................. 93
ШЧАСЦЕ І НЯШЧАСЦЕ ............................................................................. 99
СЛОВА ПРАМОЎЛЕНАЕ І ПАЧУТАЕ ..................................................... 107
РОЗУМ І СЭРЦА........................................................................................ 119
ВЕРА І БЯЗВЕР’Е ...................................................................................... 125
ДУША І ДУХ .............................................................................................. 133
ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА .............................................................................. 139
ЧАЛАВЕК І ПРАЦА.................................................................................... 145
НАСТАЎНІКІ І ВУЧНІ................................................................................ 149
ЖАНЧЫНЫ І КАХАННЕ ............................................................................ 153
МУЖЫ І ЖОНКІ......................................................................................... 167
БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ......................................................................................... 173
МАЛАДОСЦЬ І СТАРАСЦЬ ...................................................................... 179
ЗДАРОЎЕ І ХВАРОБА ............................................................................... 183
СЯБРОЎСТВА ........................................................................................... 187
П’ЯНСТВА І ЦВЯРОЗАСЦЬ ...................................................................... 191
ГРОШЫ І БАГАЦЦЕ................................................................................... 195
ЧАЛАВЕЧЫЯ ЯКАСЦІ ............................................................................... 197
ДУМКА ДУМКУ ВЫКЛІКАЕ (*з уласнага*)................................................. 235
Паказчык імёнаў........................................................................................ 238
Спіс крыніц................................................................................................. 240


Репозиторий БрГУ

## “АФАРЫЗМЫ – ГЭТА ТЭРМІНОВЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ РОЗУМУ”
(замест прадмовы)

Як вядома, ва ўсіх краінах свету кожная сям’я лічыць неабходным мець у сваёй бібліятэцы зборнік афарызмаў. Такая кніга дазваляе лепш зразумець духоўны свет чалавека, дакрануцца да скарбніцы жыццёвай мудрасці. У ёй адлюстравана гісторыя нашай цывілізацыі не ў датах і лічбах, а ў думках, пачуццях і разважаннях. Узровень мыслення – з’ява гістарычная, якая прадугледжвае пераемнасць ведаў, што набываюцца ад пакалення да пакалення. І ў гэтым яшчэ адна з прычын папулярнасці зборнікаў афарызмаў: яны дапамагаюць чытачу пазнаёміцца з найбольш значнымі ўзорамі духоўнай творчасці мінулых эпох, не прыбягаючы пры гэтым да працяглага і іншым часам нялёгкага вывучэння першакрыніц, з якіх думкі здабытыя. Але менавіта ў гэтым – бляск і галеча афарызмаў.

З першых дзён жыцця любы чалавек імкнецца зразумець, асэнсаваць навакольны свет, сваё месца ў ім. Фарміраванне светапогляду заканчваецца толькі са смерцю. Любы з нас, нават той, хто не ведае асноў філасофіі, мае нейкі светапогляд, любы з цягам часу развівае і мяняе яго поўнасцю ці часткова, часам не асэнсоўваючы гэтага працэсу. Аднак змены можна выявіць, рухаючыся за думкамі чалавека на працягу дастаткова доўгага адрэзку яго жыцця. Можна прасачыць развіццё светапогляду групы людзей (пакалення, нацыі, рэлігійнай грамады) і ўсяго чалавецтва. Уласна, гэтым і займаюцца навукі і мастацтва. А зборнікі афарызмаў даюць чытачу магчымасць скласці пачатковае ўяўленне пра погляды той ці іншай эпохі.

Афарызмы цікавыя даследчыкам культуры, мастацтва, літаратуры, прыцягваюць вялікую ўвагу мовазнаўцаў сэнсавай ёмістасцю, арыгінальнасцю формы, асаблівасцямі структуры. Вывучэнне афарызмаў своечасова, паколькі дынаміка жыцця сучаснага свету, узровень развіцця грамадства дыктуюць неабходнасць звяртацца да змястоўнай маўленчай формулы. Узнікшы ў далёкім мінулым, афарызм устойліва і няўхільна развіваецца і ў нашы дні.

Наогул афарыстычны жанр у значнай меры трыдыцыйны, ён адносіцца да старажытнага і вельмі жывучага жанру літаратуры – да выслоўяў. Гэты выдатны жанр інтэлектуальнага мастацтва забяспечыў сабе дзіўнае даўгалецце і вялікую папулярнасць у народзе. Яго вельмі шанавалі вядомыя людзі ўсіх эпох і часоў. “*Моцныя, кароткія выразы вельмі садзейнічалі паляпшэнню жыцця*,” – гаварыў Цыцэрон. “*Максімы і афарызмы – праўдзівая жыццёвая мудрасць і соль літаратуры*,” – пісаў Д. Морлі. “*Кароткамоўе, быццам жэмчуг, іскрыцца зместам. Сапраўдная мудрасць нешматслоўная*,” – сцвярджаў Л. М. Талстой. Заўзятым

Репозиторий БрГУ

прыхільнікам афарыстыкі быў М. Горкі, які прызнаваўся, што “вельмі шмат вучыўся на прыказках, інакш на мысленні афарызмамі”. Якуб Колас таксама добра ўсведамляў мастацкую вартасць, філасофскія гарызонты гэтага жанру, вельмі ахвотна, шырока, плённа выкарыстоўваў афарыстыку, па-майстэрску ўводзячы выслоўі ў свае творы.

Само слова “афарызм” тлумачылася па-рознаму. У разуменні адных вучоных – гэта глыбокая павучальная думка ў вобразнай форме, на думку другіх – парадаксальнае меркаванне ў дасканалым стылі, якому перш за ўсё характэрна арыгінальнасць. Азначэнні афарызма, якія падаюцца ў энцыклапедычных слоўніках, таксама носяць разнастайны характар, але ўсе яны аб’яднаныя тымі характэрнымі рысамі, якія належаць толькі афарызму: літаратурная крыніца паходжання, ёмістасць, лаканізм.

Афарызмы з’яўляюцца адлюстраваннем ментальнага свету, уяўляюць сабой маўленчую рэалізацыю, што ўключае ў сябе як уласна лінгвістычныя, так і экстралінгвістычныя элементы. Афарызм, валодаючы структурнымі асаблівасцямі, спрыяе разважанням, з’яўляецца своеасаблівым каталізатарам думкі, працэсу ўзнікнекння ідэй, асацыяцый, і такім чынам ён цесна звязаны з паняццем “тэкст”.

Афарызм – гэта складаны моўны і маўленчы феномен. Ён уяўляе сабой структурнае ўтварэнне, якое валодае спецыфічнай унутранай арганізацыяй. Згодна з тэорыяй параджэння маўленчага выказвання А. А. Лявонцьева, выказванне запраграмавана ўнутрана. Гэта значыць, што яно будуецца на аснове некаторай схемы (ці па асобнай мадэлі). Выказванне, у тым ліку і афарыстычнае, з’яўляецца вынікам рэалізацыі моўных структур у маўленні. Менавіта таму трэба разглядаць афарызм і з пазіцый псіхалінгвістыкі. Гэта яшчэ абумоўлена і тым, што змянілася само паняцце мовы. Калі раней вывучаліся самі моўныя сродкі (фанетычныя, г. зн. гукавыя, граматычныя, лексічныя), зараз зразумела, што ўсе гэтыя моўныя сродкі толькі фармальныя аператары, пры дапамозе якіх чалавек здзяйсняе працэс зносін, прыкладваючы іх да сістэмы значэнняў і атрымліваючы асэнсаваны і цэласны тэкст (выказванне). Афарыстычнае выслоўе ўяўляе сабой мікратэкст, які і будуецца пры дапамозе ўсіх узроўняў мовы. Псіхалінгвістыка ўсё больш цікавіцца менавіта тэкстамі, іх спецыфічнай структурай, варыянтнасцю, функцыянальнай спецыфікай. Сам працэс параджэння новага выказвання запускаецца ў свядомасці аўтара пры дапамозе механізму пераўтварэнняў, які нараджае новыя тэксты. Несумненна, афарызм з’яўляецца прадуктам маўленчамысліцельнай дзейнасці. Мы мяркуем, што афарызм – гэта выказванне, якое пабудавана пры дапамозе гатовых формул, што захоўваюцца ў свядомасці чалавека. Менавіта даследаванне афарызма з пункту погляду яго структурных, кампазіцыйных і функцыянальных

Рэпазіторый БрДУ

асаблівасцяў можа растлумачыць працэсы параджэння афарызма, асаблівасці яго ўвядзення ў кантэкст і эксцэрпіравання з яго, а таксама раскрыць больш агульныя праблемы, у тым ліку заканамернасці стварэння выказванняў абагульненай семантыкі. Бясспрэчна, афарызм з'яўляецца вынікам сінтэзу, абагульнення, патрабуе паглыбленых разважанняў. У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца тэндэнцыя да актыўнага выкарыстання, вар'іравання і пераасэнсавання афарызмаў у мастацкай і публіцыстычнай літаратуры, перыядычным друку, на радыё, тэлебачанні, у жывой мове.

Аўтарскія выслоўі павінны складаць культурную спадчыну асобы з мэтай надання нашаму маўленню экспрэсіўнай афарбоўкі і ёмістасці. Акрамя гэтага, лексіка-семантычныя і граматыка-стылістычныя асаблівасці афарызмаў абумоўліваюць самую важную для малога жанру рысу – уваходжанне у культурны "набытак" асобы, г. зн. сітуацыйную запатрабаванасць, здольнасць быць заўсёды "да месца", спрыяючы ўзбагачэнню сучаснага жывога маўлення і пазбяганню будзённых слоў і штампаў. Для дакладнага, граматнага ўжывання афарыстычных выразаў неабходна вывучаць гэты магутны пласт духоўнай культуры, які вызначаюць па-рознаму – як самастойны філасофска-літаратурны жанр ці як сродак вобразнага і выразнага маўлення.

Перад вамі зборнік афарызмаў "Пацеркі жыццёвай мудрасці" ("Майстры кажуць-2"), які з'яўляецца працягам зборніка афарызмаў "Майстры кажуць…" (Брэст : БрДУ, 2010). Выданне змяшчае каля 2 000 афарыстычных выслоўяў беларускіх творцаў слова, размешчаных па пэўных тэмах. Адбор матэрыялу, як і ў першым зборніку, носіць суб'ектыўны характар, але пры падборы афарызмаў асаблівая ўвага надавалася зместу, улічвалася адукацыйная і займальная іх вартасць. У канцы выпуску маецца алфавітны спіс крыніц, афарызмы з якіх прыводзяцца ў зборніку, а таксама – алфавітны паказчык аўтараў, з твораў якіх узяты цытаты.

*А. Я. Леванюк*

Репозиторий БрГУ

# МЫ – БЕЛАРУСЫ

Репозиторий БрГУ



Будзь сам сабою, Беларус...

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 41]*

***

…зямля наша – дом наш, яна – магіла прашчураў і калыска будучых пакаленняў нашых!

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 47]*

***

Недарма ж кажуць: беларус цярплівы – цярпіць-цярпіць, а ўрэшце раптам хапае сякеру і зразу – абухом па лбеваліць!

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 95]*

***

Паспрабуйце любіць Беларусь не здалёку, а зблізку, такую, якая яна ёсць. Паверце, яна вартая таго!

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 1]*

***

Беларусь у гісторыі, як жанчына ў жыцці.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 340]*

***

Не Бог для Беларушчыны, нават не Беларусь пад Богам, а Беларусь для Бога, Беларусь як Божае, як Бог – Беларусь…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 360]*

***

Беларуса ў часы змен спыталі, што лепш: не бачыць ці не чуць? Ён адказаў: “Лепш уначы не чуць, а ўдзень – не бачыць”.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Вялікая колькасць людзей памрэ і ніколі не пакаштуе французскага шампанскага і ананасаў. Але не меншая колькасць людзей памрэ і ніколі не пакаштуе беларускай самагонкі з салам.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

…часам здаецца, што беларусы вылепленыя з воску, – гэтак лёгка прымаюць любыя формы пад сонцам часу – абы не быць самімі сабою…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 58]*

Репозиторий БрГУ

***

…каб хто загадаў беларусу быць беларусам, не было б лепшага беларуса…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 58]*

***

У кожнай ракавінцы – гучыць мора, у кожным камяні і ў кожнай валошцы – жыве Беларусь.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 253]*

***

Даравацьі забываць – гэта мы, беларусы, умеем.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 376]*

***

«Сам вінаваты» – улюбёная фармулёўка на Беларусі ўсіх часоў.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 306]*

***

Любіць нас, беларусаў, таксама трэба з немалой цярплівасцю.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 177]*

***

Не згіне мова наша ў блудзе!
Яна нам светач – на вякі!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 266]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# НАРОД І РАДЗІМА




Репозиторий БрГУ

***

Народ і ў грубасці сваёй мудры.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 157]*

***

У народа ёсць усё.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 383]*

***

…ёсць народы, як і паасобныя людзі, прызначаныя быць не толькі месіямі чалавецтва, але і яго адкупіцелямі.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 138]*

***

Няхай жа кожны, у кім дух народа не згас, чыя душа парвала іржавыя нявольнічыя путы, хто перастаў чуцца прадажным таварам, а пачувае ў сабе дух чалавека – няхай словам і дзелам сведчыць цёмным братам сваім, што і яны такія ж людзі, як і іншыя; няхай нясе сваю бацькоўскую мову ў жыццё, у свет, вучыць лічыць нацыянальную справу справай сваёй.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 151]*

***

…чым бліжэй родныя мясціны, тым болей кіслароду.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 95]*

***

…Усе мы – як лісці на дрэвах… Пакуль вецер часу не адарве нас ад галінкі, праз якую мы злучаны з дрэвам, мы расцём, зелянеем. Мы жывём!.. Варта ж толькі нам адарвацца, пакінуць галінку – мы кружымся, лётаем у паветры, не ведаем, што нам рабіць, дзе падзецца. Потым, у адчаі, так і не сабраўшыся з думкамі, падаем на зямлю. І з той хвіліны перастаём быць самімі сабою, мы губляемся сярод іншых – такіх жа самых лісцяў, як і мы. І гінем…

Дрэва без лісцяў хоць і ўсыхае, але ўсё ж астаецца дрэвам. Лісці ж без дрэва – тлен, нішто…

Але мы не толькі лісці, мы яшчэ і насенне, мы можам самі стаць дрэвамі. Кім быць – лісцем ці дрэвам – гэта ўжо залежыць ад нас саміх…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 107]*

Репозиторий БрГУ

***

Абы зямля, а людзі знойдуцца.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 171]*

***

Улада быццам народная, а народ…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 301]*

***

Бежанства, браце, гэта не радзіма.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 19]*

***

Калі хочаш нашкодзіць дзяржаве – забарані.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 130]*

***

Незаменных людзей няма, зямля, як гаворыцца, усіх прыме, бацькаўшчына – не ўсіх.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 238]*

***

Улада пакрывае ўладу.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 257]*

***

Я ніколі не шукаю і не чакаю натхнення, любоў да Радзімы – маё заўсёднае натхненне.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Пытаешся, дзе радзіма? Дзе пахавана твая маці, там і радзіма.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Для бездухоўнага чалавека не існуе паняццяў Радзіма, народ.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360)*

***

Любіць трэба ўсе народы, а песціць свой.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

Репозиторий БрГУ

***

Пытаешся, які народ нікчэмны? Дзе ў меншасці пустыя галовы, а ў большасці злыя душы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Пытаешся, як праславіцца? Дапамагай асвеце народа, умацоўвай яго нацыянальную самасвядомасць, вучы любіць і шанаваць сваё, і ён адкрые цябе для сябе і праславіць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Чым вышэйшы ўзровень культуры таго ці іншага народа, тым больш таленавітых людзей з гэтага народа ведаюць у свеце.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Часцяком твары палітыкаў, якіх адхілілі ад улады, нагадваюць незавостраны аловак ці сапсаваную запальнічку.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Небяспечна жыць у краіне, дзе рэйтынг кандыдата ў прэзідэнты зніжаецца ў сувязі з павелічэннем цаны на гарэлку.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Наш славянскі менталітэт такі, што зло новай улады пачынаецца з помсты папярэдняй.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Пытаешся: ці заўсёды галеча непазбежная? Да таго часу, пакуль багацце абавязковае.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Ці здужае народ стаць асобай? Вось у чым пытанне.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

Розніца паміж рускім, што жыве ў Расіі, і нярускім, што жыве ў Расіі: рускі пракручвае свае праблемы вакол Расіі, нярускі пракручвае Расію вакол сваіх праблем.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

Репозиторий БрГУ

***

Дэмакратыя пачынаецца, калі ад слоў пераходзяць да справы, а канчаецца, калі ад спраў пераходзяць да слоў.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Патрыятызм – гэта ўпрыгожванне Радзімы талентамі і справамі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Калі грамадства ператварае волю ў разбэшчанасць, яна сыходзіць з грамадства.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Народ не дурны, але часцяком абдураны.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

Пытаешся, што такое дыктатура? Гэта калі палова нічога не ведае, другая палова ведае, але маўчыць. Тых жа, хто падштурхоўвае першых і другіх да ісціны і праўды, чакае альбо эміграцыя, альбо турма, альбо куля.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Не чапай уладу, пакуль улада не зачапіла цябе.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 394]*

***

…народ жыве цяжка тады, калі на капейку ці на рубель нічога нельга купіць.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 404]*

***

Ёсць рэчы, што на працягу тысячагоддзяў абавязковыя ў спісе спадчыны. Гэта дом, гадзіннік, посуд, свойская жывёла. Слава адвечным спадарожнікам чалавека.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

На кожнай пасадзе можна служыць свайму народу…

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 51]*

Репозиторий БрГУ

***

…калі народ не вяртае сваіх паэтаў, мастакоў, сваіх мудрацоў і сваіх герояў, ён захворвае.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 237)*

***

Перш чым увязвацца ў палітыку, трэба хаця б сваю партыю свядома выбраць.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 64]*

***

Але культура вымяраецца не толькі грашовымі асігнаваннямі, а перад усім – духоўным станам народа.

*Купава М. На звалку вывозілі... нашу памяць [40, с. 3]*

***

Калі ў чалавека выхавана любоў да Радзімы, ён паўсюль будзе памятаць пра свой абавязак перад ёй.

*Колас У. Перамога [35, с. 2]*

***

Дарога дамоў заўсёды жаданая і карацейшая.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 45]*

***

Прастата ад народнасці і культуры.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 112]*

***

Чаго-чаго, а дзяржаўнасці ды свабоды дарма не даюць, іх трэба адваяваць.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 173]*

***

Праўду кажуць, што край – то абычай.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 266]*

***

…няма ў нас голаду па ўладзе, а толькі ёсць голад па справядлівасці.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 96]*

***

Абыходзь уладык зямных за попрышча.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 175]*

Репозиторий БрГУ

***

На свеце лепшага кутка няма,
Чым той куток, дзе маці нарадзіла.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 90]*

***

Раднейшага няма нічога ў свеце,
Як хлеб і музыка, як музыка і хлеб!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 247]*

***

Народ – ён быў, і ёсць, і будзе!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 266]*

***

Шануй, народзе, і цані –
Усё, што поіць-жывіць шчыра
Тваёй свабоды карані!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 62]*

***

Для ўсіх і кожнага –
на свеце
Найпрыгажэйшы родны край!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы[16, с. 78]*

***

Няма Радзімы ў злыдняў хіжых
І Маці ў нелюдзяў – няма.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 99]*

***

Што ж, знаць прыемна і не лішне,
Чым слаўны ў свеце родны край.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 119]*

***

Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і можа мець сілу і права.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 36]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ГІСТОРЫЯ
# І СУЧАСНАСЦЬ



***

Рэшта гісторыі – у вясковых паданнях.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 317]*

***

За паўстагоддзя з гакам многа і пражыта, і перажыта, і сёе-тое зроблена. Але яшчэ больш – змарнавана часу…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 390]*

***

Памылкі мінулага можна выпраўляць толькі мемуарамі.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 390]*

***

Гледзячы на партрэты тых, што жылі даўно. Яны не толькі жылі, але ж і адчувалі сябе *без нас* зусім нармальна, і нават не здагадваліся, што мы, іменна такія, як мы ёсць, персанальна калісьці будзем.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 392]*

***

Думаецца, Савецкі Саюз у чыстаце сваёй ідэі быў цікавы як найбольш выразная, ідэалёва задуманая адна з рэалізаваных утопіяў "у свеце гэтым".

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 82]*

***

У гісторыі заўсёды ёсць недасканаласць, інакш "гістарычнае" не памірала б, не станавілася мінулым.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 85]*

***

Маналіт распаду мінулага цячэ ў няпэўнасці цяперашняга і застывае ў крохкай невядомасці будучага.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 157]*

***

Камунізм яшчэ доўга будзе паміраць у назвах вуліц.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Калі бачыш, што нічым значным не застаешся ў гісторыі, адшукай хаця б аднаго вялікага, які нарадзіўся з табой у адзін дзень, і тым суцешышся.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

Репозиторий БрГУ

***

Кесары, мытары, фараоны, цэзары, прынцы, князі, баяры, паны, мяшчане, стацкія саветнікі, сакратары абкомаў – усё сышло, не сыходзяць адно багатыя і бедныя.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

Самы магутны метад забыцця – змена летазлічэння.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Прыкметы нашых змен – гэта калі камуністы не могуць, а капіталісты не хочуць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Усю сусветную гісторыю можна вытлумачыць і так – гэта пошукі раба розумам, грашамі і зброяй.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Гісторыя – гэта не стос фотаздымкаў, якія можна тасаваць, укладаць у рамачкі, спальваць… Гісторыя можа забіваць і ўваскрашаць. А вы з ёю, як з уласным нататнікам… Упісаў нешта, выкрасліў…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 223]*

***

Мінулае, з якога не пракладзеныя сцяжынкі ў будучыню, перастае існаваць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 349]*

***

Гісторыя ў кожнай нацыі крывавая. Веліч і злачынства заўсёды побач…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 380]*

***

Толькі той, хто паважае гісторыю і мову свайго народа, мае гонар чалавека.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 380]*

Репозиторий БрГУ

***

Гісторыя роду – не толькі ваенныя трафеі ды фамільныя партрэты. Гэта – цяжар, які сумленнага змушае схіліцца перад праўдай, а чэрствага – кінуць праўду пад ногі свайму гонару.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 19]*

***

Чым валодае чалавек? Мінулага – ужо няма… Будучыня – не настала. А той эфемерны адрэзак цяперашняга, над якім ён уладны, дзе ён можа рабіць свой выбар між злом і дабром, – які ён?

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 111]*

***

Тое, што ўчынялі продкі, адбіваецца на нас, але й тое, што мы ўчыняем, – ведаюць продкі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 191]*

***

На целе гісторыі застаюцца не пацалункі, а шнары.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 237]*

***

…гісторыя сведчыць, што чым болей скрадзена, тым менш верагоднасці, што злодзей будзе пакараны.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 171]*

***

У гісторыю ўсе ідуць пешша, і яна сама выбірае сабе палюбоўнікаў.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 18]*

***

Гісторыя – лесвіца крутая, з ненадзейнымі прыступкамі, а значыць, не ўсім і не заўсёды зручная, і такой павінна яна заставацца, нечакана небяспечнай, такой яе павінны ведаць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 258]*

Репозиторий БрГУ

# ВАЙНА І МІР



Репозиторий БрГУ

***

Усе на вайне згарэлі, хто душой, хто целам, як каму наканавана.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 140]*

***

Кожная вайна бывае страшнейшая за тую, што была.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 168]*

***

Вайна і смерць – самыя родныя і блізкія сваякі і, у адрозненне ад людзей-сваякоў, адна без адной жыць не могуць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Калі нават на чале войска на чужую тэрыторыю ўвойдзе разумны і мудры генерал, ён усё роўна застанецца ў гісторыі як дзікі акупант.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

…на вайну ідуць паміраць, хоць кожны спадзяецца на свайго бога.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 67]*

***

Мужык ваюе – зямля плача.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 74]*

***

Слязьмі пачынаецца вайна, слязьмі не канчаецца.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 76]*

***

Вайна вайной, а чалавеку хочацца жыць, і ён – насуперак усім страхам смерці – думае пра жыццё.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 180]*

Репозиторий БрГУ

# ВЕЧНАЕ І ЧАСОВАЕ


Репозиторий БрГУ

***

Кожнаму чалавеку, кожнай яго справе ёсць судны дзень, ёсць судны час.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 114]*

***

Ляціць час, бы тая ракета.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 24]*

***

…усе ахвяры самі вінаваты… Яны паяўляюцца ў небяспечным месцы і ў небяспечны час.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 296]*

***

Я адчуваю часу смак,
таму й сачу яго няўзнак.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 18]*

***

Хто ведае сваю будучыню? Магчыма, не так усё і страшна!

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [45, с. 37]*

***

…час сцірае нават надпіс на камені.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 167]*

***

Прыкметы старэй за звычай і закон!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 335]*

***

…акрамя ўлады неба, ёсць улада часу.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 57]*

***

Час прасветліць і ўсё расшыфруе сам.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 201]*

***

У разлуцы мы не паміраем, жывём надзеяй на сустрэчу, што заўсёды будзе новай, як заўсёды здзіўляе сваёй навізной новы дзень, у якога старыя атрыбуты: сонца, месяц, неба, дрэвы, машыны, людзі…

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 348]*

Репозиторий БрГУ

***

Пяць хвілін. Праходзіш іх у ахвоту і хутка. У чаканні ж яны пакутлівыя і марудныя.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Час узбуйняе мастака. Чым далей ён ад нас, тым значнейшымі здаюцца нам яго творы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Хто і куды хавае ад нас Час, хавае надоўга, калі не назаўсёды?

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 406]*

***

Чым страшнейшы час – тым прыемней слухаць выдуманыя жахі…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 6]*

***

Калі адбываюцца перамены – гэта заўсёды пакутліва, але калі не зламаецца вонкавая, цвёрдая абалонка – не пакажацца жывое, датклівае цела часу.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 39]*

***

…здараюцца імгненні, якія фармуюць чалавека, як рукі майстрыхі цеста.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 47]*

***

Так, час усіх пазначае сваёй кіпцюрыстай цяжкой лапай.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 96]*

***

…колькі людзей лічылі сябе сумленнымі толькі таму, што прамаўчалі, не далучыліся да агульнага гарлання ўхвалаў. Вось толькі час іхняга маўчання не пачуў.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 155]*

***

Нам толькі здаецца, што наш час – самы важны.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 53]*

Репозиторий БрГУ

***

Што ж, яно так заўсёды – час гарматаў і час паэтаў змяняюць адзін аднаго ў вечнай каруселі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 146]*

***

З цягам часу шмат што пераацэньваецца, і рэчы, якія раней здаваліся нязначнымі, усведамляюцца вельмі істотнымі, і робіцца сорамна за тое, што ты імі пагарджаў.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 34–35]*

***

Ты згасіш сонца, час, але не згіне
Наш род людскі – каманда карабля, –
Ён мачтавыя сосны не пакіне,
Пакуль ім будзе палубай зямля.

*Куляшоў А. Ты згасіш сонца, час, але не згіне… [39, с. 119]*

***

І час ляціць! – для ўсіх абмежаваны
Хваробаю, нястачаю, вайной.

*Куляшоў А. Варшаўскі шлях [39, с. 192]*

***

Па-рознаму адлегласць паміж стартам
І фінішам нам адмярае час.

*Куляшоў А. Устоіць той, хто варт… [39, с. 130]*

***

Час – лекар болю, а яго шпіталь –
Без краю, без пачатку памяшканне.

*Куляшоў А. Пра боль [, с. 142)*

***

Час – лекар болю, боль – жывая рана,
Дзіця, не ўтаймаванае нічым:
Ні вечнай калыханкай акіяна,
Ні вечнасці надвор'ем штармавым.

*Куляшоў А. Пра боль [39, с. 142]*

Репозиторий БрГУ

***

Час – гэты няўмольны садоўнік – адсякае кожную галінку, на якой намеціўся хоць нязначны намёк на магчымае ўсыханне. Адсякае галіны, не думаючы пра тое, што, нават мёртвыя, яны звязаны з каранямі, і, секучы іх, ён сячэ і само карэнне.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 260]*

***

За намі вечнасьць,
перад намі нішто…

*Папека М. Чарнавікі [47, с. 80]*

***

…як ні прытрымлівай час, неўзабаве робіцца сухім дно самых глыбокіх збаноў і келіхаў.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 251]*

***

Толькі на імгненнях можна праверыць чалавечую сутнасць – на імгненнях, з якіх складаецца вечнасць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 52]*

***

Усе на час прывыклі звальваць, а не на людзей. Людзі і ёсць час. Якія людзі, такі і час.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 271]*

***

Як лёгка задаюцца пытанні і як лёгка чыніцца суд – над часам, над людзьмі і нават над самім горам народным!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 6]*

***

Страшна бывае ад думкі, што родныя, сябры, што твой цудоўны сынок – толькі сустрэчныя на бязмежнай дарозе часу, паміж небыццём, што было, і небыццём, што будзе. Што мы не бачыліся з сынам, з другам мільёны год, і хутка зноў не будзем бачыцца – ніколі!..

Якія жудасна шчаслівыя гады і дні нашай любві, дружбы, і як жа часта мы марнуем іх на пустое!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 389–390]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА



Репозиторий БрГУ

***

Каб акрылена жыць сёння і ўпэўнена крочыць у заўтра, трэба ведаць, што было ўчора.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 5]*

***

Усё даўнейшае нам цяпер толькі цень.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 259]*

***

Вось праблема – ведаць, што ты жывеш толькі сёння, што няма чаго адкладваць многае на заўтра, няма чаго кудысьці ўсё спяшацца… А чаго? Каб потым азірнуцца і заплакаць? Што бег ды не дабег, а многае мінуў…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 392]*

***

Навошта заўважаць невясёлае; хто ведае, якая будзе будучыня; давайце жыць сённяшнім днём.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 163]*

***

Лепшае ж заўсёды там, наперадзе. Лепшае – гэта тое, чаго яшчэ не было, нязведанае.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 41]*

***

Заўсёды наперадзе ў чалавека павінна быць загадка нейкая, таямніца. Няхай невялікая, па чалавеку, па яго розуму, але павінна быць у жыцці кожнага загадка, як і справа неадкладная заўсёды павінна быць у яго.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 149]*

***

Няхай лёс сам кіруе будучым.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 69]*

***

Трэба знайсці сілы і смеласць насіць у сабе мінулае, і яно дапаможа не баяцца смерці.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 258]*

Репозиторий БрГУ

***

Сапраўднае і каштоўнае толькі сёння, мінулае хіба што перасцерагае нас ад памылак.

*Марчук Г. Рэўнасць [46, с. 352]*

***

Упэўненасць у заўтрашнім дні мае толькі страўнік.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Пакліч – былое адгукнецца
Жалейкаю за хваіной;
Скраніся – і важкой хадой
Наступнае ў паход кранецца.

*Куляшоў А. На паўмільярдным кіламетры [39, с. 111]*

***

Будзе добра ўсё – будзе і заўтра, а не так складзецца лёс – што ж, добра, што было "ўчора" і было "сёння"…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 180]*

***

Мінулае нельга перайначыць, бо нельга вярнуць учарашні дзень і тую маланку, што аднойчы бліснула на небе.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 382]*

***

Той, хто лёгка адмаўляецца ад учарашняга, не варты заўтрашняга.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 418]*

***

…без мінулага і будучыні няма.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 63]*

***

Усё ў чалавеку, што робіць яго чалавекам:
І памяць, і клопат надзённы, і мараў разбег.
Таму і не проста яго зразумець, што ў сабе
Сучаснасць ён лучыць з мінулым і будучым векам.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 189]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ВОЛЯ І СВАБОДА



Репозиторий БрГУ

***

Збажына і тая расце іначай на вольнай зямлі.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 83]*

***

Дзіўна, аднак, штó часам робіць, як п’яніць чалавека пачуццё волі!

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 21]*

***

Чалавек моцнай волі?

Чалавек, які можа памерці, калі захоча, і які ніколі не памрэ сам, як бы да гэтага ні прымушалі абставіны.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Калі паміраеш для свету – набываеш волю.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 214]*

***

Воля – апошняе суцяшэнне няўдачніка.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 7]*

***

Нельга даць волю чалавеку насуперак яго волі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 39]*

***

…з чужымі гарматамі воля не прыходзіць.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 69]*

***

Запраўднае – калі вольны, калі маеш змогу выбіраць кірунак і рухацца…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 312]*

***

Чым большая гатоўнасць прыняць, не трацячы любасці, ганьбу ў свеце і перад светам, тым большая вольнасць ад яго, ад свету.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 355]*

***

Тыя, што хочуць жыць без нашых клопатаў, пасылаюць нас. Што ж… Так у іх з’яўляецца хоць нейкая ілюзія свабоды…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 87]*

***

Хай хвойку жую, ды на волі жыву.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

Репозиторий БрГУ

# СВАЁ І ЧУЖОЕ



***

…у кожнага сваё шчасце, у кожнага свае памылкі…

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 241]*

***

Кожнай песні – свой час.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 94]*

***

Рацыянальна – пастаянна забіраць сваё і для сябе ад кожнага дня.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 120]*

***

Рацыяналіст забірае сваё і для сябе ад кожнага дня.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Калі няма сваёй рукі, не разлічвай на цуд.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Занатаваць хоць нешта, стварыць самую сябе з мазаікі слоў… І таго досыць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 392]*

***

…што аддаў – тое і тваё!

*Ліпскі У. Мы [43, с. 203]*

***

О, многа можна дазнацца пра ўсякае наскае, але не з кніг толькі…

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 51]*

***

Сваё мусіць заўсёды быць даражэйшае за чужое, нават калі яно, чужое, лепшае – звычайная праграма захавання і жывёльнага віду, і чалавечае нацыі. Хіба беларусы страцілі свой прыродны ахоўны код?

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 93]*

***

Проста ў кожным народзе ёсць свае дурні і свае мудрацы, здраднікі і героі, правадыры і дзівакі…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 220]*

***

…і чалавек дзічэе сярод чужых, і дрэва таксама.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 23]*

Репозиторий БрГУ

***

…толькі дурні могуць думаць, што недзе нешта ёсць, што не мела свайго імя.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 35]*

***

У кожнага чалавека ёсць куткі ў сэрцы, куды ён і сам не любіць лішні раз заглядваць, а тым болей – пускаць чужое вока.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 252]*

***

Усенароднае мы адчуваем праз сваіх.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 33]*

***

Сваё месца, адчуванне дыстанцыі – гэта карысныя адчуванні.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 113]*

***

Чаму я павінен маўчаць, адкладаць на далей *свае* думкі і пачуцці з нейкіх палітычных меркаванняў, як быццам вышэйшых за маё *чалавечае* права на свабоду, на адно толькі жыццё?..

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 158]*

***

Хораша гэта – месца на сваёй зямлі...

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 373]*

***

Кожны мае свой бор, родны бор на зямлі…

*Куляшоў А. Маё сэрца ў бары [39, с. 100]*

***

Гадзіннік мой – не сонца, што ў зеніце,
Гадзіннік мой – не сэрца, што ў грудзях.
Сваім дакладным часам на арбіце
Сама зямля мой вымярае шлях.

*Куляшоў А. Гадзіннік мой – не сонца, што ў зеніце… [39, с. 115]*

***

…хлеб, чужым нажом кроены, нясмашны.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 45]*

***

Сваю гісторыю і свае законы мы будзем пісаць сваёй, а не чужой мовай.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 364]*

Репозиторий БрГУ

***

Любі сваё, і не захочаш красці чужое.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 447]*

***

Ды, пэўна, так яно і вядзецца здавён, што свае б'юць балючэй, бо ведаюць, куды ўдарыць, як ударыць, ведаюць, якіх балячак ты асабліва не любіш.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 110–111]*

***

Кожны з нас дзве торбы носіць: адну перад сабою, другую – за плячамі. У пярэднюю складваем чужыя памылкі, у заднюю – свае.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 424–425]*

***

Каб жа некаторым навучыцца спасціжэнню чужых памылак.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 63]*

***

Лягчэй за ўсё раіць чужой сям'і таму, хто яе сам ніколі не меў, гэтак жа сама як меркаваць пра дзяцей, не нарадзіўшы іх.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 308]*

***

У чужых руках і праўда усё лепшае.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 358]*

***

Не сумняваючыся, не знойдзеш *сваё* (выдзелена аўтарам. – А. Л.); не знайшоўшы сваё, ты чалавек-тэлеграф, які перадае толькі чужыя думкі.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 394]*

***

А чужое прачытае з сшытка
І – глядзіш – разумным праслыве.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 34]*

***

Усе сваё перабудуць: хто пазней – хто раней.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 18]*

Репозиторий БрГУ

# ТВОРЧАСЦЬ І ІНТЭЛЕКТ



Рэпазіторый БрДУ

***

Творчасць – гэта вечны сыход упрочкі ад тых, каго любіш.

*Акудовіч В. [7, с. 54]*

***

Пакуты не згубныя для творчасці – яе губяць дробныя клопаты.

*Белая А. ***Пакуты… [7, с. 64]*

***

Аблічча ж з адбіткам інтэлекту ніколі не было прыметай заможнасці.

*Белая А. Сублімацыя, або З хронікі маршрута № 7 [7, с. 78]*

***

…грэшна насіць назапашаную творчасць у партфелі.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 154]*

***

...як захопліваюць чалавека нязмерная радасць і шчырае шчасце, калі ён бачыць, што рукі яго твораць адну пекнату.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 337]*

***

Звычайнае вока часта глядзіць на золата і думае, што гэта камень. Звычайнае вока не захапляецца парывамі вялікай душы, не блішчыць агнём шчырага падзякавання вялікаму майстру.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 340]*

***

Няўжо так было заўсёды і так заўсёды будзе, што некаторым з найбольш таленавітых трэба прабівацца да чытача з незвычайнымі цяжкасцямі ды перашкодамі, як потым акажацца – лішнімі і шкоднымі не толькі для носьбіта таго жывога агню, але і для сапраўднай літаратуры? Потым акажацца… А тое потым прыходзіць не толькі позна, але ж і запозна. І вінаватых як быццам няма…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 428]*

***

Тым, каму “мала” дадзена, каб дасягнуць поспехаў, трэба быць вельмі, “па-бізнэсоўску”, ашчаднымі ды абачлівымі.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 81]*

Репозиторий БрГУ

***

Сапраўды геніяльнае акторства заўсёды надужыццё, гульня на даверы. За кошт найвышэйшага…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

Каб гарэць для агульнага вар'яцтва, не абавязкова быць з іншага матэрыялу. Дастаткова ісці ў разрэз і на вялікай хуткасці.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 157]*

***

Запраўднае мастацтва – нескарыстаная эротыка, застыглая ў вольным выбары.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 336]*

***

Рэрыхнутасць – эзатэрычны опіум для абраных.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 340]*

***

Творчасць – пакора перад Богам, а не перад светам, хоць часцей, на жаль, наадварот…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 356]*

***

Не могучы ці баючыся дасягнуць дасканаласці – выкідваюцца праз акно?

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 358]*

***

Маленькія любяць вышыні, але не прыстасаваныя да іх. Вялікія ж маглі б там абжыцца, але з-за сваіх памераў – не дадуць рады адарвацца ад долу…

*Касцюкевіч М. Адзінотны чалавек [33, с. 152]*

***

Ну, што ж зрабіць, калі чалавеку адмоўлена ў таленце? Аднак абавязак выхаванага чалавека зрабіць выгляд, што ён гэтага не заўважае…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 192]*

***

Рыбак, які мае намер злавіць рыбу, павінен быць цярплівым на ўсю яе велічыню.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 88]*

Репозиторий БрГУ

***

Саступаеш новаму новаму пакаленню шлях, перадай талент.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 27]*

***

Як гэта важна і надта ж патрэбна чалавеку – захаваць і памнажаць свой талент, пераемнасць традыцый духоўнасці – вось шлях да захавання непаўторнасці сваёй асобы і ўрэшце – узмацнення веры ў жыццёвы аптымізм і бессмяротнасць свайго народа.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 256]*

***

Калі ты таленавіты і не багаты, значыць, ты не таленавіты!

*Марчук Г. Невена – жонка дыпламата [46, с. 326]*

***

Знешнасць для акцёра – яшчэ не ўсё, галоўнае – талент!

*Марчук Г. Трагікі і комікі [46, с. 332]*

***

Калі ў кампаніі простых людзей табе кажуць, што ты таленавіты, – гэтага дастаткова, калі ж у кампаніі тваіх калег табе кажуць, што ты таленавіты, табе гэтага чамусьці замала.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Геній адрозніваецца ад простага смяротнага тым, што ў яго няма геніяльных запатрабаванняў і прэтэнзій.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Калі змовяцца несумленныя і зайздросныя людзі, дык можна на вельмі доўгія гады замоўчаць вялікі талент.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

У генія ёсць адна асаблівая здольнасць – знаходзіць творчасць ва ўсім.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

Репозиторий БрГУ

***

Крытыка – нахлебніца пры талентах.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

…гэта якраз і ёсць уласцівасць праўдзівага творчага чалавека – бачыць тое прыўкраснае, чаго яшчэ няма, і не заўважаць таго паскудства, што ёсць навокал.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 307]*

***

Ах, мастацтва, мастацтва… Ты ў жыцці не што іншае, як белыя пялёсткі вакол брудна-зялёнай кветкавай сарцавіны з будучым насеннем.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 497]*

***

Ёсць у паэта свой аблог цалінны,
Некрануты прастор для баразён,
Дзе ён працуе з першае хвіліны
І да апошніх вечаровых дзён.

*Куляшоў А. Ёсць у паэта свой аблог цалінны… [39, с. 112]*

***

Срэбра ззяе раскошай,
І сыта яно і адзета,
Толькі бедна натхненнем –
Адзіным багаццем паэта.

*Куляшоў А. На пасадзе цяжкой [39, с. 158]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# МЭТА І СРОДКІ ЯЕ ДАСЯГНЕННЯ



Рэпазітарый БрДУ

***

Рызыкуй, дзейнічай – і ўсё будзе!

*Ліпскі У. Мы [43, с. 35]*

***

…хацець лятаць ніхто не забараняе, жадаць гэтага – ужо адчуваць сябе на вышыні.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 58]*

***

Хто не падае духам, той уздымаецца на вызначаную вышыню!

*Ліпскі У. Мы [43, с. 174]*

***

...не сядзіцца таму чалавеку, каторы мае які-небудзь інтарэс ды яшчэ не справіў яго.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 172]*

***

Раскрыццё таямніцы ўражвае па-рознаму.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 324]*

***

Колькі ўсяго непазнанага, і не пазнаеш яго як след, пакуль прыйдзецца ўсё пакінуць…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 388]*

***

Зусім не хістаюцца толькі слупы, асабліва – глыбока ўкапаныя.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 395]*

***

Адмаўленне ніколі не зліецца са сцвярджэннем, інакш яно перастане быць адмаўленнем і гармонія парушыцца.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 156]*

***

…ня было чаго рабіць, вырашыў дасягнуць мэты…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 332]*

Репозиторий БрГУ

***

Вера і старанне – асноўнае ў дасягненні пастаўленай мэты.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 125]*

***

Цяжкасці падпітваюць жаданне.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 97]*

***

Няўдачы толькі абвастраюць жаданні.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 239]*

***

Без прыкметы не дойдзеш да мэты!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 335]*

***

Формы работы мяняюцца, а мэта – застаецца.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 413]*

***

Пачынаюць з малога, а канчаецца вялікім, ад гэтага нікуды не ўцячэш. Іншаму здаецца, што Зямля прападзе, калі ён не пераверне на ёй усё дагары нагамі, а выходзіць наадварот.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 18]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ПАЧАТАК І КАНЕЦ



***

Дзе не было пачатку, не будзе і канца.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Не пачаўшы – думай, а пачаў – рабі!

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Лёгкія ногі на парозе ў невядомае.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 165]*

***

Чалавеку на ўсё толькі адважыцца трэба, толькі пачаць, тады ўжо не ведае ён ні канца, ні краю…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 103]*

***

Усяму павінна быць мяжа, усяму ёсць канец.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 115]*

***

Толькі пачатак і канец даюць адчуць бясконцасць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 157]*

***

Калі ёсць у сэрцы любоў да ўсяго жывога – вось пачатак шчасця.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Усе мы яшчэ вельмі слабыя, зайздросныя, злыя, каб разгадаць усе таямніцы да канца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

…толькі дзівакі лічаць, быццам усё пачынаецца і канчаецца імі і быццам свая пядзя самая вялікая.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 19]*

***

Ва ўсім ёсць свой канец, і ён заўсёды прыходзіць, любім мы гэта ці не…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 157]*

***

…канец – пачатак новага.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 88]*

Репозиторий БрГУ

# ЛЁС І ШЛЯХ

Репозиторий БрГУ



***

Але не мы выбіраем свой лёс, не мы выбіраем свой крыж і шлях, па якому будзем яго несці, і гэта справядліва!

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [44, с. 15]*

***

Лёс часам бязлітасны да чалавека.

*Леановіч Л. Сіняе лета [42, с. 51]*

***

Не заўсёды сілы лёсу нам падуладныя, і не заўсёды мы ствараем абставіны, часам і абставіны ствараюць нас і прымушаюць ад нечага адмовіцца і з нечым новым згадзіцца, не асуджаючы гэтае новае і, можа, не прымаючы яго цалкам.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 229]*

***

Лёс чалавека ў яго ўласных руках.

*Марчук Г. Акулы, кракадзілы, шакалы [46, с. 294]*

***

Вопыт пакаленняў нічому не вучыць, словы сведак – бяссільныя. Кожны мае прайсці свой шлях цаной страт і набыткаў.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Як быццам чалавек можа парваць зрэбную вяроўку свайго роду і ўплесці свой лёс у чужыя бліскучыя карункі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 9]*

***

…часам дастаткова адной светлай кропкі, каб выйсці на шлях.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 218]*

***

Людзі таксама ў пошуках ратунку лятуць на святло прыгожай ідэі і не разумеюць, што за нябачная сцяна раптам вырастае перад іх шчырым парывам, чаму аб яе ў кроў разбіваюцца іхнія лёсы.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 450]*

Репозиторий БрГУ

***

Як у галаве ў самай пачварнай жабы хаваецца прыўкрасны камень, так у несправядлівым і жорсткім часе нашчадкі пасля знаходзяць іскрынкі цудоўных лёсаў і агмені чыстых памкненняў.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 6]*

***

Кожны мусіць сам будаваць свой лёс і не лезці ў яміны мінулага, з якіх удалося выкараскацца.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 112]*

***

Так, лёс злосна жартуе з тых, хто аддаецца гардыні розуму й лічыць, што яму пад сілу зацугляць Богам створаныя стыхіі…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 18]*

***

Кнігу лёсаў напісалі задоўга да нас, і атрамант з яе старонак не счысціш, як у звычайным палімпсесце.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 79]*

***

…кожны сам каваль свайго лёсу, можна нарадзіцца князем, а пра цябе загавораць уголас толькі тады, калі спадчыну дзяліць давядзецца.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 217]*

***

Кожны з нас гаспадар свайго лёсу, але гаспадар усіх лёсаў – Бог.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 76]*

***

Ніхто з людзей – ні тыя, што калісьці жылі, ні тыя, што сёння жывуць, – не ведае свой лёс…

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 248]*

***

Лёс чалавечы з самага нараджэння ўплятаецца ва ўзор нябесных свяціл, кладзецца ў калыску разам з ніткай, якой перавязалі пупавіну.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 376]*

Репозиторий БрГУ

***

Які ж цяжар, якая кара,
Калі, спасцігшы лёс свой трудны,
Ты сам суддзя, і сам – падсудны,
І сам – падсуднага ахвяра!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 183]*

***

У кожнага свой лёс – як каму пашанцуе.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 390]*

***

Трайны ён, круг, ды недзялімы:
Бо сёння – як ні паглядзім –
А лёс Дзяцей, і лёс Радзімы,
І лёс Планеты – лёс адзін.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 99]*

***

Дзе судзіць лёс – што значаць словы?

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 168]*

***

Нараджаюцца ўсе аднолькава. А лёс пляцецца ў кожнага адметны, непаўторны. І смерць розная.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 125]*

***

Дарога ў кожнага свая, і чалавек павінен па ёйісці. Кожны звязаны са сваім лёсам.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 66]*

***

…лёс, адзін толькі лёс, кіруе чалавекам.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 21]*

Репозиторий БрГУ

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ



***

Жыццё пражыць – не раз забаліць…

*Белая А. ***Даўні той студзень… [7, с. 48]*

***

Як страшна жыць усё ж у прошлым часе!

*Белая А. ***Маё святое аўтарскае права… [7, с. 57]*

***

Багата спаць – мала жыць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Сон падобен да смерці...

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 299]*

***

Каб не было ў цябе свядомасці – не сумаваў бы ты, не ўпадаў бы ў адчай, не думаў бы пра смерць, а цвіў бы сабе, як кветка, або, як шпак, спяваў бы, колькі табе належыць, або памахваў бы хвастом на поплаве, як бык.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 392]*

***

У газеце, дзе вы надрукуеце мой некралог, няхай таксама будзе недзе побач жывы, таленавіты артыкул пра несмяротнасць сапраўднай паэзіі.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 393]*

***

Жыццё чалавека – як агонь. Быў і няма. Зноў загарэлася і патухла. Зноў гарыць. І так – бясконца. Тая самая вечная, таямнічая і цудоўная з'ява.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 393]*

***

Пачынаю ўжо лічыць свае гады, нібы рублі пад канец камандзіроўкі…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 394]*

***

Час бяжыць, бяжыць, а потым я спынюся, а ён пабяжыць далей…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 397]*

Репозиторий БрГУ

***

“Колькі таго жыцця!..”

Часовасць гэтую разумеюць па-свойму і мудрасць і дурнота. Адна стараецца насыціць яе, часовасць, мудрым зместам, а другая – схапіць хоць што.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 397]*

***

Жыве – як на вакзале: “Абы той час прайшоў хутчэй”. А да якога ж цягніка?..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 397]*

***

Каб толькі жыць як найдаўжэй, дык гэта вельмі цікава было б: як яно ўсё праходзіла – так многа і так доўга!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 398]*

***

А шлях жыццёвы – незваротны,
які ні ёсць – адзін магчымы.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 77]*

***

Гасцяваць, браце, не зямлю капаць, толькі вось часу на гасцяванне не хапае.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 61]*

***

Не, браце, не для таго чалавек прыходзіць на свет, каб спаць, каб памерці, а каб працаваць, працаваць, бачыць, як свет перайначваецца, і самому яго перайначваць.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 61]*

***

Чалавек усё ж нараджаецца адзіны раз…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 132]*

***

Нельга жыць чымсьці адзіным, жыццё шырокае.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 147]*

***

Смерць таксама паважаць трэба.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 147]*

Репозиторий БрГУ

***

Шырэй жыць – больш святла ў акне.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 147]*

***

Баіцца чалавек памерці чалавекам – памірае сабакам.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 148]*

***

Вечнае жыццё. Яно не ведае ні супынку, ні аддышкі.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 151]*

***

Фізічная патрэбнасць жыць, ці, іншымі словамі, жывёльная прага жыцця.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 166]*

***

Людзі здаўна ўмелі выбіраць месца, дзе ім жыць.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 20]*

***

Жыццё вучыць. Вядома, калі галава на плячах, а не качан…

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 26]*

***

Вясною паміраць – грэх.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 27]*

***

…што ні рабі, як ні рабі, а паміраць мусіш…

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 57]*

***

Чырвонае, чорнае – галоўныя колеры жыцця.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 142]*

***

…залішнія клопаты пра неўміручасць пры жыцці адразу пасля смерці не даюць плёну. Лепей, калі такі клопат праявяць нашчадкі. Час усё ставіць на сваё месца.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 231]*

Репозиторий БрГУ

***

Усе не могуць жыць аднолькава. Бо ўсе людзі розныя.

*Лекановіч Л. Сіняе лета [42, с. 233]*

***

Прыйсці на свет ёсць адзін шлях, а выйсці з яго – тысяча.

*Лекановіч Л. Сіняе лета [42, с. 356]*

***

Жыццё адно, і смерць у нас – адна…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 72]*

***

Мёртваму гніць, жывому расці…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 153]*

***

…смерць – гэта драбяза. Галоўнае – пражыць так, каб зла ніякага людзям не нарабіць…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 175]*

***

...Вочы!.. Вочы!.. Дык дзеля ж чаго, навошта дадзены вы ўсяму жывому?!.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 274]*

***

Жыццё – як у шклянцы віно.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 12]*

***

Няма нічога больш невыноснага за тугу па мёртвых…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 122]*

***

Чым больш жывем мы паасобку,
тым болей хочам разам паміраць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 173]*

***

Навошта мёртвым абуджаць жывых,
калі ўжо помнікі стаяць за агароджамі?..

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 174]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі смяецца тагасвет,
рэальнасць пачынае плакаць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 176]*

***

Тым,
хто вышуквае заганаў,
мажліва, і не зразумець,
што,
імітуючы каханне,
мы не жыццё сваё падманваем,
а смерць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 200]*

***

Лягчэй не жыць, чым не хацець…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 203]*

***

Гэтак, у клопатах ды мітусні, ляціць незаўважна час – і жыццё няўмольна набліжаецца да мусовага фіналу. А нешта важнае, незразумела што, без чаго нельга лічыць сябе шчаслівым, так і не глянула, так і не зрабіла кроку насустрач…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 225]*

***

Што найвышэйшае ў жыцці – хараство. Яно назаўжды трывае ў сваёй неўміручасці…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 226]*

***

…найлепшыя бурбалкі – у газіроўцы майго жыцця…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 312]*

***

Так цяжка жыць… І страшна… Трымайцеся разам, гуртуйцеся! І, галоўнае, наведвайце, наведвайце, каб і вас пасля таксама наведалі… А як жа, гэтак страшна жыць…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 313]*

***

Нават калі няма таго, у што я веру, на што арыентуюся і чым жыву, яно мусіць быць, інакш – жыццё не мае сэнсу.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 352]*

Репозиторий БрГУ

***

Запраўдная, жывая філасофія – ад разумення жыцця і ад самога жыцця. Твайго, не іншага. Наколькі ты глыбокі, настолькі і філасаф…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 362]*

***

Жыць лёгка, калі за цябе нехта тузае нітку, калі за цябе думаюць і рашаюць, калі твае грахі прабачае і бярэ на сябе нехта іншы. Але гэта жыццё нават не для быдла, а для чарвяка.

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [45, с. 42]*

***

Кожны жыве па-свойму, а калі граху няма, дык усякае жыццё добрае.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 7]*

***

Жывых бойся, а не памерлых…

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 33]*

***

Калі чалавеку жыць дрэнна, дык і ён сам дрэнны, а калі добра, дык і ён добры.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 57]*

***

У кожнай жывой істоты свая крыўда, сваё гора.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 102]*

***

Цяжэй за ўсё на свеце будаваць уласнае жыццё і шчасце…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 261]*

***

Жыццё людзей – гэта бясконцы ланцуг клопатаў.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 292]*

***

Каб… каб… Многа што было б іначай, каб не гэтыя ўсялякія “каб” у чалавечым жыцці.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 355]*

***

Здараецца часам у чалавечым жыцці такое, што сам чорт нічога не разбярэ і здзівіцца.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 162]*

Репозиторий БрГУ

***

…чужы мёд не зробіць жыццё салодкім…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 217]*

***

Вось такое яно жыццё ў людзей – у кожнага сваё шчасце, у кожнага свае памылкі…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 262]*

***

Жывуць не з любоўю, жывуць з чалавекам.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 342]*

***

Жыццё чалавечае падобнае да вады, якая падае з вышыні. Па мерках Спрадвечнага яно працягваецца толькі імгненне – столькі, колькі падае. За гэтае імгненне яно тысячу разоў успеніцца, змяшаецца з іншымі жыццямі. Канец яго непазбежны. Але як хочацца зазнаць за гэты кароткі час пабольш таго, што мы называем шчасцем!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 154]*

***

Жыццё заўжды – натхнёная паэма, якую трэба радасна пражыць.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 6]*

***

З нас кожны ўсё жыццё паэму піша на скрыжаваннях сцежак і дарог.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 17]*

***

Жыццё без узлётаў, пралікаў і спадаў,
Без спрэчак калючых, нібыта асцё,
Без спёкі, без хмар і густых снегападаў –
Расклад ці канструкцыя, а не жыццё.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 108]*

***

Мудрая тайна жыцця – жыць аддана да забыцця.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 133]*

***

Жыццё пражыць –
Не поле перайсці,
А трэба і жыццё
Прайсці, як поле,

Репозиторий БрГУ

І хоць адным зярняткам узысці,
А бур’яном
Не зарасці ніколі.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 277]*

***

Пабачыўшы нямала на вяку,
Назад ужо не знойдзеш кладку, –
Як ні круціся, па белавіку
Сваё жыццё не пражывеш спачатку.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 355]*

***

Жыццё ідзе няроўнымі кругамі:
То разамкнецца, то замкнецца круг,
То – вышыня, то – бездань пад нагамі,
То падтрымае, то зняважыць друг.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 357]*

***

У кожнага чалавека ёсць патрэба час ад часу ўспамінаць сваё жыццё з маленства і да сённяшняга дня.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 192]*

***

Шукаць, знаходзіць, быць няспынным, не проста існаваць, а жыць.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 194]*

***

Чалавек ужо прызвычаіўся, што ён нікому не патрэбен, што яго могуць расцерці, як муху, але ўсё ж чапляецца за жыццё, на нешта спадзяецца, верыць, што яго голас нехта пачуе і выратуе з гэтага пекла.

*Грахоўскі С. Зона маўчання [20, с. 22]*

***

У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць у цемры безнадзейнасці да жыцця і збавення.

*Грахоўскі С. Зона маўчання [20, с. 13]*

***

Бога, край свой, веру, брата,
Сыне мой, любі без краю.
Свет цярпі, жыццё – не свята,
Бо яно як сон знікае.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 352]*

Репозиторий БрГУ

***

Кожны чалавек нешта адрознае ад іншых сустракае ў сваім жыцці, дык кожны адрознае ад іншых і расказвае.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 148]*

***

Заўсёды страшная смерць тым людзям, што шукаюць шчасце на гэтым свеце, а пра будучае жыццё не дбаюць.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 166]*

***

Жыць трэба заўсёды, як бы цяжка ні было.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 12]*

***

Чым больш думаеш пра жыццё, тым менш разумееш яго сэнс…

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 100]*

***

…жыццё ўсіх ставіць на месца.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 103]*

***

Чалавек – вандроўнік па сваім жыцці.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 142]*

***

Зрэшты, чаго толькі не здараецца ў гэтым жыцці, і здараецца часта вельмі нечакана.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 185]*

***

Ёсць час, калі хочацца жыць, калі смак да ўсяго адчуваеш, а ёсць – не дай бог.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 232]*

***

Чаму ж гэта так, што ў жыцці, дзе шмат прасторы і волі, адзін чалавек другому дарогу пераходзіць?

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 236]*

***

Сапраўды, чалавечае жыццё трагічнае – гора і пакуты спадарожнічаюць нам кожны дзень.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 355]*

Репозиторий БрГУ

***

Ветлівасць упрыгожвае жыццё…

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 362]*

***

…таямніца жадання – таямніца жыцця.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 367]*

***

Чалавек народжаны свабодным, з правам распараджацца жыццём па ўласным жаданні, і ніхто гэтага не можа ў яго адабраць.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 427]*

***

Вось тайна тайны: калі зразумееш нарэшце, што самае галоўнае – жыццё, трэба паміраць.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 70]*

***

Бываюць, зрэдку вельмі, але ж бываюць такія важкія і грандыёзныя падзеі, якія, нават калі і воку твайму нябачныя, усё ж абуджаюць жыццёвыя сілы і напаўняюць такой энергіяй, што толькі адно жаданне ў чалавека і застаецца: жыць, каб як мага больш паспець зрабіць добрага.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 76]*

***

Людзі і да магілы чалавека даводзяць, і ратуюць ля магілы.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 95]*

***

Сумненні – вось асноўная і нябачная сіла жыцця. Яны наталяюць надзеі.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 120]*

***

Жыццё – скаварада, чалавек – цеста.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 161]*

***

Усё мне, чалавеку, аднаму мне, штодзённая змена ўсё мне, каб пра смерць не думаў, толькі ўмела да ўсяго прыгледзецца. Якое багацце мне дадзена!

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 231]*

***

Ніколі не пішы пра старасць і смерць, на гэта здольны толькі бяссільны чалавек.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 231]*

Репозиторий БрГУ

***

…колькі чалавек жывы, столькі і зменьваецца.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 231]*

***

Памерці можна і ў трыццаць гадоў.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 231]*

***

Кожны чалавек мусіць цярпліва змагацца за жыццё, усведамляць адказнасць за яго, за дзяцей, за род свой.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 236]*

***

Бессэнсоўна кіраваць жыццём. Трэба толькі назаўсёды ўсвядоміць, што ты сам з'яўляешся прычынаю гора і смерці і прычынаю радасці ды шчасця іншаму.

*Марчук Г. Хаос [46, с. 262]*

***

Ты датуль цар на зямлі, пакуль яно, жыццё, не завалодала тваім духам, не паланіла адчаем перад новым днём, сумам і адзінотаю. Тут мяжа, тут важна не пасаваць перад ім.

*Марчук Г. Як памёр Даніла Штоўба [46, с. 315]*

***

…вярнуць тых, хто ўпаў духам ад усведамлення заўсёднай прысутнасці смерці за плячыма, на шлях дабрадзейнасці і прагі жыцця – таксама сэнс існавання.

*Марчук Г. У пошуках сэнсу [46, с. 354]*

***

Сутнасць жыцця – адчуваць сябе вольным, калі ад тваёй волі іншым карысць, а не шкода.

*Марчук Г. У пошуках сэнсу [46, с. 355]*

***

Не так жыць, як дажываць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Сумненні – асноўная і нябачная сіла жыцця. А раптам зменіцца? А калі ўсё перайначыцца? А можа, пашанцуе?

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

Репозиторий БрГУ

***

Жыццё – цудоўная мажлівасць выбраць сабе спадарожнікаў, з якімі хацелася б прадоўжыць існаванне і ў іншым свеце.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Як любіш жыць? Люблю жыць, каб мне зайздросцілі, а не каб я зайздросціла.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Успомнім: што ёсць жыццё? Мітусня мітусні. Дык і гэта добра. Мітусня – тканіна, на якой чалавек страсцямі, звычкамі, учынкамі, абавязкам вышывае малюнак свайго лёсу.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Забава заўсёды небяспечная для жыцця.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Не судзі чалавека, калі не жывеш адным з ім жыццём.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Грэх пісаць у дзённіках пра людзей, якія памерлі. Яны не могуць сябе абараніць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Кажуць, шлях да пазнання доўгі і цяжкі. Па-мойму, ён бясконцы. Ніхто не паспявае за жыццё пазнаць самога сябе да канца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Сэнс жыцця – паспець усяго паспытаць пры жыцці і пры гэтым шчасліва пазбегнуць турмы, торбы, бальніцы і кулі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

У жыццё прыходзім выпадкова, сыходзім заканамерна.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі нараджаецца чалавек, нічога ў свеце не памірае ўзамен.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Той, хто думае пра годны канец жыцця, жыве сумленна.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Ні з пункту гледжання маралі, закону, палягчэння хваробы, ні з якага іншага пункту гледжання смерць не выглядае добра.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

Смерці нельга ні шкадаваць, ні зайздросціць. Ва ўсіх набытыя білеты.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Смак да жыцця падсілкоўвае перамога.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Першыя пытанні, якія чалавек паставіў сам сабе: давядзецца памерці, як бы не памерці, а дзеля чаго жыць, перад тым як памерці.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Колькі ні жывеш, а ўсё мала.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Часцей за ўсё людзі не сэнс жыцця шукаюць, а, самі таго не падазраючы, шукаюць прычыну смерці.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Жыць адно толькі будучыняй немагчыма. Гэта амаль што даказалі камуністы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Чалавек спакайнейшы і шчаслівейшы, калі ён кіруецца характарыстыкамі жыцця, а не яго фактамі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

Репозиторий БрГУ

***

Так, жыць без людзей кепска, з людзьмі нудна, а на базары ўсім добра.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 403]*

***

…людзі, пакуль іх не змеле на сваіх жорнах смерць, дзеляцца і дзеляць, і заўсёды знаходзяць падставу для нянавісці.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 17]*

***

…нават рэчы робяцца мёртвымі, дакранаючыся смерці…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 48]*

***

Што ж, нельга дакараць за перасцярогу тых, хто рызыкуе жыццём дзеля высакароднай справы.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 63]*

***

…нельга жыць у ракавінцы, калі ты не смоўж.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 89]*

***

Велічыня чалавека суразмерная таму, за што ён здольны памерці.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 118]*

***

…нітка часу рвецца толькі разам з жыццём.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 125]*

***

Што ж, святая справа – сказаць добрае слова пра нябожчыка.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 138]*

***

Хіба можа чагосьці баяцца той, хто танчыў са смерцю?

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 149]*

***

Што ёсць жыццё, і што ёсць смерць? Хвост і галава адной змяі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 214]*

***

Прысмак смерці надае пацалункам асаблівую моц.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 250]*

Репозиторий БрГУ

***

Праўда і ў тым, што нельга, каб магільныя камяні засланялі неба.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 349]*

***

Мёртвае заўсёды варожае жывому. Нават калі гэта кветка.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 465]*

***

Жыццё складаецца са статыстаў.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 497]*

***

Як позна разумееш, што ў жыцці ўсё звязанае і за ўсё трэба расплачвацца.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 499]*

***

Чалавека цягне глядзець на чужую смерць, на чужыя пакуты – нават калі ён спачувае ахвярам. Цяжка пераадолець спакусу адчуць сябе ў бяспецы на тле нечай пагібелі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 102]*

***

Ніколі не трэба шкадаваць, што не адабраў у кагосьці жыццё.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 150]*

***

Калі выпадае табе жыць у міжчассі, трэба ўмець пакорліва круціцца трэскай у віры, каб вынесла наверх.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 9]*

***

…ад дурной смерці не ўратуе нават дасканалае ўменне – бо аднойчы і качарга страляе.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 156]*

***

…пакуль чалавек жывы, усё можна перамяніць…

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 206]*

Репозиторий БрГУ

***

Жыццё – шляхоў і рэк падабенства:
Рух падарожны распачынае
Юнацтва наша з крыніц маленства
І ў акіян небыцця ўпадае.

*Куляшоў А. Далёка да акіяна [39, с. 156]*

***

Няма шляхоў да самазахавання,
Няма дарог да светазабыцця
У час ліхі ўзаемапалявання
Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця.

*Куляшоў А. Цунамі [39, с. 183]*

***

Пяройдзе шлях у новы шлях,
Расстанне – ў новае спатканне,
Напеў жалейкі – ў труб гучанне,
Выток жыцця – ў жыцця працяг.

*Куляшоў А. На паўмільярдным кіламетры [39, с. 111]*

***

Сцвярджае час: заўжды жыццю на змену
Прыходзіць смерць, для ўсіх – адзін закон.

*Куляшоў А. Сцвярджае час [39, с. 160]*

***

Хто ў людскім свеце жыў ад нараджэння,
Без страт няўхільных не пакіне свет.

*Куляшоў А. Цунамі [39, с. 168]*

***

Не мы смерць выбіраем, а смерць нас выбірае – во якое права.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 139]*

***

…у кожнага заўсёды ў запасе застаецца смерць, як у таго салдата маршальскі знак.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 202]*

Репозиторий БрГУ

***

Смерць, як жонка, не любіць дзяліцца, яна хоча камандаваць аднаасобна, і перахітрыць яе цяжка. І што цікава: смерць, як і баба, выбірае лепшых.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 202]*

***

…для парадку жыцця ў сям'і трэба мець кулямёт. Не на тое, каб страляць, а каб ведалі, што ён ёсць…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 212]*

***

…жыццё – гэта кола, зямля стаіць, а яно круціцца. Бывае, падыме на самы верх, а пасля са ўсяго маху, во тут не дай бог разгубіцца – раздушыць як жабу.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 217]*

***

Бог мой, колькі ж яшчэ трэба ўбачыць, пачуць, каб думаць або гаварыць, што ты ведаеш жыццё хоць бы ў пэўнай меры!..

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 145]*

***

Колькі ўсяго непазнанага, і не пазнаеш яго як след, пакуль прыйдзецца ўсё пакінуць…

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 158]*

***

Няўжо гэта конча трэба пасля сябе «пакінуць след» – у сэнсе славы нейкай, шырокай вядомасці? А калі проста жыць на радасць і пашану блізкім і трохі далейшым, з кім зводзіла жыццё?

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 158]*

***

…жыццё чалавека – ой, як далёка і як бязлітасна, жорстка не вечнае.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 389]*

***

…вельмі добра таму, хто не растраціў пачуццяў, так шчодра адпушчаных нам пры ўступленні ў жыццё.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 407]*

Репозиторий БрГУ

***

Умее
сьмерць
мерацьу…

*Папека М. Чарнавікі [47, с. 79]*

***

Не аднакава жыццё для ўсіх, як каму наканавана.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 47]*

***

Пэўна, у кожнага ёсць знак, калі і якою смерцю адысці на той свет.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 242]*

***

…няма нічога больш пакутнага на свеце, чым смерць роднага дзіцяці.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 328]*

***

…чалавечае жыццё – гэта той жа сад, у якім растуць вялікія дрэвы, нізкарослыя кусты, цудоўныя кветкі і вельмі шмат рознага непатрэбнага пустазелля.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 88]*

***

Смерць прыходзіць толькі адзін раз, а слава застаецца з чалавекам навек.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 135]*

***

Самы лепшы лекар ад старасці – смерць.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 253]*

***

Мудрасць і найвялікшая насалода чалавечага жыцця ў тым, што яно не адразу адкрывае людзям свае самыя прыемныя бакі, а паступова, па драбіначцы, па маленькім глыточку.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 405]*

***

Смерць – нямая тайна. Сваімі рукамі трымаем і меч свой і лёс свой.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 30]*

Репозиторий БрГУ

***

…жывому – жыць, сонцу – свяціць, дрэву – расці, сэрцу – спадзявацца.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 91]*

***

Каб жа ведаў чалавек, колькі жыць давядзецца, колькі летаў над галавой прашуміць.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, 149]*

***

Жыві тым, што ёсць. Прыспешваючы заўтрашні дзень, мы набліжаем да сябе змрок магілы.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 286]*

***

І цела чалавечае, і душа павінны адчуваць боль. Без болю няма жыцця.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 259]*

***

…спаць звыш меры належыць мёртвым, а не жывым.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 343]*

***

Якое кароткае зямное жыццё! Толькі народзішся, толькі разумным вокам глянеш на свет, як ужо трэба рыхтавацца да жыцця нябеснага, вечнага.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 412]*

***

Той, хто жыве, заўсёды спадзяецца на лепшае.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 424]*

***

Стары ці малады – смерць у зубы не глядзіць.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 440]*

***

Чалавек павінен за жыццё сваё зямное як мага болей пабачыць сваімі вачамі.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 459]*

***

Жыццё – гэта такая дарога, па якой кожны павінен ісці сам.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 495]*

Репозиторий БрГУ

***

Па свайму вобліку зрабіў Бог чалавека, цэнтрам усяго зямнога жыцця зрабіў, гаспадаром жывога, але ў імгненні прасветленасці, вастрыні духоўнага зроку раптам прыходзіць, палохаючы сваёй грахоўнасцю, думка: а чаму ч а л а в е к (*выдзелена аўтарам. – А. Л.* ) цэнтр жыцця?

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 511]*

***

Смерць як сонца – вачамі на яе не глянеш.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 512]*

***

Жыццё – бясконцая гульня ў хованкі.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 21]*

***

Часам прасцей адпусціць чалавека і пачаць жыць наноў, чым бясконца песціць пустацвеціну надзеі.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 32]*

***

…што б ні здарылася, як бы жыццё ні перабіла чалавека, а ён павінен радавацца кожнаму наступнаму дню.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 44]*

***

…сэнс жыцця – у ягонай бессэнсоўнасці.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 192]*

***

Страшна пражыць жыццё ў чаканні.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 217]*

***

…калі чалавек пачынае цікавіцца сэнсам жыцця альбо яго каштоўнасцю, то гэта азначае, што ён хворы.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 225]*

***

…без чалавека і хата памірае.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 32]*

Репозиторий БрГУ

***

…самым дарагім у свеце – жыццём – чалавек расплачваецца часам дзеля нейкай халоднай крупіцы; і тут цана не ў крупіцы, а ў тым, што яна, гэтая крупіца, можа высвеціць у чалавеку.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 54]*

***

…жыццё праходзіць, застаюцца ўспаміны, якія часцей засмучаюць, чымся радуюць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 80]*

***

…вонкавы бок жыцця чалавека не ёсць копія яго душэўных памкненняў, часам на першы погляд шчаслівы чалавек тоіць у сабе, сваёй душы невыказную трагедыю.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 127]*

***

У чалавечым жыцці ёсць прамежкі, якія сеюць у душы ілюзію шчасця: быццам з дасягненнем той ці іншай мэты канчаюцца ўсе бедыcommitted нястачы – і перад табою прамая дарога ў рай.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 274]*

***

Чалавек можа стаць і пастаяць на месцы, тады як жыццё не мае супынкаў, падсоўвае кожны дзень нечаканасці.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 296]*

***

У чалавечым жыцці бывае такое: куфэрачак ісціны раптам адкрываецца ключыкам зусім далёкай ад яе, ісціны, дробязі.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 298]*

***

Жыццё якраз простае, прыгожае, даецца чалавеку ў радасць, няпростым яго робяць самі людзі.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 302]*

***

Сутнасць жыцця, складанае яно ці лёгкае, вызначаецца глыбінёю пережытага, а не колькасцю пераездаў, прафесій, жонак, дзяцей…

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 389]*

Репозиторий БрГУ

***

Каб жыццё ўпустую не пралахаць,
Кожны мусіць нейкі храм свой мець,
Дзе не хочацца ні гаварыць, ні пець –
Толькі моўчкі, безгалоса плакаць.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 156]*

***

Гаварыце з чалавекам, покуль ён між вас, жывы.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 196]*

***

Так, людзі на жыццё глядзяць па-рознаму:
Адзін – праз сэрца, а другі – праз пуп.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 355]*

***

Жыццё на ўсё знаходзіць лек,
Яно не любіць, каб няшчасным
На свеце чуўся чалавек.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 9]*

***

Калі дасціпнае імя
Прышпіліць нехта чалавеку –
То не здзярэ і смерць сама.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 22]*

***

…Род звядзецца,
Калі магіл не шанаваць…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 73]*

***

…жыць адно тады і варта,
Калі рабіць дабро людзям.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 75]*

***

Усё, чым грудзі ты азвончыў,
Што нахапаў ты за жыццё, –
Усё абсыпецца аднойчы,
Як з дрэва восенню лісцё!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 75]*

Репозиторий БрГУ

***

Тварыць – штодзённа, апантана –
Для чалавека значыць – жыць…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 131]*

***

І хто хоча жыць паўнейшым жыццём і гастрэй пранікаць у яго тайны-глыбіні, той павінен быць адзінокім і незалежным.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 10]*

***

…што жывое, жывым і застанецца.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 14]*

***

І хто ведае: быць можа, чым часцей даведваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 17]*

***

…лепей жыць без страху і трывогі, а паміраць усё роўна калі-небудзь ды трэба.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 44]*

***

…жыццё – гэта самае большае шчасце на зямлі!

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 50]*

***

Сэнс нашага жыцця – несупынны рух.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 86]*

Репозиторий БрГУ

# ІСЦІНА І ХЛУСНЯ


Репозиторий БрГУ

***

Ісціна, кажуць, у тым, што ісціна ёсць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 39]*

***

Лепш разумная мана, чымся неразумная праўда.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 236]*

***

Хто стаіць за праўду, той ніколі згінуць не можа.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 370]*

***

…цяжка гаварыць праўду, калі яна датычыць не цябе.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 140]*

***

Навошта існуе хлусня, нават добрая?

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 141]*

***

Бо няма, як ведама, страшней ілжы за найпадобнейшую да праўды…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 83]*

***

Чалавек на зямлі павінен дзве рэчы шукаць: ісціну і веру… яны дадуць яму і сілу, і апору, і любоў.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 176]*

***

Факт яшчэ не ёсць праўда.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 245]*

***

У свабоды адзін абаронца – праўда.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Найлепшы сведка Праўды – Мана.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

Репозиторий БрГУ

***

Адвечнае пытанне крытыка: сказаць праўду аўтару пра яго твор – пакрыўдзіць аўтара, сказаць няпраўду – пакрыўдзіць сябе.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Сёння праўда выгадная аднаму, заўтра другому. Сумна ад таго, што няма дня, калі б яна была выгадная ім абодвум.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

Дзе крайнасць – там таксама ўжо мана.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 338]*

***

Але трэба памятаць, што бадай не кожная рэч мае два бакі: паказны і праўдзівы.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 11]*

***

На свеце часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаной вялікай пакуты – надта цяжкая дарога прыводзіць да такога пазнання.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 37]*

***

…часта бывае так, што праўда часамі кладзе непраходную сцяну між найлепшымі сябрамі.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 65]*

***

У кожны момант і на кожнай мясцінцы зямлі адбываюцца найцікавейшыя рэчы і складаюцца самыя дзівосныя казкі, падобныя іншы раз да праўды, і нараджаецца праўда, яшчэ болей цікавая часамі, чым сама казка.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 71]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ПАМЯЦЬ І ЎСПАМІНЫ



***

...кожная чалавечая сям'я мае права на сагу, як і кожны з людзей на напісанне ўспамінаў.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 183]*

***

Апроч пахаў агульнавядомых у кожнага ёсць і свае, спалучаныя з пэўнымі, толькі сваімі ўспамінамі.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 339]*

***

Сумна стала, пераглядаючы стары фотаальбом. Пісалі людзі калісьці адзін аднаму: "На доўгую… на вечную памяць…" І ўжо даўно іх няма, і памятаць іх – няма каму…

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 392]*

***

Усё трэба ў памяці трымаць: і адчай, і надзею, і веру.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 147]*

***

І ў адзіноце знойдзецца выйсце,
толькі ж ад памяці хіба ўцячэш?

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 54]*

***

…кепска чалавеку самому – тады ён і пра другога ўспомніць. А добра – дык хто там вельмі клапоціцца, што ў некага галавы няма да каго прыхіліць.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 66]*

***

Многа помнім, болей забываем.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 112]*

***

Промахі чужыя ўспамінаем, толькі забываем пра свае.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 112]*

***

А памяць, яна не старэе ніколі.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 38]*

Репозиторий БрГУ

***

Чалавеку дадзена не ўсё ведаць, але вельмі шмат памятаць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

…зведаўшы аднойчы – ведаеш назаўсёды, на памяці драпіны не зацягваюцца, калі гэта – драпіны ад аскалёпкаў шчасця.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 287]*

***

Нашае жыццё – гэта наша памяць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 392]*

***

…памяць пра ўчыненае зло не знішчыш так лёгка, як дрэва, – карані ад яго цягнуцца на шмат пакаленняў наперад.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 21]*

***

Як несправядліва – памяць пра тое, чаго не было, што прымроілася, жадалася, куды больш яскравая, чымсьці пра рэальныя падзеі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 37]*

***

Найдаўжэй памятаюць не вартых, а тых, хто найбольш уразіў чалавецтва.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 237]*

***

Сноп апошні залатога жыта
Застаецца ў памяці палос.

*Куляшоў А. Сноп апошні залатога жыта… [39, с. 144]*

***

Пра ўсё можна ўспамінаць, але не ўсё застаецца ў памяці.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 62]*

***

Даруючы памяці – даруеш і чалавеку, бо чалавек выяўляецца і правяраецца памяццю.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 238]*

Репозиторий БрГУ

***

Чалавек, які страчвае памяць, перастае быць чалавекам. І народ, які страчвае памяць, перастае быць народам…

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 251]*

***

Памяць якраз і павінна фіксаваць усё – светлае і цёмнае, балючае і радаснае… Іначай чалавецтва толькі і будзе тым займацца, што рабіць ды выпраўляць памылкі.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 251]*

***

…у вечны супакой
Нам не з жыцця сыходзіць страшна,
А з добрай памяці людской?

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 75]*

Репозиторий БрГУ

# РАДАСЦЬ І СМУТАК



Рэпазіторый БрДУ

***

Хто людзей весяліць, за таго ўвесь свет стаіць.

*Лінскі У. Мы [43, с. 137]*

***

...як у горы чалавек, у вялікай пакуце, дык і ад ворага добра ласкавае, спагадлівае слова пачуць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 46]*

***

Сама лепш чалавеку, як весел ён: ніякай тады нуды няма, ніякага цяжару на сэрцы.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 68]*

***

Правалачы сваю безліч дзён і начэй праз войны, нястачы, трывогі, некалькі зменаў улады – тут можна і стаміцца, і засумаваць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 59]*

***

Не пацешыўся б, дык павесіўся б.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 99]*

***

…з песняй чалавеку ўсякае гора ў палавіну.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 56]*

***

Падзеленая радасць кранае душу яшчэ мацней.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 47]*

***

…вясёламу ўвесь свет усміхаецца.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 280]*

***

*Радаўніца*, *радасць* і *радыяцыя* маюць адзін корань. А які розны сэнс!

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 350]*

***

А гора, яно, выходзіць, усюды гора, хто б ты ні быў.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 144]*

Репозиторий БрГУ

***

…асабістае гора трэба ўмець трымаць у руках, не папускаць лейцы, іначай яно цябе абсядлае, на табе паедзе.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 281]*

***

Вялікая радасць, як і вялікае гора, любіць часам застацца сам-насам.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 354]*

***

Вялікая радасць – гэта і ёсць бязмежнае гора!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 111]*

***

…радасць і гора – гэта два бакі аднаго і таго ж! Таму што і тое, і іншае можа забіць!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 111]*

***

Чалавек павінен чалавеку радасці прыносіць кожны дзень.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 125]*

***

Не саромейся слёз ад радасці. Значыць, яшчэ не змярцвеў, яшчэ жывы.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 229]*

***

…не можа бясконца цягнуцца гора, як не можа доўжыцца працяглы час радасць.

*Марчук Г. Хаос [46, с. 261]*

***

Радасць нават мільёнаў не зменшыць гора аднаго чалавека.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Чалавеку ўсё даецца на радасць, а каб ён асэнсаваў цану гэтай радасці, часам пасылаецца і гора.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

Репозиторий БрГУ

***

Смех – бяду качае, і весела таму, хто смяецца пасля.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 31]*

***

Што гэта за чалавек, які не ўмее падвесяліць сябе?

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 32]*

***

Усякая радасць ведае сваю пару, і калі добра паразмысліць, дык кожнаму трэба было б дзяржацца гэтай пары.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 172]*

***

Няма бядней чалавека, які не ўмее радавацца.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 204]*

***

Здаровы гэта смех – з саміх сябе, вельмі патрэбны нам і вельмі ў нас рэдкі.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 336]*

***

…ніхто з нас не ведае, па чым ці кім можна і трэба плакаць, а з-за чаго кідацца ў бяздумны рогат.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 55]*

***

Няма на зямлі большай самоты, як самота, што апаноўвае, бярэ за сэрца чалавека, калі ён прыходзіць да адчування, што ўсе яго мары ўжо здзейсніліся, самота і туга праз радасць…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 175]*

Репозиторий БрГУ

# ДАБРО І ЗЛО



Репозиторий БрГУ

***

Не тое дабро, што дабро, але тое, што каму даспадобы.

*Кажадуб А. Ваўкалакі [28, с. 320]*

***

…у гэтым жыцці найбольш строга караецца дабро! Не здрада, не забойства, а дабро.

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [44, с. 21]*

***

Добраму чалавеку скрозь добра, а дрэннаму – дрэнна!..

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 13]*

***

Калі ўжо і малітва святая, і павучанне, і работа не адолеюць зло, тады хіба канец свету настане.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 141]*

***

…зло і жорсткасць сядзяць у нас унутры, і лепш за ўсё не чапаць іх.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 102]*

***

Дрэнны канец, кажуць, лепш за прыемную няпэўненасць…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 168]*

***

Калі ў бядзе сам сабе помачы не суладаеш даць, абы на кім – вінаваты ён ці не вінаваты – тады трэба ж злосць спагнаць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 150]*

***

...спрадвеку вядома, што сама лепш так, як яно само ёсць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 280]*

***

Багаты чалавек можа шмат добрага зрабіць. Але няхай жа ён навучыцца перш пазнаваць і любіць тое, што ёсць дабро.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 134]*

Репозиторий БрГУ

***

Людзі ганяюцца за багаццем не дзеля таго, каб рабіць бліжнім дабро, а каб нічога не рабіць, або – што яшчэ горш – каб шкодзіць. Але што ж далей?

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 134]*

***

З гневам і злосцю ў душы часам удаецца ўтварыць значны твор. Але дабра ў ім няма.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

У злога царкоўнага старасты і мышы злыя, свечкі ядуць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Розніца паміж дабром і злом: дабро мы можам ацаніць самі, а зло часцей за ўсё ацэньваюць на нашым горкім вопыце іншыя.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Пытаешся, чаму дабро несмяротнае? А што яшчэ можа выжыць у любым грамадстве, апроч яго?

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

І багацця на ўсіх хапае, і галечы на ўсіх хапае, толькі дабро ў дэфіцыце.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Не бойся зла, што ідзе ад прыроды, бойся зла, што ідзе ад людзей.

*Марчук Г. У пошуках сэнсу [46, с. 355]*

***

Шмат хто і харошы і добры, калі гэта яму неабходна.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Хаос нічога не знішчае, а толькі пераводзіць у іншы стан.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

Репозиторий БрГУ

***

Зло – гэта перш за ўсё нелюбоў, нежаданне даравацьі няўменне спачуваць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Усё праходзіць, быццам дождж няроўны, –
І боль, і злосць, і дробная брыда,
А застаецца важны і галоўны
І самы светлы талент – дабрата.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 8]*

***

Дабро і зло перамешваюцца ў страшным віры часу, але ўсё-ткі не робяцца адным, як не робяцца адным вада і воск.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 199]*

***

Свет – сістэма спалучальных сасудаў. Калі адвяргаеш дабро, яго месца займае зло…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 499]*

***

На падмурку зла нельга збудаваць дабро.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 180]*

***

Нават самы страшны праклён можа страціць моц ад аднаго подыху дабра.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 191]*

***

Мяжа між добрымі намерамі і паскуднымі справамі сцёрта мільярдамі крокаў…

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 218]*

***

У тых, хто забывае дабро, хто забывае бацькоў, продкаў, Бог высушвае сэрцы, і гэта ўжо не людзі, а балотны трыснёг.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 173]*

***

Бывае зло не ад злога, а зло ад добрага.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 324]*

Репозиторий БрГУ

***

…шкодна працяглы час насіць злосць у сваёй душы, душа робіцца кволай.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 399]*

***

Ну, хіба не дзіва: перад чалавекам ніколі не стаіць праблема, куды дзець радасць, ён вечна думае, як пазбавіцца згрызот, няўвязак, абмінуць злых людзей?

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 230]*

***

Не вярнуць добрае, каб ім яшчэ раз парадавацца, як і не вярнуць кепскае, каб яго пералапаціць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 270]*

***

Чалавек, памятлівы на дабро, – сам добры.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 318]*

***

Рабіць дабро, любіць – гэта не абавязак, а ўнутраная патрэбнасць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 333]*

***

Тым самым лечацца, чым і калечацца,
Бо ў зле дабро ёсць, а ў дабры ёсць зло!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 338]*

***

Сапраўдны гумар – як гасціннасць,
У ім асновай – дабрыня.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 105]*

***

Яно такі і праўда: як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай змены, то яно лёгка перастае быць дабром.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 13]*

***

…каб не было на свеце зла, дык кожны дурань лёгка трапіў бы ў рай.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 43]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ШЧАСЦЕ І НЯШЧАСЦЕ



Репозиторий ВГУ

***

Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце...

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 302]*

***

Няшчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да няшчасця і свой асобны погляд на самое няшчасце.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 303]*

***

...калі няма шчасця чалавеку, дык ніякім спосабам лёсу свайго не падашукаеш.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 67]*

***

Страшныя рэчы адбываюцца з блізкімі або знаёмымі людзьмі, не адбываюцца са мной, а вельмі проста могуць адбыцца.

І ў гэтым шчасце, жудасна-часовае шчасце, якім трэба жыць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 393]*

***

Шчасце ж чалавека не ў тым, каб самому спакойна, шчасліва жыць, а ў тым, каб карысць, дабро людзям прыносіць, патрэбу ў табе яны адчувалі, бачылі.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 385]*

***

…вялікае зло, якое жыве ў душы чалавека, бывае вялікім няшчасцем і для яго самога.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 163]*

***

…як вядома з немалога ліку гістарычных нават прыкладаў, усе яркія, выдатныя грамадскія жыцці заўсёды былі асветлены і сагрэты жыватворнай і такой неабходнай чалавеку цеплынёй асабістага шчасця.

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 205]*

Репозиторий БрГУ

***

Нічога не зробіш: неаднолькавае людское шчасце.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 142]*

***

Шчасце крылатае: і само ляціць, і людзей нясе на крылах…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 216]*

***

Чалавек, які прывык ва ўсім дабівацца перамогі, наўрад ці можа быць па-сапраўднаму шчаслівы.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 86]*

***

…шчасце – гэта магчымасць, як на споведзі, падзяліцца патаемным з самым блізкім чалавекам.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 154]*

***

Перыпетыі лёсу могуць зрабіць чалавека шчаслівым ці няшчасным – гледзячы што разумець пад гэтым…

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 235]*

***

Калі людзі шчаслівыя, ім не патрэбныя словы.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 242]*

***

Мы смех і ранішні прамень
Цаніць адразу не умеем.
І што шчаслівы сёння дзень –
Назаўтра толькі разумеем.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 113]*

***

Не прыйдзе шчасце без прычыны,
Без мужнасці не выстаіць баец,
Без гора не прарэжуцца маршчыны,
Без веры не загоіцца рубец.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 10]*

Репозиторий БрГУ

***

Для шчасця жыве чалавек.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 82]*

***

Прыносяць шчасце людзям людзі,
Бяды – за грошы не пазбыць.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 335]*

***

…Пакутлівае шчасце
За ўсё на свеце даражэй.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 335]*

***

…Быць заўжды шчаслівым чалавеку –
Нялёгка і часамі – не з рукі.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 357]*

***

Няхай няшчасце, дробнае, малое,
Здараецца хоць зрэдку ў жыцці,
Каб сэрца не счарсцвела і каб лоем
Душа не паспявала зарасці.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 358]*

***

Кожны чалавек нараджаецца для шчасця, хоць не ўсім яно даецца.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 87]*

***

Шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе,
Спынішся – плынню адгоніць назад.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 216]*

***

Шчасце не ведае меры,
А шчасця без веры няма.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 93]*

Репозиторий БрГУ

***

Як, бывае, нямеюць ад гора, так і п’янеюць ад шчасця.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 207]*

***

Негалодны ўжо шчаслівы.

*Марчук Г. Слова пра дзень першы [46, с. 307]*

***

Калі ты патрэбны хоць аднаму чалавеку, можаш лічыць сябе шчаслівым.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Шчаслівы той, хто не зайздросціць поспеху іншага, а дапамагае яму.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Калі няма часу думаць пра шчасце – гэта і ёсць шчасце.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Шчасце складаецца не з таго, чаго ў нас няма, а з таго, што мы ёсць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Для аднаго чалавека набытак – шчасце, для другога страта – шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і што страчвае.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Калі шчасця трэба дабівацца – гэта ўжо не шчасце. Шчасце прыходзіць натуральна і непрыкметна, часцяком нечакана, але заўсёды заслужана за турботы шчырыя і справы духоўныя.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

…чалавек можа ведаць болей, чым змесціцца ў сявеньцы, і заставацца шчаслівым.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 9]*

Репозиторий БрГУ

***

Шчаслівы ўзрост, калі аздобы даюць адчуванне шчасця.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 86]*

***

Шчасце – гэта калі ў адной кветцы табе адкрыецца багацце ўсіх кветак свету.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 331]*

***

Шчасце магчымае толькі там, дзе няма чаго дзяліць.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 52]*

***

…ясна, што ад свайго шчасця не адмаўляюцца, але ж часам яно з’яўляецца як абухом па галаве…

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 253]*

***

Што паробіш – нельга быць шчаслівым, напэўна, каб гэта камусьці хоць трохі не папсавала жыццё.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 309]*

***

Спакойнага шчасця не зычу нікому:
Навошта грымотам маланка без грому,
Навошта ручай без пякучае смагі,
Халодная ўвага не вартая ўвагі,
Жаданні, што прагныя крылы згарнулі,
Зязюля без лесу і лес без зязюлі?

*Куляшоў А. Спакойнага шчасця… [39, с. 107]*

***

Толькі наплакаўшыся, наглытаўшыся едкага дыму кастроў, на якіх згараюць самыя светлыя надзеі, чалавек можа ацаніць, можа зразумець, што такое шчасце.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 202]*

***

Бяда па бядзе як па нітцы ідзе.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 347]*

Репозиторий БрГУ

***

Як жа мала для шчасця трэба чалавеку. Усяго толькі быць здаровым, мець працу, свой дом.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 39]*

***

Людзям заўсёды імпануе ў іншых тое, што не маюць самі, хоць дай яго ім, і яно не прынясе ім шчасця.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 56]*

***

Якая гэта памылка – думаць, што толькі адзін ты няшчасны!

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 128]*

***

Два няўдачнікі, зведзеныя ў адно, не двояць няўдачу, а, як ні дзіўна, ствараюць шчасце.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 146]*

***

Шчасце чалавечае ўвогуле і шчасце імгнення. З апошняга можа вынікнуць першае.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 317]*

***

Ісціна, адвечная, як свет:
Шчасце ходзіць толькі ў пары з горам.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 152]*

***

Калі шчаслівы радзіўся, дык знойдзецца, тваё ад цябе не ўцячэ…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 439]*

***

Але не доўга астаецца шчасце на адным месцы.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 3]*

***

…няшчасце навучыць гнуць галавы.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 16]*

Репозиторий БрГУ

***

Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 21]*

***

Лепш быць няшчасным, але відушчым, чымся шчаслівым ды сляпым.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 27]*

***

…што лепей: пражыць свой век ціха, спакойна, не пазнаўшы, як міла жыццё, ці пазнаць яго хараство і вартасць цаной вялікага няшчасця?

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 45]*

***

…шчасце можа быць поўным толькі тады, калі ўсе вакол цябе адчуваюць сябе шчаслівымі.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 50]*

Репозиторий БрГУ

# СЛОВА ПРАМОЎЛЕНАЕ І ПАЧУТАЕ




Репозиторий БрГУ

***

Маўчаннем, аказваецца, можна таксама гаварыць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 42]*

***

...слова, як і цукерку, можна ўзяць у рукі, пацешыцца, разгарнуць абгортку і пакаштаваць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 108]*

***

Лепш спатыкнуцца нагою, чым словам.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Грошы раз-два – і з'еў чалавек, а разумнае слова жыве цэлы век.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 220]*

***

На вялікі жаль, у жыцці здараюцца сюжэты рэдка, а ў беларускай літаратуры ўдаюцца яшчэ радзей.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 25]*

***

...папытаюць чалавека – бы секачом адсячэ, гаворыць – што рэдзьку скрыляе.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 81]*

***

Слова скажа, дык і не ведаеш, куды яго апрадзяліць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 94]*

***

Думкі, згадкі адны, паасобку не ходзяць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 186]*

***

Колькі розных здагадак і меркаванняў у нашай вясковай глухамані!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 208]*

***

Няхай жыве здаровы сэнс!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 357]*

Репозиторий БрГУ

***

Высока пад ясным небам тырчыць разумны кран, з якога чуецца, як божы гром, выразна падкрэслены мат, *узняты ў нас на вышыню*.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 362]*

***

Акадэмікам трэба выступаць па паперцы!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 378]*

***

Хваліць наймалодшых, новае пакаленне літаратараў, трэба ўсё-такі памятаючы, што, пакуль гэтае пакаленне пакажа сябе па-сапраўднаму, спакваля астыўшы ад самазахаплення, надыдзе пакаленне новае, з тымі самымі, а то і з большымі прэтэнзіямі на сваю выключнасць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 385]*

***

Не аб усім трэба гаварыць, што ведаеш, не ўсё бачыць, што на вачах.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 149]*

***

Людзі вераць не рабоце, а словам.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 34]*

***

…мова – гэта найкрапчэйшы вузел, які звязвае бацькоў з дзецьмі, людзей з людзьмі.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 161]*

***

…трэба, пакуль дзіцё малое, вучыць яго гаварыць роднай мовай, шанаваць гэту мову; трэба перасцярагаць, каб не перакручвалі яе чужымі словамі; трэба, каб маці пяяла дзецям свае песні простыя, прывучала шанаваць прадзедаўскія абычаі, – тады як сынок твой вырасце і пойдзе ў чужыя людзі, нічым з душы яго не выб'юць любві да свайго роднага, і дзе б ён ні быў – хоць за морам, яго заўсёды пацягне сэрца ў свой куток, да сваіх бацькоў.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 160–161]*

***

О словы, словы!.. О багатая і ў той жа час такая бедная людская мова!..

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 70]*

Репозиторий БрГУ

***

Выпадковым словам
усё згадаць магчыма,
апрача любові,
маці і Айчыны.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 32]*

***

Меркавацца, гутарыць – як здымаць стружку ў сталярцы: ашчадна, з любасцю пазбывацца лішняга, непатрэбнага…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 87]*

***

Ці можна цікавіцца тым, пра што думаеш, калі думкі твае і цікаўнасць запазычаныя ў іншага?

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 156]*

***

Стабільнасць стварэння і ажыццяўленне неверагоднага паміраюць у тлумачэннях.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 156]*

***

…вышэйшая ды іншыя адукацыі маюць сэнс у палепшанні чалавечае існасці, не ў вонкава-фармальным, а ў унутрана-якасным.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 369]*

***

Літаратурнае маўчанне: што здаволіла б іншых – нецікава самому, а да таго, што здаволіла б самога, – яшчэ не дарос…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 370]*

***

“Прафесія” паэта – не выдумляць, памнажаючы, сваё, а перадаваць адчутую іншарэальнасць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 372]*

***

А калі доказаў не хапае ці іх наогул няма – іх выдумваюць.

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [44, с. 34]*

***

На лаянку ёсць адлаянка.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 10]*

Репозиторий БрГУ

***

Ёсць такія выпадкі, дзе не шкодзіць і голас павысіць.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 187]*

***

…чалавека можна ўзнесці да неба. Можна і ў гразь утаптаць, знішчыць, забіць. Словам.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 61]*

***

Хто не перажываў у юнацтве гэтага моманту шчырай горычы развітання з героямі кнігі, якая некалькі дзён, пакуль ты чытаў яе, засланяла табе не толькі ўсіх тваіх блізкіх, а нават цэлы свет?

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 204]*

***

Калі няма адчування слова, то не трэба і пісаць.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 448]*

***

Над намі слова ўладарыць.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 136]*

***

Паэзія – зялёная вясной, а восенню – усе колеры ў ёй.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 157]*

***

Паэт – заўсёды на рабоце.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 230]*

***

Паэт працуе дні і ночы без адпускоў і выхадных.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 230]*

***

Песню час не здасць на тленне,
Песню бура не развее,
З пакалення ў пакаленне
Песня – душ людскіх надзея.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 339]*

Репозиторий БрГУ

***

Цяпер свет сапсаваны, шмат людзей выкрутлівых ды лайдакоў, гатовых на ўсё злое, а хто ім што добрае кажа – і слухаць не хочуць.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 48]*

***

Размовы людзей, якія пакутуюць, кранаюць сэрца і надоўга застаюцца ў памяці.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 137]*

***

Мова раскрывае чалавека да самага нутра.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 20]*

***

Часам і слова забівае.

*Марчук Г. У пошуках сэнсу [46, с. 355*

***

Што стварае літаратура? Свядомасць. Схіляе сумленне да актыўнага процістаяння злу, умацоўвае дух.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Напісанае застаецца, а ненапісанае збываецца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Афарызмы – гэта тэрміновыя тэлеграмы розуму.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Думкі пра Бога, маці, дзіця, Радзіму заўсёды надаюць сілу.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека. Яны здольныя ахапіць усё чалавецтва. Але ж, як ні дзіўна, і ў іх прысутнічае нацыянальны каларыт аўтараў.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі пісьменнік хоча зняважыць свайго калегу, ён дае яго прозвішча сваім героям, як правіла – адмоўным.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Філосафы любяць пачынаць свае разважанні тэмаю пра пачатак існага, але аб самім існым нічога зразумелага не скажуць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Кніга – гэта журба па ўсім, што пражыта, і надзея на памяншэнне гэтай журбы ў будучым.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Для старога пісьменніка ўсе маладыя пішуць не так і не пра тое.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Надрукуй у золаце вокладку, і нават самая пустая кніга будзе мець значны і грунтоўны выгляд. Золата паўсюль золата.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

Філасофія – гэта кровазварот думак чалавека.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Сапраўдны пісьменнік той, на творах якога можна навучыцца любові да людзей.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

З усіх відаў друку газетны старэе першы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

…афарызмы трэба пісаць у меру. Напішаш мала – не застануцца ў памяці, напішаш многа – стомяцца чытаць. І яшчэ трэба быць сціплым: і акрамя ж цябе ёсць аўтары!

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 378]*

Репозиторий БрГУ

***

Міфы, паданні, легенды – гэта паветра, якім дыхае кожнае месца.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 6–7]*

***

…кожная мова – жывы арганізм, які развіваецца па сваіх законах, і культурны чалавек мусіць берагчы ўсе мовы свету, не даваць ім знікаць і страчваць самабытнасць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 74]*

***

Гук – гэта моц, якой чалавек яшчэ мусіць авалодаць…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 105]*

***

Прыгожыя лозунгі не гарантуюць сумлення.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 146]*

***

Мовазнаўства можа быць страшнейшым за ўзброенае паўстанне.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 363]*

***

Галоўнае памятаць, што, каб апісаць лужыну, неабавязкова ў ёй выкачацца.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 415]*

***

Не падсумоўвай паквартальнай зводкаю
Таго, што вымяраецца радком.

*Куляшоў А. Парада сабе самому [39, с. 154]*

***

Не бойся слова гучнага – прарок! –
Прарок не Бога – праўды слых і зрок.

*Куляшоў А. Варшаўскі шлях [39, с. 196]*

***

Не прыпыняйся, не жахайся, слова!..
Хай адвячорак доўгім ценем лёг –
Магчыма немагчымая размова
Датуль, пакуль магчымы маналог.

*Куляшоў А. Не бачыўся я ўсё жыццё амаль… [39, с. 131]*

Репозиторий БрГУ

***

…кожны мае што сказаць, трэба толькі знайсці пункт ахвоты ці другое што важнае.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 8]*

***

На тое і словы,
каб лавіць
сполахі імгненняў
летуценных.

*Папека М. Чарнавікі [47, с. 10]*

***

Невядомая дарога на кончыку языка.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 145]*

***

І ўсё-ткі мудрае слова мацнейшае за меч. Меч кароткі. Слова доўжыцца ў людскіх пакаленнях.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 30]*

***

Лішнія словы могуць каштаваць лішніх бізуноў.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 308]*

***

Чалавек мае два вухі і адзін язык таму, што належыць двойчы пачуць і толькі адзін раз сказаць.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 344]*

***

Крык не бізун, ад яго скура не свярбіць.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 351]*

***

…страла, выпушчаная з лука, не вяртаецца назад, як і чалавечае слова.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 583]*

***

Можна шмат чаго бачыць і заўважаць, але не пра ўсё і не ўсім гаварыць.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 37]*

Репозиторий БрГУ

***

Прамоўленыя словы часта нічога не значаць.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 63]*

***

Сапраўды, пагаварыць мы ўсе майстры, а вось слухаць не ўмеем і не хочам.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 137]*

***

…і кожны сказ патрабуе кропкі…

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 160]*

***

Сапраўды, існуюць пытанні, на якія ніколі не зможаш адказаць.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 184]*

***

Часам добрага слова і хапае людзям, каб мірна жыць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 108]*

***

Каб пісаць, не трэба шмат умець, а толькі навучыцца растлумачваць сваё жыццё.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 318]*

***

Учынкамі можна кіраваць, думкам не забароніш.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 320]*

***

Паэзія – вечная мара аб Шчасці, вечная прага Гармоніі ў свеце, Згоды і Ладу паміж людзьмі.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 5]*

***

Сёння матчынай мовы, а заўтра
Засаромішся маці самой!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 27]*

Репозиторий БрГУ

***

Лепей сто разоў на слове збіцца
(Дараваў бы ў сто разоў хутчэй),
Чым паперкаю адгарадзіцца
Ад гарачых сэрцаў і вачэй!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 34]*

***

Пакуль паэты будуць пець –
Не быць Радзіме безыменнай,
Зямлі бацькоў – не анямець!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 96]*

***

Ад сэрца да сэрца – ці свята, ці будні –
Ідзі, мая мова, ідзі без прынукі!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 139]*

***

У гэты век, што адвучыў маўчаць,
У кожным абудзіўшы сверб размовы,
Я веру у нясказаныя словы,
Якім, магчыма, і не прагучаць.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 158]*

***

Страціў слова, страціў спадчыннае слова –
Штосьці страціў у душы абавязкова!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 193]*

***

Мова – самы дарагі, самы каштоўны скарб у любога народа.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 406]*

***

Слова, слова, слова – вось самы спажыўны хлеб для нашай душы!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 406]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# РОЗУМ І СЭРЦА




Репозиторий БрГУ

***

Галава ў ног розуму не просіць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Прыгожаму не трэба ўпрыгажэнняў,
як доказу для мудрасці не трэба.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 7]*

***

Розум? Праца?! Ды ты, саколе, працуй, хоць расцягніся, а калі табе не йдзе рукой – усё роўна нічога не будзе.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 49]*

***

Хто ж кавалак хлеба або апошнія грошы аддае іншым, не думаючы пра заўтра; разумны чалавек найперш павінен забяспечыць сябе; век звекаваць – не пальцам паківаць, дык няхай кожны думае пра сябе.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 195]*

***

Мабыць, такі ўжо лёс усіх сумленных людзей – дурні і зламыснікі робяць, а разумныя ды сумленныя папраўляюць…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 379]*

***

Трэба жыць не толькі сэрцам, але і розумам.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 124]*

***

Калі спрачаюцца разумныя людзі, гэта іх, як вядома, збліжае.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 149]*

***

…калі няма розуму, то і вялікія грошы дабра не прынясуць…

*Зізюк М. Кароль Капайла і яго атачэнне [27, с. 54]*

***

Не заўсёды розум бярэ верх над пачуццём.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 253]*

Репозиторий БрГУ

***

Розум часам кажа адно, а сэрца другое.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 121]*

***

…апрача законаў дзяржаўных, суровых і літасцівых, запісаных у кнігах, ёсць яшчэ адзін закон – няпісаны закон сэрца.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 144]*

***

…твой дом там толькі, дзе ёсць літасцівыя сэрцы.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 395]*

***

Розум напаўняецца нянавісцю і сэксам, калі не выдаткоўвае любасці.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 338]*

***

Найвышэйшы сэнс перабудовы – не нашая, не нашага кволага чалавечага розуму, прэрагатыва. А нам застаецца толькі ўсведамлянне сябе і заўсёдны ўласны выбар, пазіцыяванне сябе – у тым ліку і ў светабудове…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 346]*

***

Кожны выхоўвае, як яму падказвае сэрца.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 241]*

***

Пытаешся, якая розніца паміж хітрым і разумным? Хітры на адзін раз. Разумны – назаўсёды.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Самы лёгкі тавар – розум.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Калі ў семдзесят гадоў няма ўнукаў, дык і не будзе, калі ў шэсцьдзясят слава не знайшла, дык і не знойдзе, калі ў пяцьдзясят няма грошай, дык і не будзе, калі ў сорак няма кахання, дык і не будзе, калі ў трыццаць няма прафесіі, дык і не будзе, а ўсё таму, што ў дваццаць не было розуму.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

Репозиторий БрГУ

***

Хто намагаецца ўсяму надаць сэнс, той мудрэц.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Розум – ненадзейны правадыр таму, хто шукае шлях да Госпада.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 347]*

***

Жаль і любоў часам адпрэчваюць розум.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 21]*

***

Чаму словы мудрасці бяссілыя менавіта тады, калі перастаеш спадзявацца на ўласны недасканалы розум?

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 82]*

***

Толькі дурань рызыкуе дзеля пустой хвальбы.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 234]*

***

Шлях да вышэйшай мудрасці ідзе праз пакорлівасць.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 235]*

***

…разумны чалавек заўсёды будзе паважаць перакананні іншага.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 32]*

***

…сэрцу мілей цуд і казка, нават калі ведаеш іх ілюзорную прыроду.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 106]*

***

Калі надзяваюць ашыйнік на чалавека, які ўмее мысліць і ствараць, і дакрануўся да мудрасці асветы, і адчувае, што такое годнасць, – гэта часам горш за смерць.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 141–142]*

Репозиторий БрГУ

***

Не шукай багацтва, а шукай розум.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 46]*

***

…лепей мець разумнага ворага, чым дурня-сябра.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 210]*

***

Трэба стрымліваць язык розумам.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 344]*

***

Трыумф розуму – гэта добра, але высокі палёт розуму яшчэ не заўсёды азначае высокі палёт духу.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 114]*

***

Хваліць сябе і задаволены ўсім можа толькі дурань.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 147]*

***

Свет жа вялікі, у адным баку дурні, у другім разумныя… Пахадзіўшы, можа, прыб'ешся і да такіх, як сам, і тады лягчэй стане?

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 217]*

***

Душы наіўныя бываюць, а розум ніколі – недалёкі, гэта іншая рэч.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 362]*

***

Не ўсе адразу мудрасці да чалавека даходзяць.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 462]*

***

Няшчасны той, хто ўсё прымае
Да сэрца блізка і ўсур'ёз.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 12]*

***

…чалавек, калі паранены, як звер, не розумам – ён болем жыве.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 103]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі ты ўсё спазнаў па поўнай меры
І не паспеў душою пастарэць,
Не бойся, што баліць часамі сэрца, –
Яно ж на тое сэрца, каб балець.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 10]*

***

…розум чалавечы не можа заспакоіцца, пакуль не вытлумачыць сабе цёмнага, невядомага, няяснага.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 42]*

***

…колькі б людзі ні думалі, хоць бы нават страцілі апошні волас на галаве ў сваім думанні, дык і тады не здолеюць даць разумнага адказу на некаторыя запытанні.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 85]*

***

Усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 93]*

Репозиторий БрГУ

# ВЕРА І БЯЗВЕР'Е



Репозиторий БрГУ

***

А падумаўшы, дык і на чорта яна, прасці Госпадзі, вера такая, каб адзін чалавек у пекле гарэў, а другі ўжо быў загадзя рады?..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 97]*

***

Дазнацца б мне: за што нас, як і дзе
ўсявышні ці калечыць або вечыць.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 17]*

***

Што можна, што будзе, каму што наканавана, ведае адзіны толькі Бог.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 79]*

***

Найлепшы доктар – сам Бог, а самае скутэчнае лякарства – хлеб з маслам.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 34]*

***

Хоць хітры будзь, хоць борзды будзь,
Як сокал у ясным небе.
А волі Божай не мінуць
Нікому ні ў якой патрэбе.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 80]*

***

Чорту ўсё адно, што дзед, што ўнук – не мінуе яго рук.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 89]*

***

…несправядлівасць і гора былі на зямлі заўсёды, і вінаватых вельмі жорстка карае Бог.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 29]*

***

Вялікая сіла вера. Але не меншая сіла і страх.

*Сачанка Б. Тыя [55, с. 311]*

***

Зразумела, што збавенне не ў самых абрадах, а ў Божай ласцы, якую можна атрымаць праз вернасць выканання. Іначай што?.. Адкрыеш рот, і ежа – скок сама?..

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

Репозиторий БрГУ

***

Сучасныя музычныя рытмы (бліжэй да канца свету?) у сваёй дысгармоніі такія недарэчныя, што падобныя да бяздумнага ляпання рукой у часе малітвы.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 85]*

***

Геній – Божы хам?

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

Нічому і нікому не пакланяцца можа толькі той, хто нічога і нікога не адмаўляе.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 156]*

***

У ноч,
калі знікае геній,
на небе сустракаюць Бога.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 179]*

***

Бязважкая парушынка… Ці не галаграфічная Божая камера?

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 311]*

***

Трагізм – гэта няздольнасць старога адпавядаць новаму, альбо, па-іншаму, і хіба што слушней – разрыў паміж верай і няверай.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 353]*

***

Чалавечая гордасць – спроба Створцы перасягнуць нечалавечую ўпартасць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 361]*

***

Вобразы – узровень малітвы ўяўлення…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 362]*

***

Любасць да мудрасці – спроба дакрануцца разуменнем да Створцы…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 363]*

Репозиторий БрГУ

***

Можа, перад Богам канфесія ад канфесіі не лепшая, чым жанчына ад жанчыны, і не варта мяняць канфесію дзеля жанчыны, як і жанчыну дзеля канфесіі. Ад таго і ад другога варта адмаўляцца толькі дзеля шчырасці – няшчырасці – г. зн. свайго адчування запраўднасці праз гэта перад Богам…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 365]*

***

Богу – Богава, астатнім – іхнае…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 368]*

***

Божа ж мой, Божа, колькі ўсялякага багацця на свеце, як таго смецця ў хаце, калі не падмятаць яе тыдзень.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 61]*

***

Любая рэлігія мае права на існаванне, абы толькі служыла дабру.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 52]*

***

…рэлігія, як і жыццё, даецца толькі аднойчы.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 55]*

***

Вера бацькоў – не каптан, каб мяняць, калі захочацца.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 58]*

***

Памяняць веру – усё роўна што памерці і нарадзіцца наноў.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 58]*

***

Калі людзі ўлюбляюцца, можна не сумнявацца, што іх адзначыў Бог.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 247]*

***

Бо ў нябёсах з лёсам згодных
Над усім улада Бога.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 339]*

Репозиторий БрГУ

***

…простыя людзі шчырэй моляцца Богу.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 358]*

***

Шчасны той, хто хоць раз у сне бачыў Анёла.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 371]*

***

Чалавек плодам злым труціцца не заўсёды.
Плод жыцця той зрывае, хто слухае Бога.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 382]*

***

Горкім бывае часам нашае жыццё, але хто спадзяецца на Бога, – Бог злітуецца і ўсё пераменіць на лепшае. Бяда таму, хто, прагнучы багацця, прадае сваю душу пеклу.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 26]*

***

О, Божа! Перад Табою няма нічога таемнага. Ты будзеш суддзёю спраў людскіх, але людзі пра гэта забываюць.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 31]*

***

Таму, хто просіць Бога, няма чаго баяцца.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 120]*

***

Людзі робяцца недаверкамі не таму, што бачаць у веры нейкія недарэчнасці, а таму, што, маючы бездапаможны розум і прытупленыя распутным жыццём пачуцці, не могуць ні адчуваць, ні кахаць, ні разумець праўду рэлігіі.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 175]*

***

Клясціся страшна. А клясціся імем самога Бога, клясціся перад яго святым лікам, гэта… гэта… прысягацца, browse, яшчэ страшней.

*Гарэцкі М. Прысады жыцця [14, с. 29]*

Репозиторий БрГУ

***

Грахоў на нас – як пяску.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 349]*

***

Рай – калі ёсць выбар, а пекла – калі выбару няма.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Без Бога жыць можна, але з Богам у душы надзейней і спакайней.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

У веры ідэі няма. У яе ёсць адны правілы паводзін для душы і цела.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Атэіст – гэта не той, хто не верыць у Бога, а той, хто намагаецца паставіць сябе на яго месца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Адвечная дылема для чалавека – калі не скараешся Богу, не супрацьстаіш д’яблу.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Спакуса існуе ў самім чалавеку. Але віну за гэта ён ахвотна перакладае на іншых без падказкі д’ябла.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Рэлігія – грандыёзны, надзейны метад заспакаення трагічных сумненняў чалавека аб бессэнсоўнасці жыцця.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Апошняя мара чалавека: патрапіць бы ў Рай, а не ў Пекла.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

Репозиторий БрГУ

***

Словы “так” і “не” належаць Богу. Чалавек мусіць вымаўляць іх з асаблівай асцярогай.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 378]*

***

…лепш быць далёкім, але ўсё ж сваяком Бога, чым найбліжэйшым суседам чорта.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 383]*

***

Даруйце штодня адно аднаму дробныя грахі, каб яны не перараслі ў вялікія, недаравальныя.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 393]*

***

Без веры ў цуда душа сляпая, нібы начны матыль. Але вельмі часта ў пошуку незвычайнага мы ляцім, як тыя матылі, не да зор, а на агеньчык свечкі альбо газоўкі…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 16]*

***

Багі не даруюць тым, хто прамаўляе іх словамі на зямлі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 36]*

***

Грахі роду належыць сплочваць.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 6]*

***

…вакол кожнага святога месца кружляюць тыя, хто стаміўся ад цемры, але баіцца святла.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 128]*

***

Як толькі чалавек вырашае, што над чымсьці ўладарыць, Гасподзь адразу ж даказвае яму адваротнае.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 149]*

***

Бог богам, а калі сам не зробіш – ніхто не паможа.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 24]*

Рэпазiторый БрГУ

***

Так яно спрадвеку называлася – сумленне, чалавечнасць – словам Бог, з вялікай літары.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 84]*

***

Молімся чужому Богу,
забыліся на сваіх.

*Папека М. Чарнавікі [47, с. 59]*

***

Раз на год і ў пекле бывае свята.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 303]*

***

Вер толькі таму, што ўбачыш сваімі вачамі, што кранеш сваёй рукой.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 405]*

***

Перамагаюць не толькі сілай, перамагаюць верай.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 417]*

***

Рай – то рай, але ж і крыж цягаць не вялікае шчасце.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 84]*

Репозиторий БрГУ

# ДУША І ДУХ



Репозиторий БрГУ

***

Калі чалавек ніякага граху на душы не мае, дык робіцца такім лёгкім, як тая птушка, што пад самае неба лятае.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 28]*

***

Душу людскую ад пакут на гэтым свеце і ад пагібелі на тым выратаваць… Хіба гэта малая справа?

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 48]*

***

…часам бывае так, што душа чалавека няспынна чуе нейкі шэпт, які не сціхае ні ў часе яды, ні ў часе працы, ні ў цішыні, ні ў шуме. Не, гэты шэпт не перашкаджае жыць чалавеку яго звычайным жыццём, не замінае ўсім органам цела выконваць уласцівыя ім дзеянні, але з'яўляецца нібы другім жыццём, яшчэ адным патаемна дзейнічаючым органам існавання.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 101]*

***

Прыгожым чалавека робіць добрая душа. Яна свеціцца ў вачах, у кожнай рысе твару.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 117]*

***

Лепш быць сляпым або бязногім,
Чым мець халодную душу.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 56]*

***

Найцяжэйшы, смяротны грэх – загуба душы і цела на гэтым і на тым свеце.

*Гарэцкі М. Прысады жыцця [14, с. 29]*

***

Ты не бойся пустэчы вакол сябе, ты бойся пустэчы ў сабе, бо пустэча вакол цябе толькі ад холаду і абыякавасці ў душы тваёй.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 122]*

***

…учынкі духоўных, сціплых людзей гояць душы іншых, якія паранены роспаччу, няўдачамі, адчаем ды зайздрасцю калег.

*Марчук Г. Невена – жонка дыпламата [46, с. 327]*

Репозиторий БрГУ

***

Адзінота – гэта стан душы.

*Марчук Г. Адзінота [46, с. 352]*

***

Душа – маці характару.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Калі адчай трапляе ў душу і ахоплівае яе, глыбей усведамляеш недасканаласць чалавечай натуры.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Хто прадугледзіць, як і калі прыгажосць пастукаецца ў ягоную душу?

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 296]*

***

Калі душа ахопленая пякельным агнём, цела прапаліць сабе шлях.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 439]*

***

Не ўсё, што мы спазнаем, ідзе на выратаванне душы.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 221]*

***

Пакуль у целе чуецца душа,
Не веру я ў таемны сэнс другога
Яе жыцця.

*Куляшоў А. Варшаўскі шлях [39, с. 188]*

***

О так, няпроста гэта – дакранацца да другой душы!..

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 114]*

***

…сорам, які спальвае душу, асабліва страшны, проста невыносны, калі ты пакутуеш ад яго на вачах у сваіх сяброў.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 212]*

Репозиторий БрГУ

***

Лепей вораг, чым сябар. Вораг бярэ волю, сябра – душу.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 324]*

***

Дзявочая душа, кожная ў свой час, павінна перарадзіцца ў душу жаночую, больш мудрую і шчодрую.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 361]*

***

Якая карысць чалавеку, калі ён заваюе ўвесь свет, але згубіць душу сваю?

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 518]*

***

Глядзім вачамі, бачым душой.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 531]*

***

На чалавечую душу і так хапае ўсякай атруты, хвароб, дык навошта яшчэ і сваёй мярзоты падліваць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 16–17]*

***

Люстэрка можна выцерці, няможна выцерці ад бруду душу.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 31]*

***

Любое свята пачынаецца са свята душы.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 362]*

***

Свет быў складаны толькі таму, што людзі замкнулі сваю душу на замок, і ключ ад яго – гэта адзіны ключ, які не можа пабываць у руках іншага.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 405]*

***

Ні дар, ні спрыт, ні навык
Не дапаможа, калі спіць душа.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 87]*

Репозиторий БрГУ

***

Страшней за ўсё, як робяцца пустынямі
Палеткі плодныя людской душы.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 95]*

***

Хай будуць душы ўсякія,
Апроч нялюдскіх душ!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 135]*

***

Яна становіцца безабароннай –
Душа без голасу зямлі сваёй.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 147]*

***

Галоўнае – паставіць душу на месца. Каб душа на месцы была. Гэта ж не жарты – душа цэлага народа!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 472]*

Репозиторий БрГУ

***

…шчасця
На свеце большага няма,
Чым да людской душы дапасці,
Каб засвяцілася яна.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 55]*

***

Які б ні быў для рук занятак –
Усё ж палёгка для душы.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 74]*

***

…чалавек усё ж павінен
Баяцца нечага ў душы…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 158]*

***

Не ў адной толькі нашай душы
Зерне ёсць хараства…

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 3]*

***

…здалёку ўсё з’яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы – бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 19]*

***

Ёсць атрута, якая забівае павольна, але верна – бяздушша.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 194]*

***

Калі дэманічныя светы шчыльныя, дык чым не пекла ў гэтым свеце, калі душа трапляе ў камяні, цэмент, бетон?..

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 372]*

Репозиторий БрГУ

# ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА



Репозиторий БрГУ

***

Прырода – бязвінна, чыста і ніколі не здрадзіць, як чалавек.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 157]*

***

...дзе ёсць мёд, бываюць і пчаліныя ўкусы.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 259]*

***

Пагода – няпэўная рэч.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 150]*

***

Чорт яго бяры з надвор’ем, якое яно ні ёсць!

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 168]*

***

Найлепш, кажуць, тая рыба, што чухаецца аб плот.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 127]*

***

Красу прыроды хлебароб адчувае інакш, паўней, чым яе староннi назіральнік, няхай сабе нават найлепш эстэтычна падрыхтаваны ці па натуры вельмі чулы.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 321]*

***

Няма на свеце нічога больш неабходнага чалавеку, чымсьці сонца.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 48]*

***

…палку ў зямлю ўтыркнуў – ужо ўсё і па-інакшаму. А калі гэтая палка ды яшчэ парасткі пусціць…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 61]*

***

У прыроды свае законы і клопаты, свой парадак і свая завядзёнка: калі свяціць сонцу, калі ісці дажджу, калі падаць снегу.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 254]*

***

Многае робіцца ў свеце не так, як нам таго хочацца.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 137]*

Репозиторий БрГУ

***

А хто бездакорны, не мае заган? Сонца – і тое, кажуць, з плямамі.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 328]*

***

Птушыны свіст – тое ж рыпенне колаў у калёсах прыроды…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 365]*

***

Паміж чалавекам і чарвяком розніца малая. Чарвяка есць рыба, а чалавека зямля. Ці пан ты, ці мужык, ці кароль, ці парабак – кожнага зямля праглыне, як рыба чарвяка.

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 11]*

***

Няма горшага сабакі, чым той, хто ўладарыць над гаспадаром!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 98]*

***

Нічога не мяняецца ў прыродзе:
То спёка, то снягі, то туманы, –
І з веку ў век усё у поўнай згодзе:
Зямля чакае новае вясны.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 109]*

***

Зведаў скалы й пустэльні ды морскія хвалі,
Анідзе маіх мукаў вятры не парвалі.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 359]*

***

Чалавек не можа бачыць і чуць далей, як яму прырода дазволіла.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 196]*

***

Дрэвы жывуць даўжэй, чым людзі.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 6]*

***

Зямля ўсё ж такі нешта большае, чым тыя простыя рэчывы, з якіх яна, здавалася б, складаецца…

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 29)]*

Рэпазіторый БрДУ

***

Ці вартыя людзі гэтага цудоўнага свету, у якім нарадзіліся, гэтага сонца, прыроды?

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 79]*

***

Сіла разбурэння бушуе, каб абудзіць сілу тварэння.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 281]*

***

Рыба есць рыбу, а чалавек – чалавека.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 338]*

***

Прыме зямля ў свой дол, як будзённае штосьці, косці каня, чалавека і глечыка косці.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 173]*

***

Што ўтрымлівае чалавека на зямлі? Абавязак перад бацькамі і Радзімай, любоў да дзяцей і задавальненне цікаўнасці.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

***

Шмат каго з людзей можна назваць унікальнай з’явай у свеце жывёл.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Да таго, хто забівае ў палёце ластаўку, з асцярогай падыходзяць і просты чалавек, і прэзідэнт.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Рака не чалавек, яна злой не бывае.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 384]*

***

Чалавека робіць адрозным ад жывёлы не тое, што неабходна, а тое, што залішняе… Тое, што не прыносіць відочнай карысці.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 49]*

***

Чалавек вельмі лёгка ператвараецца ў звера.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 453]*

Репозиторий БрГУ

***

Ах, як рэдка прыслухоўваемся мы да прарочага голасу прыроды і да якіх сумных наступстваў прыводзіць наша непапраўная няўважлівасць!

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 470]*

***

Хто б з продкаў мог падумаць, што хлеб зробіцца некалі сувенірам, забаўкай, як паштоўка!

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 17]*

***

Камень на адным месцы і той абрастае, а пачні качаць яго туды-сюды – у порах рассыплецца.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 10]*

***

Зямля чалавекам дзержыцца, адступіўся чалавек – і ўсё на закат пайшло.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 20]*

***

…піскам пагоду не паправіш.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 24]*

***

З жывёлай навучыліся гаварыць, а між сабой развучыліся.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 74]*

***

…хто набярэцца смеласці сказаць ільву, што ў таго з рота смярдзіць.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 217]*

***

Пташкі, як людзі, чапі гняздо, – і пасыпаліся хто куды.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 102]*

***

Рознай вышыні і чысціні бываюць хвалі на моры. Гэтак жа сама і сярод людзей.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 420]*

***

Часцей глядзі на зоркі, бо неба – тая ж кніга, і, можа, прачытаеш, хоць не ўсе, думкі мінулых людзей.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 561]*

Репозиторий БрГУ

***

Ападаюць пялёсткі, і застаецца насенне – аснова ўсяго. Так і ў захапленнях.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 42]*

***

Чалавек не заўсёды чалавек, а сабака – заўсёды не толькі сабака…

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 92]*

***

Няма агідных песень у прыродзе.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 240]*

***

Рай нейчы хвалім у ахвоту.
А вось задумваліся вы,
Што ў нас, апроч, бадай, асоту –
Няма калючае травы?

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 78]*

***

Найлепшы яблык – самы смачны
І самы спелы – есць свіння!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 112]*

***

Раз ёсць начное неба ў зорах –
То, значыць, ёсць і зарапад…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 171]*

***

Воўк ля сваёй нары авечак не дзярэ.

*Мажылоўскі Ул. Праклён мітрапаліта Феафіла [45, с. 33]*

***

Вясна – гэта такая пара, у якую адны толькі няўдатнікі, адны бяздольнікі, па справядлівасці нешчаслівыя, не знаюць радасці.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 15]*

***

…далеч, як ніякі ў свеце мастак, умее паказаць рэчы ў найпрыгажэйшым выглядзе.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 73]*

Репозиторий БрГУ

# ЧАЛАВЕК І ПРАЦА




Репозиторий БрГУ

***

Не бывае такога калектыву, каб усе начальнікам сваім задаволены былі.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 303]*

***

Па велічыні ж кабінета некаторыя мяркуюць пра значнасць таго, хто ў ім сядзіць.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 306]*

***

Перабудову трэба пачынаць з сябе.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 307]*

***

…самы лепшы лекар ад нуды – праца.

*Шыцік У. Агеньчык у цемры [57, с. 278]*

***

Змаганне за “прафесіяналізм” тады этычнейшае, калі наўзамен ты прапануеш сваё, лепшае, а не голае абурэнне.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 335]*

***

...не ад адной работы есці хочацца, а можа хацецца і ад лежні.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 37]*

***

Доўга чакаць вечара, калі ніякага занятку няма.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 94]*

***

Трэба ж рабіць, каб сляпыя не бачылі.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 97]*

***

Калі работа падабаецца – добра, а калі не – ліха з ёю!

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 56]*

***

Застацца без работы – застацца без усяго.

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 337]*

***

Калі хочуць пакараць чалавека, які ўсё сваё жыццё пражыў з працы, дык у яго адбіраюць гэтую працу…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 154]*

***

Нас выратуе працавітасць, мы ўмеем працаваць.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 148]*

Репозиторий БрГУ

***

Работа ж ганьбы чалавеку не дае.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 32]*

***

…адны музыканты маюць заробак – незалежна, якая на вуліцы ўлада і якія законы.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 44]*

***

Ох, які цяжкі ты, першы рубель.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 48]*

***

Гэтак жа, як супрацоўнік спецслужбаў ніколі не скажа, што ён супрацоўнік спецслужбаў, так і мудры чалавек ніколі не скажа, што ён мудры.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Хто страціў цікавасць да прафесіі, ідзе ў палітыку.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Калі ваша праца не атрымлівае адпаведнай ацэнкі, на тое ёсць дзве прычыны: ці то зайздрасць, ці то неразуменне.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

Не паспеюць чалавеку крэсла падставіць, як ён ужо гатоў, прысвоіў сабе, прыкаваў сябе да яго, і невядома, што большае – ён ці яно.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 15]*

***

У спрэчках – зух,
з трыбуны – звон.
Аж хлешча цераз край актыўнасць.
А як да справы, працы –
ён
тут праяўляе *крэатыўнасць*.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 40]*

***

Праца… Ад яе за гады настолькі стамляешся, што і самы любімы занятак ператвараецца ў пакутлівае выпрабаванне.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 210]*

Репозиторий БрГУ

***

Ужо такі закон, што для чалавека, які вырас на зямлі і які ад роду не ведаў іншых клопатаў і дбання, чым зямля, чым карпець на ёй да поту і крыві, адзінаю меркаю дабрачыннасці, чалавечай годнасці была **праца** *(выдз. аўт.)*, яе вялікасць Праца.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 31]*

***

…няўмека ў чужой працы бачыць недахопы, а майстар – майстэрства.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 98]*

***

Павінен хтось і хлеб рабіць!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 13]*

***

Калі на свеце нехта дзесьці
Умее добра працаваць, –
То ўмее ён і смачна з'есці
І – адпаведна – згатаваць!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 120]*

***

…месцы бываюць дваякія: на адны мы самі рымсцімся, а на другія нас цягнуць, узяўшы за вушы.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 37]*

***

Работу трэба браць не раціварсцю, а цяглівасцю. Не той працуе, хто, як стаенны жарабец, танцуе, а хто, як ярэмны вол, аднэй натугай можа доўга цягнуць.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 96]*

***

Эканоміка не церпіць самадурства. У яе сваё непахісныя законы.

*Лявановіч Л. Сіняе лета [42, с. 111]*

***

Спакон веку асабістая сімпатыя іграе рашаючую ролю – прызначыць або не чалавека на вышэйшую пасаду.

*Лявановіч Л. Сіняе лета [42, с. 220]*

***

…не ўсе прапановы ўваходзяць у пастановы.

*Лявановіч Л. Сіняе лета [42, с. 224]*

Репозиторий БрГУ

# НАСТАЎНІКІ І ВУЧНІ



Репозиторий БрГУ

***

…каб надоўга заставацца цікавым і карысным сваім вучням, трэба штодня муштраваць, шліфаваць сябе.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 154]*

***

Настаўнік, як чалавек і творца, прадаўжае жыць ва ўсіх людзях, каму паспеў перадаць сваю душэўную і духоўную спадчыну, у сваіх дзецях, жонцы, радні.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 155]*

***

Лёс настаўніка часта залежыць ад таго, як ён прывітаецца з вучнямі ў першы раз, як скажа першыя словы.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 109]*

***

Было б цярпенне і жаданне працаваць – веды будуць.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 127]*

***

Мара студэнтаў усіх часоў, усіх навучальных устаноў: яшчэ б адзін дзень!

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 241]*

***

Хто вучыцца, той павінен пра ўсё ведаць.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 21]*

***

Пачнеш вучыцца і старацца,
Глядзіш – і выйдзе чалавек.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 5]*

***

Цябе вучыць – толькі псаваць.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 130]*

***

Для мноства людзей навука матэматыка пачалася і скончылася простым падсумоўваннем грошай пры разліках.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

Репозиторий БрГУ

***

Быць доктарам філасофскіх навук і філосафам – часцяком вельмі розныя рэчы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Вуліца выяўляе таленты, школа садзейнічае іх развіццю.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 397]*

***

Школа навучыла трохі ўсіх быць людзьмі, бо навучыць адразу на ўсё жыццё немажліва.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 399]*

***

…вучоныя людзі на тое і вучоныя, каб гаварыць пра тое, чаго не было, і тое цудоўнае, чаго не будзе.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 258]*

***

Веды – адзінае, што мы можам забраць з сабою ў любых жыццёвых варунках. Адзінае, што не здрадзіць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 435]*

***

…калі ёсць чаму і ў каго навучыцца, трэба не ўпускаць такой магчымасці! І калі можаш падзяліцца ведамі, трэба гэта рабіць.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 83–84]*

***

Што ўмееш, за плячыма не будзеш насіць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 116]*

***

Дзе гэта відана, каб усякая жаба вучыла!

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 144]*

***

Вучні паважаюць у настаўніку не ўказку, якой ён іх вучыць, а розгу, якой ён іх лупцуе.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 206]*

Репозиторий БрГУ

***

Без працы – школе грош цана!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 145]*

***

Толькі тая веда робіцца нашым сталым здабыткам, калі мы даходзім да яе, здабываем яе самі.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 54]*

***

Настаўнікі вызваляюць вучняў ад нянавісці шляхоў у злачыннай пакоры ўзорам.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 164]*

***

Два вялікія жаданні валодаюць чалавекам – прага любові і прага ведаў. Першае штурхае пладзіцца і размнажацца, другое – спазнаваць таямніцы і загадкі жыцця.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 48]*

Репозиторий БрГУ

# ЖАНЧЫНЫ І КАХАННЕ



***

Чаго я плачу?
Ці ж ёсць іначай
У тых, хто любіць?

*Белая А. ***Тваё Алёна… [7, с. 28]*

***

Кахаюць не тых, хто прыносіць спакой,
А тых, хто яго адбірае!

*Белая А. ***Не выпадае… [7, с. 44]*

***

Кажуць, ніштo так не ўпрыгожвае жанчыну, як часовая адсутнасць мужа.

*Белая А. Сублімацыя, або З хронікі маршрута № 7 [7, с. 80]*

***

Лепш пашкадаваць аб тым, што зрабіла, чым аб тым, чаго не зрабіла.

*Белая А. Не казка пра чырвоны пантофлік [7, с. 83]*

***

…жанчыны – ад Бога.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 85]*

***

…каханне – самы вялікі экзамен у жыцці чалавека.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 144]*

***

Немаведама, якому цярпліваму трэба быць чалавеку, каб жаночую звягу ціхенька слухаць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 37]*

***

…хвіліны прадчування і чакання часам саладзейшыя, чым сам момант блізкасці.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 49]*

***

…жанчыны любяць удачлівых. Недарэкаў шкадуюць.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 82]*

***

Ад шкадавання да любові – адзін крок.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 83]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі нешта ведаюць дзве жанчыны, гэта ўжо не таямніца.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 188]*

***

Бязмужняя кабета – быццам незанятае таксі.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 307]*

***

Калі маеш намер любіць – трэба любіць больш за сябе, тады можна быць побач: не абмяжоўваючы мужчыну, ісці праз мужчыну да Бога. А тут – кожная любіць мужчыну для сябе, а не як прыступку на дарозе да Бога…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 81]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі бяруць шлюб, зважаючы толькі на цела, – яўна бяруць ката ў мяху, а калі – зважаючы на душу, дык і цела возьме сваё.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 81]*

***

Без выпіўкі не абысціся, калі жанчына няшчырая, а мужчына слабы і залежны.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 82]*

***

Табой захаплёнаму,
з іншай бываць –
як каменем з дрэва
агонь выбіваць.

*Касцюкевіч М. Яшчэ жывая Песьня… [34, с. 82]*

***

Мужчыны сэксу баяцца. Таму абагаўляюць жанчыну, заваёўваюць. А для жанчыны блізкасць больш сакральная, але й працейшая. Таму яны асобу цэняць, а не сэкс. Але за добры сэкс даруюць, што хочаш.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 83]*

***

…гэта не значыць, што ў любасці павінны быць звады, але любасць – павінна быць нават у звадах.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

Памкненне да цела – цудоўна, прыгожа, але часцей – разова, інакш можа быць атручанне. Арыентацыя на нутраны духовы свет дае амаль што неабмыльнае пападанне ў цэль і ў плане фізічным. І калі хочаш проста пакахацца з якой прыгожаю жанчынай – успомні пра няўхільнасць насычэння: “…а некага ад яе вонкавасці ўжо верне…” Раз падобныя развагі не палохаюць – наперад. Бог літасцівы, і чалавек вольны ў выбары. Прынамсі, заўсёды можна разысціся. І ніколі не позна павесіцца…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 87]*

***

Лепей за сустрэчу
вечнае каханне,
бо яно пярэчыць
болю развітання.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 32]*

***

Як гэта складана – вартаваць каханне, калі ў ім няма сумневаў.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 128]*

***

Толькі цяпло сустрэчы можа адчыніць храм кахання і здрадзіць холаду адзіноты.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 143]*

***

Калі каханыя нас пакідаюць, прыходзіць восень…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 144]*

***

“Спрактыкаванасць дапамагае жанчыне патрапіць у шлюб, мужчыну – унікнуць шлюбу…”

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 370]*

***

Каб пазбыць праявы ўласнае жывёльнасці, трэба сублімаваць яе ў саматычнае каханне. Ці проста завесці хатнюю жывёліну. Як для жанчын – найлепей ката.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 373]*

***

…сляпая жаночая злосць не мае дна.

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 51]*

Репозиторий БрГУ

***

У сто разоў лягчэй жыць адной, чым удваіх і заўсёды адчуваць адзіноту!

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 181]*

***

Каханне – гэта пужлівая птушка – не любіць, калі за ім наглядаюць чужыя няпрошаныя вочы.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 275]*

***

…жанчыне не заўсёды трэба гаварыць словамі. У вачах другога яна ўмее часам прачытаць тое, чаго не выкажаш ніякай мовай.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 291]*

***

Вось яна – уся тут жанчына! Зробіць другога вінаватым, а сама сухая з вады вылезе.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 137]*

***

…не ўсякую жаночую нявернасць можна асуджаць і кідаць у яе каменем і наадварот: іншая вернасць гроша паламанага не варта.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 162–163]*

***

Кахання не ампуціруеш…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 168]*

***

Калі каханую пачынаюць атаясамліваць з Богам, гэта ўжо сур'ёзна

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 36]*

***

Даць згоду на тое, каб стаць нявестай, гэта ўсё роўна, што даць клятву ў вернасці.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 50]*

***

…там, дзе квітнее каханне, вайна немагчымая.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 52]*

***

…каханне не мае адносін да догмаў.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 58]*

Репозиторий БрГУ

***

Замужжа – галоўная падзея ў жыцці жанчыны.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 75]*

***

Каханне – аснова ўсяго.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 75]*

***

Жаданне адрынутай жанчыны адпомсціць ёсць яе асабістае жаданне.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 137]*

***

Ці да гонару, калі кахаеш!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 160]*

***

…перш чым заваёўваць сэрца расчараванай жанчыны, трэба самому мець хаця б нейкае сэрца і кахаць гэтую жанчыну.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 214]*

***

Улюбляцца заўсёды небяспечна…

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 236]*

***

Жанчына – таямніца з таямніц.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 254]*

***

Як жанчына страціць пэўнасць, то робіцца як бы якая непрытомная. То плача, то смяецца, то злуе-халяруе, нічога ў свеце ёй тады ўжо не смакуе, і кожны лёгка заўважыць яе каханне.

*Гарэцкі М. Прысады жыцця [14, с. 31–32]*

***

Другога не стрэнеш, другіх не шукаеш,
Калі аднаго назаўжды пакахаеш.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 38]*

***

Каханне ніколі само не знікае.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 39]*

Репозиторий БрГУ

***

…жанчыне, якую кахаеш, трэба служыць.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 73]*

***

Было б каханне – і без вянчання можна жыць!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 85]*

***

Эгаістычнае ўсё ж такі стварэнне – жанчына.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 158]*

***

…каханне каго хочаш зробіць дзіваком.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 360]*

***

Галоўнае ў каханні, каб мужчыну і жанчыну цягнула адно да аднаго, інакш яно можа ператварыцца ў драму або нават у трагедыю.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 360]*

***

Што б ні казалі, а жанчына створана для кахання. І ў кожнай, напэўна, сваё каханне, не падобнае ні на якое іншае.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 361]*

***

Мы, жанчыны, не заўсёды ўсведамляем сваё прыніжэнне. Так пабудаваны свет.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 363]*

***

Каханне за грошы не каханне.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 419]*

***

Пакуль ёсць мой кароль, я не баба, а каралева.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 126]*

***

Адзінае, што не прызнае парад, – каханне.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 184]*

Репозиторий БрГУ

***

Непазнавальна таямнічая ўсё ж прырода жанчыны.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 198]*

***

Любіш – дык і шкадуеш.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 227]*

***

…бяда не ў прэміяльных, а ў тым, што людзі адмаўляюць адзін аднаму ў любові.

*Марчук Г. Акулы, кракадзілы, шакалы [46, с. 295]*

***

…мала, каб толькі цябе любілі, трэба, каб і ты любіў.

*Марчук Г. Слова пра дзень першы [46, с. 307]*

***

Каханне нараджае не толькі ўчынкі, але і словы.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 347]*

***

Першае прызначэнне чалавека – кахаць і быць каханым.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 347]*

***

Без кахання няма шчасця.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 348]*

***

На жаль, суровы час адвучыў нас звяртацца да жанчыны ўзнёсла.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 348]*

***

Каханне – гэта шаленства жадання, вулкан сумненняў, адначасовае цвіценне ўсіх садоў на планеце.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 349]*

***

Як жа не радавацца, не дзякаваць лёсу за тое, што ён паслаў нам неацэнны дар кахаць і што гэты дар, і толькі ён, ахоўвае нас ад бессэнсоўнасці і гібення на зямлі.

*Марчук Г. Свята пачуццяў [46, с. 349]*

Репозиторий БрГУ

***

Для закаханага чалавека час прыпыняецца, ён, чалавек, не старэе.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Каханне – свята душы, праца – свята розуму, смерць – свята цела.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Жанчына, здараецца, ратуе мужчыну ад самагубства, але часцей даводзіць яго да гэтага.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Даўгавечнасць кахання залежыць ад доўгацярплівасці жанчыны і ад ступені мужчынскай ляноты.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Ніхто яшчэ не вызначыў прычыну, чаму людзі ўлюбляюцца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Каханне – гэта цяжкая праца да натхнення і пасля натхнення.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Адвечная праблема жанчын – у адносінах да большасці я апранута добра, у адносінах да меншасці – кепска.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Калі ў чалавека няма любові, самому чалавеку цяжка і з ім цяжка.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Каханне – гэта няздатнасць усведамляць небяспеку.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Прызнавайся ўсяму жывому ў каханні, бо ў старасці на гэта не хопіць часу.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 411]*

Репозиторий БрГУ

***

Пра хваробы не думаеш, калі галава занята каханнем.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 59]*

***

Як быццам бы пакорлівасць можа спарадзіць каханне – яно ж, як іскры, высякаецца пры сутыкненні двух вартых…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 19]*

***

…каханне – гэта танец… Складаны танец дваіх, дзе амаль немагчыма захаваць раўнавагу – адзін робіць крок наперад, другі на крок адступае… Адзін схіляецца, другі выпроствaецца… Потым наадварот… Няверны рух – і ўсё парушана, цені разышліся, маскі зляцелі на паркет, чырвонае канфеці сэрцаў храбусціць пад абцасамі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 69]*

***

Хворых і няшчасных, ад каго адны клопаты, часам кахаюць куды глыбей і адданей, чым здаровых ды ўдалых.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 123]*

***

…хто сказаў, што каханне, няхай з прымешкам горычы і безнадзейнасці, гэта памылка?

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 169]*

***

Не, нямногага дабіліся жанчыны на шляху эмансіпацыі! Толькі што падчас французскай рэвалюцыі дамагліся права насіць трусікі…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 469]*

***

Не можа не быць працягу ў таго, што замешанае на любові і самаахвярнасці.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 6]*

***

У кожнага ёсць дзіцячае каханне – першае, няспраўджанае, недатыкальнае. Як пасмачку валасоў, састрыжаных у аднагадовага дзіцяці, яго належыць захоўваць у самай дальняй шуфлядзе памяці.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 37]*

Репозиторий БрГУ

***

Пераможаны мужчына – якая жанчына падзеліць з такім лёс?

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 66]*

***

…жанчыны не любяць тых, каго яны лічаць няўдачнікамі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 66]*

***

Калі жанчыне не хапае рэчаў – гэта толькі наступства. Гэта значыць, што насамрэч жанчыне не хапае кахання!

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 66]*

***

Віна мужчыны ў тым, што ён у каханні заўсёды – пераможца.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 129]*

***

Цывілізацыя не здольная знішчыць дарэшты нашыя інстынкты, і ў кожнай жанчыны ёсць патаемная зброя: ведзьмін крык.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 188]*

***

Няма жанчыны няшчасней, чым дабрадзейная.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 261]*

***

Дапусціць да сябе чужога мужчыну – усё роўна што пакарыстацца чужой зубной шчоткай.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 262]*

***

Аднак саюз мужчынскі – не каханне,
Дзе трэці лішні пакідае двух.

*Куляшоў А. Мой маналог, як палымяны конь… [39, с. 137]*

***

Любоў – не райскія сады,
Любоў – не дом падараваны,
Любоў – бяздомнік, прапісаны,
У верным сэрцы назаўжды.

*Куляшоў А. Чужой любві я не зайздрошчу… [39, с. 107]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі каханне абвянчае
Жаданай згодай маладых,
Свайго сумлення не хавае
Яно ад позіркаў чужых.
А звяжа шлюбам маладая
Сябе з нялюбым і старым,
Свайго сумлення не схавае
Яна за прозвішчам чужым.

*Куляшоў А. Калі каханне абвянчае… [39, с. 129]*

***

У баб на ўсё свой нюх і свая мерка.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 30]*

***

Тайна дваіх – ніколі не будзе тайнай дваіх.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 175]*

***

І ніхто яшчэ не разгадаў бабу да канца, як яна ёсць, ды і наўрад ці разгадае.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 175]*

***

Дзе любоў на грані тапара, трэцяму нечага рабіць.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 267]*

***

…кабета таксама павінна быць першай.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 46]*

***

…жанчыны ёсць жанчыны, яны заўсёды знойдуць агульную тэму для гутаркі, каб крыху папляткарыць.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 74]*

***

…каханне і жаль – несумяшчальныя паняцці.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 304]*

Репозиторий БрГУ

***

Былое каханне можа імгненна ўспыхнуць, як вогнішча ў купальскую ноч.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 491]*

***

Нездарма кажуць, што Бог ад прыроды пацалаваў кожную жанчыну.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 50]*

***

…дзе няма Жанчыны – няма душы.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 88]*

***

Памерці ў адзін дзень – шчасце для закаханых.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 119]*

***

Мозг жанчын, як і мозг дзяцей, прагне цудаў.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 372]*

***

Жанчына – істота таямнічая, але карысная.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 402]*

***

…тое, што любіш, несці няцяжка.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 274]*

***

…тое, што кажуць жанчыны, трэба запісваць не на пергамене і не на бяросце, а на паветры і на хуткаплыннай рачной вадзе, бо ўсё ў жанчын мяняецца, ніколі няма пастаянства ў доўгавалосых і доўгаязыкіх Евіных дачок.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 357]*

***

У каханні нельга спяшацца. Гэта дзейства вартае ювеліра.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 23]*

***

…у кожным жаночым сэрцы свая таямніца, якая змушае і цярпець, і нават пакутаваць, але зміранца.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 208]*

Репозиторий БрГУ

***

Цярплівасць жаночага сэрца – найвялікшая таямніца чалавечай прыроды.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 208]*

***

…шчасце з жанчынай салодкае толькі ў марах.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 294]*

***

Мусіць, чым больш чалавек кахае, тым больш у яго душы супярэчнасцей.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 295]*

***

Жанчына без дабраты настолькі жанчына, наколькі дрэва без соку можа лічыцца дрэвам.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 319]*

***

О, колькі можа нам жанчына
Сказаць у песні – пра сябе!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 122]*

***

Жанчына можа, брат, жанчыне
І болей выдаць «пад сакрэт»…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 160]*

***

Хіба змусіш каго, каб любіў цябе, раз ты нікому не люб?

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 15]*

Репозиторий БрГУ

# МУЖЫ І ЖОНКІ



Репозиторий БрГУ

***

Жонка – прафесія, а муж – хобі.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Які там бабнік – проста адзін баюсё спаць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 41]*

***

…мужчыны не толькі не плачуць, але і не лгуць.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 140]*

***

Старыя мужы! Да вас мова: у спакоі век жывіце, маладых жанок не бярыце.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 98]*

***

Жанчына, якая не пахавала сама любімага мужа ці сына, не пацалавала ў апошні раз, у глыбіні душы будзе верыць, што ён вернецца.

*Ылевановіч Л. Сіняе лета [42, с. 46]*

***

Праўду кажуць: хто кінуў курыць – можа зноў пачаць, хто кінуў піць – таксама, а вось хто ўжо кінуў да жанчын хадзіць, той болей не пачне…

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 58]*

***

Любому мужу вельмі прыемна, калі яго цэніць і шануе жонка.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 110]*

***

…чужы хлеб – гасцінец, а чужая жонка прыгажуня.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 279]*

***

Кажуць, мужык жонку памятае пасля смерці столькі, колькі гаршчок на прыпечку кіпіць…

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 58]*

Репозиторий БрГУ

***

…чужы муж, як і ўсё чужое, не грэе, а толькі крышачку цяпла дае, як пазаўчарашні прысак, гэта па-першае, а па-другое, надта ненадзейны, непрадказальны, збяжыць у любы момант, як толькі ўбачыць новую, ім яшчэ недаследаваную спадніцу.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 423]*

***

…толькі дзве катэгорыі мужчын могуць цярпець здзекі жанчыны: тыя, хто не разумеюць, што над імі здзекуюцца, і тыя, хто вельмі моцна кахаюць.

*Ярмольчык Н. Абразкі [58, с. 28]*

***

Мужчына павінен трохі памучыцца, перш чым завалодаць каштоўным скарбам. Інакш ён хутка расчаруецца.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 87]*

***

…у сям'і, дзе няма жаночай улады, нярэдка пачынаецца анархія.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 97]*

***

У стасунках паміж мужчынам і жанчынай страсць і расчараванне заўсёды ідуць побач. З цягам часу адно можа множыцца, другое гаснуць…

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 109]*

***

Ажаніцца – усё адно што ў турму трапіць або з даху ўніз галавой кінуцца.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 179]*

***

Без хазяіна – жонка сірата.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 126]*

***

Урэшце, жаніцьбы на зямлі не абмінуць, тады які сэнс яе адкладваць?

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 197]*

Репозиторий БрГУ

***

Добрых цешчаў на свеце не бывае. Гэта анамалія, як усё роўна, калі кажуць, што кракадзіл дабрэйшы за карову.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 202]*

***

Палюбоўнік трэба, калі жанчына хоча даведацца аб сапраўдных лічбах свайго сямейнага бюджэту. Палюбоўніца трэба, калі мужчына хоча даведацца пра хітрыкі і падманы ўласнай жонкі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Шчаслівы той, хто ажаніўся, яшчэ шчаслівейшы той, хто марыць пра шлюб.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Калі ваш муж у сне прамаўляе імя другой жанчыны – не засмучайцеся, іншыя вымаўляюць па два-тры імені.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

З былымі мужамі трэба размаўляць голасам Снежнай Каралевы.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 81]*

***

Кожны бачыць жыццё па-свойму, асабліва калі чалавекі гэтыя – мужык і баба.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 75]*

***

Страх перад жонкай бывае горшы за вайну…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 209]*

***

…жонкі – патрэбныя людзі. Яны хоць і бабы, і языкатыя, але заўсёды ўпору прыходзяць.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 216]*

***

…радня, як і каханне, трымаецца на адным агні: жыць разам, памагаць адзін аднаму, бачыць адзін аднаго.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 260]*

Репозиторий БрГУ

***

Мужчыне патрэбна крэпасць, а жанчыне лепасць.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 131]*

***

Недасяжная мара мужчыны – памерці там, дзе нарадзіўся.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 42]*

***

Шчасце зямное ў тым, каб мужу жыць з жонкай, каб зерне ў раллю кідаць.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 173]*

***

…і мужчыну не грэх паплакаць, абы людзі не бачылі.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 359]*

***

Жанчын любяць за прыгажосць, мужчын за адвагу і розум.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 402]*

***

Кожны сваё месца павінен ведаць. А месца ў нас такое: мужчына і сабака на двары, жанчына і кошка ў хаце.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 448]*

***

Мужчыну жыць лягчэй і весялей. Добры меч, добры конь, кубак мёду, пацалунак жанчыны – вось і ўсё, што патрэбна яму. Жанчыне ж трэба больш, невымерна больш, і ці не таму так шмат на зямлі няшчасных жанчын?

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 467]*

***

Не за кожнай драбязой бачны сапраўдны мужчына.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 19]*

***

…неспазнавальная душа жаночая, бяздонная яна ў сваёй любові, як і ў нянавісці, дарэчы.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 32]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі чалавека не любіш, не ляжыць да яго душа – бачыш у ім толькі благое і самай заблытанай сямейнай праблемаю будзе: каму памыць талерку?

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 95–96]*

***

…дрэнная сям’я – няшчасце большае, чым адзінота.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 119]*

***

Мужчына без крывадушнасці не папулярны ў жанчын, нават калі ён гусар.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 320]*

***

Жонцы можна здрадзіць горш і больш, не маючы нічога з жанчынаю (а толькі думаць пра яе), чым мець блізкасць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 326]*

***

Нават самая недалёкая жанчына можа праявіць кемлівасць, калі даходзіць да здрады мужу.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 326]*

***

…шчаслівых шлюбаў няма, уся справа ў тым, хто што знойдзе ў ім.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 331]*

***

…не кажы “гоп”, не пагаварыўшы з жонкай.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 302]*

***

Усім нам слухацца б жанок не шкодзіла:
Дзе баба з розумам – бяды няма.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 317]*

Репозиторий БрГУ

# БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ



***

Дзіця – Божы пасланнік на Зямлі.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 23]*

***

Як гэта па-божы справядліва, калі бацькі спаўна пераліваюць сваю энергію ў дзяцей, а дзеці спраджваюць іх надзеі.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 102]*

***

Яшчэ дзіцячы розум не ведае, што дзе ступіў, то і салгаць трэба.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 52]*

***

Мілы родны кут – бацькава хата!

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 88]*

***

Пра сына гаварыць будуць, а бацькава імя добрым словам успамянуць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 155]*

***

Не той цяпер свет, каб у бацькі пытацца, як лепш зрабіць.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 165]*

***

Час у маленстве вымяраецца днямі.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 121]*

***

...дзіця – заўсёды дзіця, заўсёды радасць, ці хлопец гэта, ці дзеўка.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 282]*

***

Зрэшты, і тое, што жыло ў памяці нашых бацькоў і дзядоў, што мы пачулі ад іх, як казку, здавалася ім калісьці беспрасветным ды бясконцым.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 317]*

***

Дзеці сентыментальнымі не бываюць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 331]*

Репозиторий БрГУ

***

Нашых маці, калі яны пакінулі нас назаўсёды, мы пачынаем любіць з новай сілай, з новым сумам і патаемнай пяшчотнасцю, што зноў і зноў ажывае ў душы ў тыя хвіліны, калі мы вітаемся з маткамі нашых сяброў.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 416]*

***

…калі дзіцё тваё прывыкне змалку паважаць кожнага старца, то, вырасшы, і цябе пашануе ў старыя гады.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 161]*

***

Кажуць, матчына сэрца заўсёды чуе бяду, якая б яна, тая бяда, ні была.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 8]*

***

Са смерцю бацькоў мы трацім адчуванне дамоўкі, той сям'і, у якой мы выраслі, адчуванне роднасці, крэўнасці, што адчувалі асабліва востра да гэтага…

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 281]*

***

…хто б і што ні гаварыў, а ў дзяцей павінны быць свае абавязкі перад маці, як ёсць яны і ў маці перад сваімі дзяцьмі.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 418]*

***

У разумных бацькоў – дзеці разумныя.

*Сачанка Б. Карчоўнік [54, с. 298]*

***

Каб небыццё ішло на злом,
дае цяпло бацькоўскі дом.

*Касцюкевіч М. Яшчэ жывая Песьня… [34, с. 83]*

***

Нарэшце, для кожнай маці даражэй за ўсё на свеце – гэта яе дзеці…

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 116]*

***

Хіба памрэ ў матчыным сэрцы ўспамін пра сына?

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 135]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі ж прыціснуць боль і гора грудзі
І здасца, што і дня не пражывеш,
Ты на хвіліну ўсё і ўсіх забудзеш
І, як маленькі, маму пазавеш.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 54]*

***

…дзеці сваіх бацькоў не судзяць.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 176]*

***

Мо так закладзена самой прыродай, што, не выхаваўшы дзіця, не аддаўшы яму частку свайго часу, нерваў, здароўя, і не палюбіш, як бы гэтай любові не хацеў.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 219]*

***

Ад суму і цяжкасці душэўнай нас найчасцей ратуюць дзеці.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 237]*

***

Гоіць душу толькі першы радасны крык дзіцяці, толькі ён вечная надзея, вера і любоў.

*Марчук Г. Божы дар [46, с. 278]*

***

Мне яшчэ не траплялiся бацькі, якія б пажадалі сваёй долі дзецям.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Радуйся, калі засталася бацькоўская хата і ёсць куды вяртацца. Стократ радуйся, калі ёсць куды і ёсць да каго.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 389]*

***

…насамрэч дзеці – істоты такія жорсткія, што часам назаўсёды пазбаўляюць адно аднаго самага галоўнага, што трэба для шчасця, – пачуцця абароненасці і самапавагі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 216]*

Репозиторий БрГУ

***

Жоўты пясок, з якога будуеш непрыступную крэпасць, матылёк, які ўяўляецца вогненнаротым страшным драконам, робяць роўнымі ўсіх дзяцей, дзе б яны ні нарадзіліся – у багатым цераме або ў крытай галлём і саломай зямлянцы.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 181]*

***

Калі мы хочам, каб наша гісторыя не скончылася разам з намі, не пайшла ў зямлю з нашай смерцю, мы павінны штодзённа, не шкадуючы сіл, напаўняць мудрасцю кніжнай дзіцячыя галовы, як амфары зернем і віном напаўняюць.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 176]*

***

Дзеці павінны хаваць сваіх бацькоў, а не наадварот.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 274]*

***

Нішто не скарае так чалавека, як туга па тым святым і кроўным, на чым вырас, што ўвабраў у сябе з дзіцячых гадоў.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 21]*

***

Як у бацькі не павінна быць да сына зайздрасці, так у сына да бацькі – нянавісці.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 32]*

***

Такая доля бацькоў – апекаваць патомства, ужо народжанае на свет, і з не меншай клапатлівасцю – толькі закладзенае: птушкамі – у яйках, людзьмі і звярамі – у мацярынскім чэраве.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 325]*

***

…няма большай радасці, чым радасць вучыць дзіцяці разумець свет.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 328]*

***

Дзіця ў сучаснай сям'і бы той цэмент, якім замазваюць трэшчыны.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 356]*

Репозиторий БрГУ

***

Як позна – любімыя дзеці –
Мы няўдзячнасць сваю
Разумець пачынаем…

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 20]*

***

Ніякай сіле, ліху злому
У сэрцы маці не забіць
Надзею: даць працяг жывому!
Надзею: песціць і любіць!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 95]*

Репозиторий БрГУ

# МАЛАДОСЦЬ
# І СТАРАСЦЬ



***

Старасць – не радасць. Возьмецца пажылы чалавек якую далікатную работу рабіць – рукі ў яго трасуцца. А як перапуд які, дык і зусім тады ходырам ходзяць – ведама цапу-лапу...

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 35]*

***

Амаль не ўсе старыя клясці і нешта крыху на праўду падобнае гаварыць здатны.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 77]*

***

Сур'ёзнасць старыць малады твар.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 156]*

***

Добра, канечне, любіць людзей маладых, каторыя варты гэтай любові. Аднак сустракацца з тымі, з кім сёе-тое перажРепозиторий БрГУыта, каторых усё менш ды менш, – гэта таксама добра.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 58]*

***

Загадка фарбаў, іх прызначэнне хвалююць нас і ў сталасці.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 341]*

***

Падумаў: "А ўсё-такі старэю…" І пастарэў яшчэ на некалькі хвілін.
Ну, дык ці варта ж думаць пра гэта?

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 398]*

***

У дарозе мы маладзеем, часамі нават дзяцінеем, ці што.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 430]*

***

З пагардай і абразаю маўчком
Спажыць свой час, што дадзены ад веку, –
Адно найменне стане з чалавека,
Калі да кону прыйдзе жабраком.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 8]*

***

Што можа быць больш шчырым, светлым і смелым, чым мары моладзі?

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 336]*

***

Вось так яно ў жыцці і бывае: маладое – займай сваё месца, старое – не замінай!

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 97]*

***

Чым больш старэйшы робіцца чалавек, тым больш у яго грахоў.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 79]*

***

Мы, грэшныя, спяшаемся заўжды
За поспехам і славай без аглядкі,
Забыўшыся, што прамінуць гады
І ўсё узважаць нашыя нашчадкі.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 222]*

***

Юнацтву заўсёды адкрыты дарогі.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 49]*

***

Гэта ж столькі трэба адвагі, каб замахнуцца на старое!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 142]*

***

Бедныя, маладыя – мы ўсе ганарлівыя, усё нам здаецца, шчо зможам процістаяць уладзе неба над намі, і аніяк нам не хочацца ўразумець, што не адолеем мы яго ўладу, бо не можам разгадаць тайну, а не разгадаўшы, і адолець нельга.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 57]*

***

Альбо я старэю, альбо народ драбнее.

*Марчук Г. Трагікі і комікі [46, с. 332]*

***

Аднак свядома не імкніся да адзіноты, пад старасць яна цябе і сама знойдзе.

*Марчук Г. Адзінота [46, с. 352]*

***

Старасць настае тады, калі ты ўсё больш і больш знаходзіш знаёмых прозвішчаў на надмагільных помніках.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 360]*

Репозиторий БрГУ

***

Старасць не радасць, аднак усім хочацца да яе дажыць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

На старасці год чалавек не гатовы спажываць здабыткі юначай мары, што нечакана здзейснілася.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 367]*

***

Старыя губляюць кантроль над часам – гэта натуральна. Маладыя губляюць кантроль над часам – нічога не дамогуцца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

У старасці тры клопаты: паспаць, пад’есці і адпачыць ад першых двух.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Калі тваё пакуты ператвараюцца ў пакуты іншых – час паміраць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 378]*

***

Маладосць аблятае, як лісты з дрэва.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 522]*

***

Наіўнасць старых – здзіўляцца таму, што звычайна было і звычайна прайшло ў свой час.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 114]*

***

Покуль малады – усім прыгодны. А стары – то і сабе збрыдзяеш.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 14]*

***

На старасці і адзіноце чалавек гаворыць да ўсяго, каб ратавацца ад смутку і чуць, што некаму ты яшчэ трэба.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 58]*

***

Усё адыходзіць – як старыя дрэвы, так і старыя людзі.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 238]*

Репозиторий БрГУ

# ЗДАРОЎЕ І ХВАРОБА



Репозиторий БрГУ

***

...як цягаецца чалавек, дык нічога да яго не прыстае, а як занядужыў крыху, дык тады ўсякае балота наровіць упасці.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 52]*

***

За ўсё на гэтым свеце разлічвацца трэба: і за красу, і за пачварнасць, за хваробу і за здароўе.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 63]*

***

Дайце хвораму чалавеку здаровае сэрца, і ён, як Лазар, ачуняе.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 35]*

***

…хвор чалавек, калі ў яго душа ные…

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 35]*

***

Інвалід, як і асілак – абодва моцныя, бо маюць мужнасць (з розных бакоў), каб жыць: з нястачай сілы і з лішкам сілы, з пераадоленнем і з самастрыманнем, з непаўнавартасцю і з майстэрствам. А паміж – банальны “нармалізм”…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

На хворае вока і парушынка ляціць.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Ёсць такія хваробы, ад якіх вылечвае час, а не доктар…

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 224]*

***

Доктар доктару вока не выклюе.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Здаровы да непрыстойнасці.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

Репозиторий БрГУ

***

Золатам не купіш і адно здаровае вока.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 235]*

***

…хвораму дапамагае толькі тое, у што ён верыць, няхай гэта будзе чыстая вада.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 220]*

***

Смех – адзнака здароўя.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 24]*

***

Арганізм чалавека здатны на такое, што можа падацца магіяй, а гэта проста звычайныя, але забытыя веды.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 37]*

***

…хвароба ўваходзіць грамамі, а выганяць яе трэба кілаграмамі.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 200]*

***

Хворы зуб трэба вырываць з крывёю.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 571]*

***

Мaлады ці стары, а скажы, што ён здаровы, – чалавек заўсёды радуецца.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 104]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# СЯБРОЎСТВА



Репозиторий БрГУ

***

Добра гэта – мець сябра, большага за цябе.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 127]*

***

Такая простая алгебра:

Сябры нашых сяброў – нашы сябры. А ворагі нашых сяброў? У кожным выпадку – не сябры. І так балюча бывае, калі сябры пра гэта не памятаюць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 395]*

***

Чаму ж яно жыве ў нас – жаданне пагаварыць з тымі, каго ўжо няма і не будзе, расказаць ім, як мы любілі іх, як гаварылі пра іх пасля з роднымі і сябрамі, як нас усіх яшчэ больш зблізіла гэтая страта?..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 396]*

***

Калі разважыць, дык усякі крытычны або скептычны камень, шпурнуты ў больш-менш заўважную асобу, кідаецца ці з добра прыхаванай зайздрасцю, ці з адчуваннем собскае непаўнавартасці. Ведама, такое яшчэ робіць сябра, каб засцерагчы ад мажлівых заганаў і абмылаў (а чым мэтлівейшы чалавек, тым болей хібаў). Але на тое ён і сябра, каб шчыраваць – хай жорстка, хай бязлітасна, абы не прылюдна. Як лекар. Інакш і гэта – той самы камень.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

***

Трываюць з даўняе пары
любоў, каханьне і сябры.

*Касцюкевіч М. Яшчэ жывая Песьня… [34, с. 83]*

***

Сапраўдны друг прыходзіць і тады,
Калі ад грому трэскаецца неба,
Калі няма каму падаць вады
Ці падзяліцца чэрствай лустай хлеба.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 162]*

Репозиторий БрГУ

***

Сапраўдны друг, гадамі гартаваны,
Гатовы засланіць і памагчы,
Прыходзіць у бядзе неспадзявана,
Як хлеб, як соль, як вогнішча ўначы.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 162]*

***

Шчырыя сябры аднолькавыя ў радасці і ў горы.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 143]*

***

Чым разумнейшы чалавек, тым больш у яго сяброў. У добрага ж чалавека – увесь свет сябры.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Альфа і амега сяброўства – спагадлівасць і надзейнасць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Не шукайце сабе новых сяброў, лепшых за школьных, іх усё адно не будзе.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 399]*

***

Раны гояцца часам, а дружбаю – гора.

*Куляшоў А. Грозная пушча [39, с. 186]*

***

Бог для кожнага чалавека стварае не толькі сяброў, але і ворагаў.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 238]*

***

Родзічаў нам пасылае неба, сяброў жа мы выбіраем самі.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 429]*

***

…калі не хочаш мець ворагаў, то ніколі не заводзь блізкіх сяброў.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 190]*

Репозиторий БрГУ

*******

Найстрашней у жыцці страціць верных сяброў.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 14]*

*******

І не трэба,
Прыбраўшыся моднай адзежынай,
Глядзець на сяброў па вялікай сяўбе
Толькі з плёвага пункту гледжання.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 55]*

*******

Замены ж сябрам не бывае –
Навек нам даюцца сябры.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 243]*

Репозиторий БрГУ

# П'ЯНСТВА
# І ЦВЯРОЗАСЦЬ



Репозиторий БрГУ

***

…цвярозаму чалавеку цяжка зразумець дзеянні сваіх уладароў.

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [44, с. 33]*

***

Без добрай чаркі словы храснуць у горле, думкі блытаюцца ў цвярозай галаве, сэрца не адчувае прыгажосці і велічнасці праўдзівага слова.

*Мажылоўскі У. Праклён мітрапаліта Феафіла [45, с. 31]*

***

Калі гэта было, каб п'яніца адрокся ад гарэлкі?

*Ажэшка Э. Хам [2, с. 121]*

***

Калі ёсць любасць, тады можна і не піць. Ды лепш піць і сканаць з любасцю, захаванай-такі, уратаванай у душы, чым жыць цвярозым без любасці, з дарэшты сапсаванай душою…

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 85]*

***

П'янства – гэта спорт альбо цяжкая мужчынская работа. Адпаведна, спорт – гэта п'янства альбо цяжкая праца для запраўдных мужчын. І, нарэшце, запраўдная мужчынская праца – гэта ці спорт, ці п'янства…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 357]*

***

Усё паўтарыцца, браціе, акрамя добрай кампаніі!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 367]*

***

Выпіўшы чарку, прыемна і ў люстэрка на сябе паглядзець.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 371]*

***

Як п'ян, то капітан, а як праспіцца, то і свінні баіцца.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 24]*

***

Няма ціхага алкаголіка. У п'яніцы заўсёды буйны нораў: альбо нораў гэты выяўляецца перад тым, як выпіць, альбо пасля выпіўкі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

Репозиторий БрГУ

***

Меншасць замольвае грахі, а большасць залівае.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

…чалавек не п’е ў трох выпадках: па-першае, калі хворы, па-другое, калі няма за што, па-трэцяе, калі ўжо п’яны.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 450]*

***

…піць, як і красці, трэба асцярожна.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 250]*

***

Забараняць гарэлку – гэта ўсё роўна, што хаваць запалкі…

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 262]*

***

…хто ўмее піць, той умее і жыць.

*Лeвановіч Л. Сіняе лета [42, с. 263]*

***

…недарэмна кажуць, што хмель вызваляе нас ад пачуцця часу.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 31]*

***

…піць віно – падарожнічаць у глыбіню ўласнай душы.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 31]*

***

Піць можна за ўсё, ці амаль за ўсё, абы хапала добрага віна.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 31]*

Репозиторий БрГУ

Репозиторий БрГУ

# ГРОШЫ І БАГАЦЦЕ



Репозиторий БрГУ

***

О, ключ да тайны чалавека – грошы.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 80]*

***

Няма лёгкіх грошай, лёгка трацiць.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 171]*

***

Збіраць грошы доўга, а рассыпаць – умомант.

*Марчук Г. Шаміль Садрыеў [46, с. 345]*

***

Нічога так не ўзнімае дух, як нечакана знойдзены на вуліцы рубель.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

Заганна нажытае багацце заганна і выкарыстоўваецца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Улада грошай пачынаецца з фанабэрыі і канчаецца забойствам.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

Гэта не бензін падняўся ў цане, гэта мы ўпалі ў жабрацтва.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Заможныя дываноў не выбіваюць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Грошы патрэбныя ўсім: жабракам і мільянерам, гандлярам і паэтам, невылечным алкаголікам і вытанчаным дамам (апошнім, напэўна, болей за астатніх).

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 479]*

***

Каго прадаюць за талер, а каго й за шэлег, усім ёсць цана ў гэтым не лепшым са светаў…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 28]*

Репозиторий БрГУ

# ЧАЛАВЕЧЫЯ ЯКАСЦІ



***

Імя – самы старажытны “пашпарт” чалавека.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 21]*

***

Прозвішча – гэта падручнік, па якім можна вывучаць чалавека...

*Ліпскі У. Мы [43, с. 22]*

***

Жыццё часам вымушае чалавека надзяваць маску. Іншы так да яе прывыкае, звыкаецца з ёй, што сам сябе не пазнае.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 41]*

***

Трэба заставацца чалавекам на зямлі, хто б ты ні быў па пашпарту!

*Ліпскі У. Мы [43, с. 88]*

***

Якая яда, такая і хада.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 137]*

***

Нехта некуды нас заўсёды вядзе, толькі паверым яму – аказваецца, не туды ідзём.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 246]*

***

Герб – як эпіграф да роду, біяграфіі.

*Ліпскі У. Мы [43, с. 247]*

***

Бываюць моманты, якіх сабе ніколі не даруеш.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 281]*

***

...як спіць – не грашыць
Нават князь, нават цар.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 36]*

***

Каб пахваліць гаспадара, дык яшчэ не значыць, што трэба зганьбіць іншых.

*Бядуля З. Выбраныя творы [10, с. 142]*

Репозиторий БрГУ

***

Толькі калі стане з раніцы не шанцаваць чалавеку, дык не пашанцуе і пад вечар.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 35]*

***

Ні госць ні гаспадар.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 81]*

***

...хто, разам у адной хаце жывучы, не сварыцца пры нашай бытнасці?

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 132]*

***

...гляне, як падатак за пабочны заработак аддаючы.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 144]*

***

...у гультая заўсёды гэтак: "Ат! я потым", а той "потым" як яўрэйскае "пачакай".

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 144]*

***

Які чорт хто сам, дык за такіх і бярэцца.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 179]*

***

Хоць ты яму з гарматы над вухам бі – кажа: пстрычкамі мухі ганяеш.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 205]*

***

Яму, дзе ні ступіў, трэба ўсё, каб нейкае апраўданне было.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 215]*

***

Самае першае – як зваўся чалавек.

*Калюга Л. Ні госць ні гаспадар [31, с. 218]*

***

Не ў тыя рукі трапіць, дык у глум і пойдзе.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 43]*

***

Якога ліха, браце мой, тоўпіцца там, дзе ўжо і ўздоўж, і ўпоперак, і наўскасяк.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 43]*

Репозиторий БрГУ

***

Перанясенне машчэй з бардака ў паліцыю!

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 50]*

***

Ніхто не чуў, няхай жа ніхто і не бачыць.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 53]*

***

Не любіш дроў калоць – і не наколеш.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 99]*

***

Бачыць самога сябе з вялікай адлегласці бывае вельмі прыемна. Бо бачыш не проста самога сябе, а сябе найлепшага, без памылак-грахоў і балючых дакораў сумлення. Бачыць сябе *таго* – дапытлівага, чыстага, вясёлага – выразна бачыць, дзякуючы дараванай узростам ды вопытам дальназоркасці, мудра асцерагаючыся залішняга самалюбавання, прэсна расчуленага на старэчы лад, – тут адчуванне незвычайнае, крыху падобнае да таго хвалявання, з якім разглядаеш ніколі дагэтуль не бачаны твой вельмі даўні фотаздымак, які ў кагосьці нейкім цудам захаваўся.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 110]*

***

Няма відовішча больш агіднага, чым тое, калі чалавек б'е чалавека.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 172]*

***

Што ж, людзі пазнаваліся на паваротах.
Як і цяпер яшчэ ўсё пазнаюцца.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 182]*

***

...як гэта жудасна – замучыць, забіць *невінаватага*.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 221]*

***

Думаючы пра мільёны, адзін бачыцца вельмі маленькім, у вялікай краіне, тым больш ва ўсім вялізным свеце гэта так мала – адзін.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 221]*

Репозиторий БрГУ

***

“Віна” з пакутнікаў пераходзіць на *віну* – падкрэслена, без двукосся – на іхніх “суддзяў”, на той час, на тую палітыку, аслепленасць, апантанасць, чуму, халеру... штосьці яшчэ горшае!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 221]*

***

Свет не без добрых людзей, і шкада, што падзякаваць ім ужо нельга.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 222]*

***

Менш паспіш – болей зробіш.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 273]*

***

Можна, аказваецца, і забіваючы – шкадаваць?

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 332]*

***

“Я ведаю толькі тое, што я нічога не ведаю”. А пасля таго, як гэта было падумана і сказана, чалавецтва назапасіла такую процьму культуры, што адчуваеш сябе зусім бездапаможным, каб хоць часткова, сяк-так у ёй разабрацца.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 379]*

***

Бог мой, колькі ж яшчэ трэба ўбачыць, пачуць, каб думаць або гаварыць, што ты ведаеш жыццё хоць бы ў пэўнай меры!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 380]*

***

Ніколі не вядома, дзе што згубіш, дзе што знойдзеш.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 383]*

***

Калі ты сам сябе – хоць і заслужана, і шчыра – у душы або ўголас называеш дурнем або гадам – гэта яшчэ не канчатковы прысуд.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 388]*

***

*Усё ў табе*, і гэтага ніхто не забярэ, калі яно будзе ў сіле.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 388]*

Репозиторий БрГУ

***

Ох, недарма чалавек даўно ўжо назваў сябе толькі госцем на гэтай зямлі, і не соладка было яму прыйсці да гэтай думкі!..

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 389]*

***

Калі цябе хваляць, гэта, вядома ж, прыемна, аднак яшчэ больш прыемна, больш таго – вельмі карысна, калі цябе разумеюць, – такое не прыядаецца.

*Брыль Я. Запаветнае [8, с. 423]*

***

Няўжо спакон і сапраўды навечна
раскрыжаваны лёсам чалавек!?

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 17]*

***

Каб вы ніколі і нідзе
пра чалавечнасць не забылі:
калі хто малпа між людзей –
не дапаможа нават *пілінг*.

*Аляхновіч М. Святло дарогі [3, с. 40]*

***

І круць-верць, і верць-круць – усяк нядобра…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 24]*

***

Ці магчыма знішчыць, забіць сябе падобнага, не забіўшы пры гэтым сябе?

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 114–115]*

***

Ёсць жа, ёсць такая нябачная рыса, ступіўшы за якую ты ўжо не чалавек, не звер нават ужо, а нішто.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 115]*

***

Няма і не можа быць указальнікаў на шляху здрады.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 165]*

***

Баяцца трэба таго, таго трэба сцерагчыся, аб чым не згадваеш, чаго не ведаеш. Неспазнанае страшна, неспазнанае палохае.

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 176]*

Репозиторий БрГУ

***

Але хто загадзя можа сказаць, якія рэчы патрэбныя, якія непатрэбныя, якія з іх больш захоўваюцца, якія з іх больш жывуць…

*Казько В. Суд у Слабадзе [30, с. 181]*

***

Шапкай, папкай і соллю людзі людзей няволяць.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 33]*

***

…да ўсяго можна прывыкнуць.

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 50]*

***

Лепш з ваўкамі ў стадзе, як з людзьмі ў грамадзе, бо людзі чым болей маюць, тым болей жадаюць: другі-то і з бацькі ў дамоўцы звалок бы кашулю!

*Ластоўскі В. Бяздоннае багацце [41, с. 94]*

***

Людзей не пераменіш, хто з лысінкаю нарадзіўся, з ёю і памрэ.

*Левановіч Л. Сіняе лета [42, с. 227]*

***

…нішто так не стамляе людзей, як доўгія святы.

*Сачанка Б. Апошнія і першыя [53, с. 383]*

***

Трацячы сябе, сеем адзіноту…

*Касцюкевіч М. Lex talionis [33, с. 26]*

***

Ах, як мы поспеху не любім,
калі хто іншы ўперад лезе.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 72]*

***

Самае небяспечнае – адкрытае стаўленне да ўсіх рэчаў. Яно вымагае найбольшых маральных высілкаў і найрызыкоўнейшае для стабільнасці.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

***

Мазахізм – гэта шуканне фізічнага болю, каб ухіліцца ад каяння і ад болю маральнага.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

Репозиторий БрГУ

***

Толькі ўлада над сабой дае ўладу над іншымі. Абсалютная – абсалютную.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

***

Геніяльнае ў сваёй напоўненасці, змястоўнасці павінна быць максімальна простым звонку, з формы. Складана (і прыгожа) – пра звычайнае, проста (і зноў прыгожа) – пра складанае.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 79]*

***

Без канфлікту няма развіцця. Найвялікшы – тонкі – канфлікт – небыццё самога канфлікту.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 81]*

***

Цябе ламалі па-вялікаму, а нас ламаюць па-сапраўднаму.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 83]*

***

Не трэба рабіць выгляду, што любіш свет, трэба проста любіць яго. Інакш – гэта самападман. Скурны інтэрас. Альбо… вучнёўскі перыяд, простая шчырасць… І тады ўжо – не самападман.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

Неістотна, ці бамжы на сметніку выходзяць на дуэль, ці спартоўцы на рынгу счапіліся ў двубоі. Бойка ёсць бойка. Гэтаксама неістотна, ці ты падслухоўваеш "по делу", ці з пустой цікавосці – ты проста падслухоўваеш.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 86]*

***

Пашыраная звычка: мадэляваць прастору на сябе, а сябе змяшчаць акурат у цэнтр.

*Касцюкевіч М. Геній – Божы хам?.. [32, с. 87]*

***

Як часта не цэнім мы тое, што побач…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 89]*

***

Найлепшы падарунак – выпадковы.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 126]*

Репозиторий БрГУ

***

Нянавісць да дробязяў захоўвае любасць да цэласнага.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 157]*

***

Вылучная чысціня абсалютна празрыстая і заўважаецца толькі на фоне вылучнага бруду.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 157]*

***

Той, хто ссячэ маладое дрэва, не будзе пакутаваць з-за пераспелых пладоў і бессэнсоўнай гнілі. Адзінае, чаго яму не будзе ставаць – ценю ў спякотны дзень.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 158]*

***

Хараство ратуе свет і лучыць сэрцы…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 228]*

***

Калі няма змогі і сэнсу выяўляць сваё “Я”, лепш ад яго ўжо адмовіцца назаўсёды, абсалютна.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 315]*

***

…перш чым заваладаць добрым бокам, трэба мець сілы вытрываць альбо знейтралізаваць дрэнны бок – вынесці столькі славы, колькі й забыцця; столькі грошай, колькі й нястачы і г.д.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 337]*

***

Галоўная бадзёрасць – памкненне заснуць.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 341]*

***

Без інтэрнэту чалавечы свет парваўся б ад перанапругі.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 342]*

***

На прапанову закончыць фразу “Ва ўтульнай хатняй атмасферы…” выдаў: “…культурна бавіў час на порнасайце…”

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 352]*

Репозиторий БрГУ

***

Чалавек – найвышэйшая, сацыяльная жывёліна і падпарадкоўваецца найвышэйшым, сацыялізаваным інстынктам. І між самых інстынктаў ёсць “лесвіца” – ад ніжэйшых целавых да этычных, эстэтычных і духовых.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 354]*

***

Не дасі капеечку – аддасі кавалачак лёсу. Усё, што робім вонкава, некаму – робім сабе. Плюнуў – паслізнешся… І не абавязкова пасля…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 355]*

***

Колішнія металічныя даспехі вырадзіліся: характво – у серабрысты навагодні дожджык, эфектыўнасць – у бронекамізэлькі…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 355]*

***

Курэнне – найнезаўважнейшая і наймацнейшая несвабода, нястача волі як падсведамы супраціў Божай задуме пра сябе – натуральнаму, гарманічнаму выспяванню і ходу жыцця.

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 357]*

***

Гарэзлівасць, дуронства – вадалаз жыцця…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 358]*

***

І часам трэба моцны дух мець, каб не тузацца, маўчаць, не свяціцца, каб захаваць хоць каліва, хоць наменку на запраўднасць…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 360]*

***

Вялікі жывот, як калупанне ў носе, – такая самая даравальная чалавечая слабасць…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 365]*

***

Чым прымітыўней, спрошчаней сведамасць, тым устойлівей яна ў шчыльна-фізічным жыцці. Пакрыўдзіў – забіў…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 368]*

***

“Ніколі не быць вінаватым” можна ў двух выпадках: ці ён умее бездакорна-віртуозна апраўдвацца (майстар выкручвацца), ці сапраўды не вінаваты, таму што святы…

*Касцюкевіч М. Колеры [33, с. 374]*

Репозиторий БрГУ

***

Усе мы бываем вінаватыя. І заўсёды ёсць каму судзіць нас.

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 56]*

***

Людзі збоку заўсёды ўсё бачаць і ведаюць пра нас лепш, чым мы самі.

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [11, с. 59]*

***

А ці ж не можна было б жыць людзям так, каб не прачынацца ўначы ад цяжкіх жахлівых сноў?

*Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі [13, с. 233]*

***

…як дорага мець поруч чалавека тады, калі кожная часцінка твае душы баліць і крываточыць.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [11, с. 50]*

***

Яны ўсё на свеце і пра ўсіх ведаюць, гэтыя дасведчаныя людзі!

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 337]*

***

Паспрабуй, перамажы пароду!

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 340]*

***

Аднак чаго не напісана чалавеку на раду, таго не напісана.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 349]*

***

Ідэалы не паўтараюцца.

*Васілевіч А. Выбраныя творы [12, с. 447]*

***

Пад маскай ліслівасці звычайна хаваецца вераломнасць.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 52]*

***

Усё ж разбэшчаны чалавек зайздросціць цнатліваму…

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 73]*

***

…міласэрнасць і бяздушша несумяшчальныя.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 99]*

Репозиторий БрГУ

***

Хіба дазволіць самалюбца камусьці ўсумніцца ў сваёй ахайнасці, у сваёй непараўнальнасці!

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 107]*

***

Авантурыст – гэта беспрынцыповы чалавек, які, дабіўшыся жаданага, адразу робіцца халодным да прадмета сваёй страсці.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 148]*

***

Часам нават чыстыя намеры здольныя загубіць.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 241]*

***

Жорсткасць хутчэй прыніжае, чым схіляе да шчырасці.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 260]*

***

…раззлуеш ціхоню – разбудзіш звера.

*Татарынаў Ю. Княгіня Мянжынская [56, с. 265]*

***

Сам ад сябе не пабяжыш упрочкі,
Сябе самога цяжка перагнаць,
А погляды, як модныя сарочкі,
Лягчэй за ўсё хоць кожны дзень мяняць.

*Грахоўскі С. Паэма дарог [22, с. 78]*

***

Нялёгка быць даверлівым і шчырым,
Нялёгка крыўды даўнія забыць;
Яны звісаюць, як цяжкія гіры,
І замінаюць верыць і любіць.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 8]*

***

Патрабуе чыстае сумленне быць неабходным, хоць малым звяном паміж сваім і новым пакаленнем.

*Грахоўскі С. Лірыка [21, с. 163]*

***

…Найцяжэй судзіць сябе самога,
Чым у другога плямінку знайсці.

*Грахоўскі С. Выбраныя творы [18, с. 304]*

Репозиторий БрГУ

***

Чалавек заўсёды павінен быць хоць невялічкай загадкай і тайнай.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 14]*

***

Усё на свеце прасцей, як мы думаем і ўяўляем.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 19]*

***

Чалавек чалавеку павінен прыносіць радасць, узаемна быць падтрымкаю і апораю, а, на жаль, мы яшчэ часам атручваем жыццё адзін аднаму.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 87]*

***

У кожнага чалавека ёсць патрэба пра некага дбаць.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 118]*

***

Самы добры чалавек, калі ён у гневе, – бывае страшны.

*Грахоўскі С. Дзве аповесці [19, с. 246]*

***

Хай другу друг заўсёды будзе братам
І другам – чалавеку чалавек.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 73]*

***

Чалавеку патрэбна не слава,
А людская ўвага і ласка,
І сардэчнае шчырае слова,
І вясёлая добрая казка.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 137]*

***

Цяжэй за ўсё сябе перамагчы,
Стаць над сабой бязлітасным суддзёю –
Судзіць удзень, уранні і ўначы
Свае імкненні і свае настроі.

*Грахоўскі С. Тры вымярэнні [23, с. 235]*

***

Другіх не папракай і не вучы,
А паспрабуй сябе перамагчы.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 46]*

Репозиторий БрГУ

***

Заўжды хто-небудзь некага чакае,
Заўжды хто-небудзь некага шукае –
Патрэбен чалавеку чалавек,
Што прыйдзе ў бядзе на дапамогу.

*Грахоўскі С. Чаканне [24, с. 58]*

***

Не купіць спакой за грошы.

*Баршчэўскі Я. Выбраныя творы [5, с. 340]*

***

Каменны той чалавек, якога не навучылі любові да бліжняга!

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 93]*

***

Прыкра не бачыць свет, але прыкра таксама мець добрыя вочы і бачыць далёка.

*Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня,*
*або Беларусь у фантастычных апавяданнях [6, с. 196]*

***

Чалавек ніколі не ведае, дзе згубіць, а дзе знойдзе. І няма такой злыбеды на свеце, на якую б не ўсміхнуўся неспадзеўны, нечаканы ратунак.

*Гарэцкі М. Прысады жыцця [14, с. 18–19]*

***

…пра што б чалавек ні гаварыў, тое, што ён гаворыць, перш за ўсё характарызуе яго самога.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 20]*

***

Усюды падсцерагае чалавека небяспека, асабліва таго, хто слабейшы.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 176]*

***

Уныласць – цяжкі грэх.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 182]*

***

Дык што такое чалавек – сродак ці мэта?

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 196]*

Репозиторий БрГУ

***

Вядома, нельга прымусіць чалавека, каб ён кагосьці любіў, але ж і паскудзіць другому чалавеку нельга.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 236]*

***

Марудзіць нельга, бо адсталых б'юць!

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 242]*

***

Зайздросніка, кажуць, можна пазнаць па твары.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 354]*

***

Здрада не ўпрыгожвае.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 363]*

***

Уваляўся ў славу, як свіння ў гразь.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 379]*

***

Зрэшты, чын – рэч умоўная. Галоўнае – талент.

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 414]*

***

Што павінна адбыцца, тое адбудзецца…

*Гніламёдаў У. Вяртанне [17, с. 415]*

***

Як цяжка змагацца з сабою.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 71]*

***

…свой адбітак перыферыя накладвае на чалавека непрыкметна.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 82]*

***

Вінаваціць трэба найперш сябе, тады і высветліцца, хто з астатніх вінаваты.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 120]*

Репозиторий БрГУ

***

Калі да ўсяго сур’ёзна ставіцца, дык здурнееш ад мноства незразумелых з’яў.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 123]*

***

Табе пакарміць чалавека – як з царквы ўпасці.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 179]*

***

Не ўсё загубленае безнадзейнае, але ўсё безнадзейнае загублена.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 179]*

***

Не чалавек для суботы, а субота для чалавека.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 193]*

***

Зрэдку чалавек сам сябе ганіць.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 208]*

***

Да звыклага і павагі менш.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 213]*

***

Не трэба шукаць апраўдання сваёй безадказнасці.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 214]*

***

Хабар – як атрута.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 238]*

***

За ўсімі высокімі словамі стаіць хваравітае славалюбства.

*Марчук Г. Кветкі правінцыі [46, с. 244]*

***

Пахмурнасць – уласцівасць характару.

*Марчук Г. Адзінота [46, с. 352]*

***

Наколькі чалавек моцны, настолькі ён і слабы.

*Марчук Г. У пошуках сэнсу [46, с. 355]*

Репозиторий БрГУ

***

Без дабрыні мы не людзі, а голыя дрэвы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 359]*

***

Аб’ядаць спонсара недальнабачна.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 361]*

***

Удалы чалавек і чорта запражэ ў воз.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

У добрай гаспадыні і на лёдзе жыта расце.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Нікому не хочацца быць ні ахвярай, ні катам. Ды ўсё ніяк не атрымоўваецца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 362]*

***

Зайздрасць усёабдымная. Кату і таму зайздросцяць!

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 363]*

***

Настойлівасць – твар упартасці, настырнасць – яе рукі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

У таго, хто есць лежачы, продкі былі касманаўтамі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 364]*

***

У выхвалякі ўсе сны каляровыя.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 365]*

***

Калі ты выпіў з крывадушнікамі на брудэршафт, ты таксама крывадушнік.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

Репозиторий БрГУ

***

У большасці выпадкаў нам заўсёды спакайней і весялей, калі гавораць пра недахопы і няўдачы нашых знаёмых, а не наадварот.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Калі сур’ёзна да ўсяго ставіцца, звар’яцееш ад мноства невытлумачальных з’яў.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 366]*

***

Мозг – унікальны млын. Ён усё змеле.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 368]*

***

Татальная стомленасць – гэта калі на самога сябе цяжка глядзець.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Усё, што бачыць вока, – матэрыяльнае. Можна крануць рукой. Але вось феномен. Ясна і выразна бачу, а памацаць рукамі не магу. Гэта цень.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

Кантактуеш з людзьмі. Адразу сотні праблем, якія патрабуюць ад цябе вырашэння. Стамляе ўсё гэта да злосці. Спакой прыйдзе тады, калі зразумееш, што і ты сам прыносіш сотні праблем іншым.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 369]*

***

З узростам больш недалюбліваюць людзей, чым іх любяць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Цэмент і моцны, і выклікае давер, але без слабога і мяккага пяску не абыходзіцца.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

***

Калі табе давяраюць, пазычаць (дадуць пазыку).

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 370]*

Репозиторий БрГУ

***

Ад усяго людскага ў некаторых асоб толькі тое і засталося, што зрэнкі рэагуюць на святло.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 371]*

***

Дурань дурнем, але нават ён не кажа пра свае заганы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Нянавісць асляпляе відушчага і дае зрок невідушчаму. З якой студні чэрпаюць сілы нянавісць і зайздрасць?

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 372]*

***

Хто ганарлівы, той і зайздросны.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Слава аднаго замінае славе другога, загана ж аднаго не замінае загане другога.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Сумленны чалавек часцяком адчувае грэх з-за таго, што сусед побач жыве ў галечы.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 373]*

***

Мы падпарадкоўваемся сусветным законам… і ўсе супакойваюцца, хоць ніхто не ведае ніводнага сусветнага закона.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Авангардызм – гэта рэалізм з сардэчнай недастатковасцю.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 374]*

***

Калі б чалавек не забіваў, гэта была б някепская жывёла на зямлі.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 375]*

***

Ніколі не крытыкуй чалавека, а толькі абвяргай яго погляды.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

Репозиторий БрГУ

***

Кожнага чалавека на зямлі трэба хваліць, але пры гэтым не перабольшваць.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 376]*

***

“Я тое, што я думаю”. “Я тое, што я маю”. Нехта трэці ганебна грэе рукі ад сутыкнення двух першых.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Крытыкаваць нявартага павагі – свядома нажыць сабе ворага.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 377]*

***

Калі двое аб’ядноўваюцца, яны звычайна аб’ядноўваюцца супраць кагосьці іншага.

*Марчук Г. Голас і слова [46, с. 378]*

***

Як гэта прыемна – быць сярод таго, што ўтварыла характар, паўплывала на пачуцці і замацавала адметнае.

*Марчук Г. Давыд-гарадоцкія каноны [46, с. 410]*

***

Не трэба агулам абражаць людзей, якія змагаюцца за добрую ідэю.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 20]*

***

…кожная добрая ідэя, нібы карабель – ракавінамі, абрастае дурнямі, якія ўсё псуюць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 21]*

***

…мы, нават пасталеўшы, ахвотней верым у прыемнае, чым ва ўласныя сумнівы.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 31]*

***

Што пачалося крывёю – крывёю скончыцца.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 40]*

Репозиторий БрГУ

***

Страшаць баязліўцы, смешаць няцвёрдыя ў сабе…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 48]*

***

Калі не можаш сказаць – танчы…

Калі немагчыма крычаць – танчы…

Калі побач смерць – танчы… Як танчаць аблокі і агонь, як танчыць сама зямля ў абдоймах ветру…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 69–70]*

***

Кажуць, характар чалавека выяўляецца толькі ў экстрэмальных сітуацыях.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 89]*

***

…ёсць сілы, якіх мы не ўсведамляем, але авалодаўшы якімі можам рабіць цуды.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 106]*

***

Калі не выбрацца з балота, застаецца квакаць.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 123]*

***

Як лёгка кіраваць тымі, хто аднойчы смяротна спалохаўся.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 132]*

***

Чаму людзі такія лютыя адзін да аднаго…

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 142]*

***

Кожны з нас у гэтым свеце мае шмат лічынаў.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 149]*

***

Не заўсёды першае парыванне – лепшае!

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 171]*

Репозиторий БрГУ

***

Таму, хто абрынуты ў цень, прыемна часам стацца каменьчыкам, ад якога ідуць вялікія кругі па вадзе.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 171]*

***

Паміж горшым і яшчэ горшым заўсёды з’яўляецца маленечкі светлы пасак выбару, які дазваляе прымірыцца з сабой і светам.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 213]*

***

…звычкі мяняюцца не радзей чым грошы на келіх піва.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 263]*

***

Ніхто не ведае, якой моцай валодаюць рахманыя людзі.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 287]*

***

Хіба хопіць у кагосьці сілы захаваць свой чароўны востраў, калі любячыя бліжнія даходліва патлумачылі, што ён – толькі купінка пасярод свойскага балота?

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 298]*

***

Забывацца на пакуты тых, хто ахвяраваў сабою дзеля справядлівасці, – ганебна.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 375]*

***

Мусіць, рамантычны светапогляд спараджаецца менавіта безнадзейнасцю?

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 379]*

***

Часам выпіты кубак кавы можа стацца падзеяй большай, чым землятрус.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 392]*

***

Нікому не будзе дадзены крыж цяжэйшы за той, які ён можа панесці.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 445]*

Репозиторий БрГУ

***

Дарога мае тую неадольную прывабнасць, што здаецца вырашэннем любых праблем.

*Рублеўская Л. Ночы на Плябанскіх млынах [51, с. 513]*

***

Быць самотным – значыць трошкі памерці.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 5]*

***

Нянавісць – дзіця болю…

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 6]*

***

Калі ўжо варышся ў кіпні – якая розніца, у якім гаршку?

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 22]*

***

У дарозе ўсе робяцца філосафамі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 34]*

***

Самыя добрыя намеры выяўляюцца жахам або… анекдотам.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 40]*

***

Усё на свеце – гульня.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 40]*

***

Ад нянавісці няма лекаў.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 42]*

***

Рабы шчыра плачуць і па смерці тырана – чалавек, ратуючы сябе ад невыноснага штодзённага страху, пачынае шчыра любіць ката і бачыць справядлівасць у ягоных здзеках.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 52]*

***

Лічыць сябе няўдачнікам – дыягназ.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 66]*

Репозиторий БрГУ

***

Каб чалавек беспакарана быў самотны, ён мусіць мець трывалую сувязь з нечым, вышэйшым ад людскога бытавання.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 91]*

***

Рэчы памятаюць сваіх былых гаспадароў і захоўваюць іх дотыкі.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 111]*

***

…несправядліва дакараць чалавека за тое, што яму не ўдалося загінуць.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 131]*

***

Усе высакародныя справы канчаюцца на вісельні або ў вар'ятні.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 149]*

***

На чалавека палююць часцей, чым на звера. Іншыя гома сапіенсы, вядома.

*Рублеўская Л. Пярсцёнак апошняга імператара [52, с. 193]*

***

…прыгода, пазбаўленая небяспекі, – як зацірка без солі…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 37]*

***

…усведамленне "мяне чакаюць" павінна быць у кожнага, нават самага жорсткага чалавека, і на агеньчык гэтага пачуцця можна выйсці з цёмнага лабірынта.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 57–58]*

***

…калі няможна лётаць, то паўзці – усё роўна куды.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 67]*

***

…вялікая няўдзячнасць – скардзіцца, калі ад моцнай выратавальнай рукі засталася пара сінякоў.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 133]*

Репозиторий БрГУ

***

Сапраўдная небяспека ніколі не выглядае гэткай страшнай, як уяўная.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 144]*

***

Нават лініі на руцэ могуць мяняцца, калі іх уладальнік не губляе галавы ў самай адчайнай сітуацыі.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 150]*

***

Дзе б чалавек ні пасяліўся – найперш ён думае пра абарону і ўцёкі.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 185]*

***

Высакародны чалавек – гэта той, у каго ёсць прынцыпы, якія ён не пераступіць нават дзеля ўласнага выратавання.

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 210]*

***

…наступствы сваіх учынкаў разблытваць даводзіцца доўга…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 219]*

***

…адцягваць імгненне, калі ўпадзе на цябе падвешаны на валасіне меч, – працягваць свае пакуты…

*Рублеўская Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега [49, с. 223]*

***

Усё новае напачатку здаецца нязвыклым, а таму няправільным.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 19]*

***

Адвага ці мёд п’е, ці кайданы трэ.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 86]*

***

На жаль, ніколі не атрымліваецца так, каб выратаваць усіх вартых, човен Фартуны малы і хісткі.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 119]*

***

Здаваць таварыша – нават такога, які сам цябе лёгка здасць, – ганьба!

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 126–127]*

Репозиторий БрГУ

***

…калі ідзеш за тымі, з кім не ў згодзе, тым сябе прыніжаеш…

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 131]*

***

…ніколі не трэба шкадаваць пра тое, што ўдалося камусь дапамагчы.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 194]*

***

Павінны ж быць такія нечакана спакойныя дні ў самым бурлівым жыцці, у самым пякельным колазвароце, і павінны сустракацца людзі, што як абыдзённікі-ручнікі, вытканыя за адзін дзень удовамі і чыстымі дзяўчатамі вёскі, забіраюць у сябе ўсё нядобрае, захіляюць ад зла…

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 204]*

***

Кожны павінен выканаць свой доўг і захаваць гонар.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 218]*

***

…людзі, якія маюць кароны, кіруюцца сваймі законамі, далёкімі ад звычайных чалавечых, і маюць між сабой асаблівыя рахункі, незразумелыя простым смяротным…

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 253]*

***

Ніякі прарыў да лепшага не адбываецца без ахвяраў!

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 274]*

***

Калі яшчэ адзін чалавек у гэтым свеце выходзіць са стану рабства, свет робіцца на прыступку вышэй да неба.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 290]*

***

…лягчэй абвінаваціць ва ўсім ахвяру, чым прызнаць сваю няўдзячнасць да яе.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 305–306]*

***

Кожны павінен рабіць тое, што яму належыць, не чакаючы за гэта ўдзячнасці.

*Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча [50, с. 316]*

Репозиторий БрГУ

***

Я сам сябе гатоў хутчэй павесіць,
Чым існаваць для непатрэбных спраў

*Куляшоў А. Я гіну ад бяздзейнасці не месяц…* [39, с. 125]

***

Халодная ўвага не вартая ўвагі.

*Куляшоў А. Спакойнага шчасця не зычу нікому…* [39, с. 107]

***

Казырнуў не яму, а партфелю.

*Куляшоў А. Грозная пушча* [39, с. 187]

***

Лепш падаць і ўставаць з нялёгкай ношаю,
Чым злёгку папіхаць яе рукой.

*Куляшоў А. Мой новы год* [39, с. 165]

***

Людское сумленне за грошы
Купілі – прыстойны тавар.
Цяпер яно беднасці можа
З пагардаю глянуць у твар,
Зрабіцца паважным, вяльможным,
Пашану і славу набыць…
Адно яно толькі не можа –
Сумленнем някупленым быць.

*Куляшоў А. Людское сумленне за грошы…* [39, с. 125]

***

Толькі ўперад і ўперад,
Ні кроку назад!

*Куляшоў А. Толькі ўперад* [39, с. 129]

***

Стаўшы лапцем, трымайся, як лапаць, лапцей:
Разам з імі на печ, разам з імі ў музей.

*Куляшоў А. Грозная пушча* [39, с. 189]

***

…ніколі не трэба скарацца абставінам. Рабі тое, што лічыш сумленным і справядлівым, і няхай будзе, што будзе. А калі побач аднадумцы, паплечнікі і сябры, то ўрэшце рэшт усё абавязкова будзе добра.

*Колас У. Перамога* [35, с. 2]

Репозиторий БрГУ

***

…як пара года мяняе лічыну зямлі, так і людзі любяць нацягваць на сябе новыя транты. І транты гэтыя бываюць такія пацешныя, што чалавеку часам брыдка робіцца за самога сябе.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 18]*

***

Моды праходзяць, а ўсё застаецца.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 18]*

***

…чалавек без цаны – нічыйны чалавек, ніколі не ведаеш, што ён табе заверне.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 19]*

***

Сам пан, а кроме “быдло” другіх слоў не ведае.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 19]*

***

Прывык ля коней – “но!” ды “но!”. Коні гэта не заўсёды любяць, а людзі і падаўна.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 20]*

***

Камандаваць таксама трэба талент мець. Гэта не тое што на кароў: пугай замахнуў – яны і пайшлі. Людзі. Ён раз пайшоў, а два ў галаве панёс, а ты кумекай, што куды…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 21]*

***

Кажын чалавек хоча нечым праславіцца.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 23]*

***

Што мы пра людзей ведаем? Толькі тое, што ён пакажа…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 30]*

***

Чалавек без дысцыпліны – ніжэйшая інстанцыя, бо ніякіх рэсурсаў не мае, і тут сам Бог не памочнік.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 33]*

Репозиторий БрГУ

***

Чалавеку, які тануў і якога выцягнулі, ёсць шмат пра што расказаць.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 45]*

***

…страх заўсёды бяжыць наперадзе чалавека, толькі не трэба яго далёка адпускаць ад сябе, прападзеш, як муха.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 49]*

***

…страхам хату не накрыеш.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 49]*

***

Ногі занясуць, дзе галаве легчы…

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 93]*

***

Чаму людзі так старанна закопваюць у сабе тое, чаго самі прагнуць?

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 96]*

***

У кожнай болькі свая пара, і трэба, каб усё перабалела.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 101]*

***

Няма паскудней дабіваць, біць трэба адразу і насмерць.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 134]*

***

…няма нічога страшнага на гэтым свеце. Трэба толькі мець цярпенне і ўпартасць, па-дурному не лезці на вастраўё і заўсёды ведаць, чаго хочаш.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 202]*

***

На гордага чалавека шмат хлеба трэба, ды і па хлебе, але кожны хоча, каб пра яго ведалі.

*Кудравец А. Сачыненне на вольную тэму [38, с. 217]*

***

Што ж, людзі пазнаваліся на паваротах.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 7]*

Репозиторий БрГУ

***

Ніколі не вядома, дзе што згубіш, дзе што знойдзеш.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 150]*

***

*Усё ў табе*, і гэтага ніхто не забярэ, калі яно будзе ў сіле.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 159]*

***

Хочаш не хочаш – нікуды не дзенешся.

*Брыль Я. Пішу як жыву [9, с. 165]*

***

Пальцы на руцэ і тыя не роўныя, але які ні адсячы, кожны баліць.

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 16]*

***

Няўжо чалавек заўсёды бяжыць насустрач невядомаму?

*Адамчык В. Год нулявы [1, с. 396]*

***

У кожнага чалавека ёсць уласныя сакрэты, якіх ён ніколі не адкрые іншым людзям.

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 51]*

***

…чаму дарослыя, блізкія людзі так звярэюць, што робяцца непадобнымі на людзей?

*Афяроўскі А. Любачка [4, с. 82]*

***

Нездарма кажуць – турма, як магіла, адчынена для ўсіх.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 39]*

***

Не заглыбляйся дужа ў мроі – можаш не вынырнуць, не выплысці адтуль.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 67]*

***

Бітага, пралітага і пражытага назад не вернеш.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 67]*

Репозиторий БрГУ

***

Лепш узнагароджваць, чым караць.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 96]*

***

Кожны па-свайму прыстасоўваецца да бяды-нядолі.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 108]*

***

Ёсць такія людзі, што нават у самы шчаслівы, у самы радасны дзень са скрухай кажуць: «Ат, як я жыву? Пяклуюся».

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 268]*

***

Ёсць тэмпературы, пры якіх плавіцца ўсё: вернасць, памяць, каханне, сяброўства. Ёсць агні, што спальваюць усё жывое.

*Дайнека Л. Назаві сына Канстанцінам [26, с. 303]*

***

Хто пакаштаваў крывавага мяса, не захоча есці параную рэпу.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 14]*

***

Узнагароды за цярпенне выплачваюцца ў храмах перамогі.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 47]*

***

Натоўп любіць тых, хто перамагае.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 49]*

***

Добрых людзей, хто б яны ні былі, заўсёды няцяжка ўбачыць.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 82]*

***

Усе людзі рабы. Адзін раб уцех плоцкіх, другі – скнарнасці, трэці – славалюбства, усе разам – рабы надзеі і ўсе – рабы страху.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 121]*

***

Непрыгожых лягчэй ненавідзець.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 200]*

Репозиторий БрГУ

***

Бываюць людзі, з якімі цяжка, немагчыма дыхаць адным паветрам.

*Дайнека Л. Меч князя Вячкі [25, с. 238]*

***

…людзі хутка забываюць тых, каму не пашанцавала.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 307]*

***

Хто што хоча бачыць, той тое ўбача.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 312]*

***

Боль трэба лячыць толькі болем.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 317]*

***

Хіба можа халодная кроў нарадзіць гарачую?

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 355]*

***

Улада, узятая сілай, пагрозай, змусам, няпоўная ўлада.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 390]*

***

Удачлівы – гэта такі чалавек, што склаў сабе падмурак з тых камянёў, якімі яго напачатку закідвалі.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 426]*

***

Нават самая мізэрная надзея дае чалавеку сілу.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 429]*

***

…мякчэйшыя людзі на мулкіх палатках спяць або ў чыстым полі, камень пад галаў падклаўшы, начуюць. А той, у каго сэрца з валуна высечана, на пухавіках, на ядвабе свае белыя костачкі песціць.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 483]*

***

Чалавек чалавека павінен і ў тумане шукаць.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 514]*

Репозиторий БрГУ

***

З усіх істот, якія жывуць на зямлі, да катавання дадумаўся толькі чалавек.

*Дайнека Л. След ваўкалака [25, с. 578]*

***

…як ні старайся, як ні вымольвай, а самае патаемнае застанецца недасягальным для аніводнага староннягa вока.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 8]*

***

Шкада, што нам часта даводзіцца забываць, як мяняюцца месцамі верх і ніз.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 9]*

***

Самае дзіўнае ў тым, што чым найскладаней паняцце, тым яно банальней і прасцей.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 9]*

***

Чаго няма, таго не знойдзеш.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 21]*

***

Колькі ж людзей згарэла, звяла, згібела, так і не выпрастаўшыся, не пасталеўшы, не разгарнуўшы плечы на поўную сілу.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 63]*

***

…маральныя законы часта пісаліся амаральнымі людзьмі.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 65]*

***

Слабыя мы ў сваёй моцы. Кволыя ў вялікасці. Мы проста людзі.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 67]*

***

Паміж “хацець” і “зрабіць” – прадонне без мастка і тарзанкі.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 68]*

Репозиторий БрГУ

***

…іншым разам трэба мецць дар маўчання, ён нібы выратавальная кропля даждджу ў паўдзённым жэраве пустыні.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 69]*

***

Адзінота – катэгорыя, якая для талковага чалавека павінна быць пастаяннай.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [30, с. 71]*

***

…вернасць у наш час – паталогія.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 96]*

***

Чалавек размаўляе сам з сабою ад нечаканай адзіноты, роспачнасці і невядомасці…

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 98]*

***

У любых учынках ёсць мяжа, перакрочыўшы якую чалавек беззваротна губляе сябе…

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 101]*

***

Ніводная парфума не згладзіць і не прыхавае пах хлусні.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 144]*

***

Я хачу! Вось вызначальная якасць любога з нас.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 145]*

***

Маўклівасць у наш час можна ўспрымаць як знак якасці чалавека.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 185]*

***

…навучыцца дараваць іншым іх правіны – складаная задача.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 187]*

***

Адзінота і чалавек – неадʼемныя паняцці.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 195]*

Репозиторий БрГУ

***

Вернасць, адданасць, самаахвярнасць, адчуванне родавай прыналежнасці – усё мае свае карані.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 208]*

***

Дысцыпліна – той бізун, які служыць ці не з часоў стварэння свету.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 211]*

***

…дэпрэсія – не ўзроставы паказчык, а ўсяго толькі змэнчанасць чалавека ў мільённым натоўпе сабе падобных.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 219]*

***

Калі ў хаце чысціня, то і душа без бруду.

*Казлоў А. Той, хто абганяе сны [29, с. 285]*

***

Лепей зламацца зусім, чым гнуцца ўсякай сіле.

*Колас Я. Раніца ў нядзельку [37, с. 154]*

***

…няма на свеце такое сілы, над каторай не было б большае сілы.

*Колас Я. Раніца ў нядзельку [37, с. 154]*

***

Дурное дзела пахвала: нішто не псуе так чалавека, не завязвае яму вочы, як гэта «во ён», «во ён».

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 10]*

***

Шкада, канечне, што дваццаты век многія каштоўнасці памяняў, а праўдзівей, памяняў саміх людзей, якія бачаць іншы раз латву ў тым, што раней асуджалі: нічога не рабіць і многа зарабляць.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 31]*

***

…павага ад людзей, “чэсць і хвала” не даюцца, а заслугоўваюцца.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 40]*

Репозиторий БрГУ

***

…асоба – гэта змаганне; і з сабою, і з тым, куды з салодкім рабалепствам заводзяць цябе чалавечыя слабасці.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 75]*

***

Залежнасць, нават дробязная, заўсёды кепская тым, што змушае чалавека прыстасоўвацца і заглушаць у сабе пачуццё годнасці.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 308]*

***

І тыя, што не могуць, перашкаджаюць тым, хто можа, і чалавецтва праз гэты тормаз праходзіць шлях удвая карацейшы.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 308]*

***

На жаль, кароткую асалоду часта даводзіцца аплачваць намнога даўжэйшымі пакутамі.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 318]*

***

Акно – самы просты тэлевізар у свеце.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 319]*

***

Шукаць апраўданне сваім слабасцям – у гэтым сэнс чалавечага існавання.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 333]*

***

Як гэта, мабыць, цяжка ўвесь час выдаваць сябе не за таго, кім ты ёсць!

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 340]*

***

О, божа, чаму мы так турбуемся – што пра нас падумаюць? Няхай думаюць, што хочуць, абы мы заставаліся самімі сабой.

*Рубанаў У. Светлы ручай любві [48, с. 376]*

***

Як жа часам чалавеку трэба
Апынуцца ў казцы ненарокам!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 50]*

Репозиторий БрГУ

***

Арыенціраў не ведае страх
І не разбірае дарогі.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 167]*

***

Нялёгка – мерай чалавечай
Караць віну, хоць і патрэбна.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 183]*

***

Вечна спяшаемся, вечна няма нам калі:
Пешшу даўно ўжо не ходзім па грэшнай зямлі.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 192]*

***

Простыя ісціны часам так цяжка даюцца:
Покуль адолееш – слёз ручаіны праллюцца.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 198]*

***

Табе зрабіўся блізкім цэлы свет!
А ці бліжэйшым стаў табе сусед?

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 198]*

***

Эгаізм – чалавечых душ іржа.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 204]*

***

Чалавек! Ты госць пад небам гэтым!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 262]*

***

Паміж маральнасцю і амаральнасцю
На свеце рэзкае мяжы няма.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 338]*

***

Сумленне – усяму закон!..

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 346]*

Репозиторий БрГУ

***

На светлым лепш відаць чорнае.

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [15, с. 409]*

***

Чым дагарэць у пустацвеце –
Лепш не ўзысці і не цвісці!

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 157]*

***

Якая слава можа ўцешыць,
Калі ты сэрцам – на крыжы?

*Гілевіч Н. Выбраныя творы [16, с. 158]*

***

Але каб быць смелым, то для гэтага трэба быць дужым, а каб быць дужым, то трэба мець цвёрды грунт пад нагамі і ясна пачуваць і ведаць, дзеля чаго ты жывеш на свеце.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 32]*

***

Без змагання і няўдач нічога не даецца на свеце.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 47]*

***

…часамі самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім. Трэба толькі ўмець знайсці месца іх стыку.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 66]*

***

У глыбі, дзесь у нетрах гэтай глыбі, ёсць нікому невідочныя скрыжалі, а на іх запісаны мукі і боль, аб якіх часам ніхто не ведае і не здагадваецца.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 71]*

***

…часамі самыя простыя рэчы пры пэўных абставінах паказваюцца страшэнна заблытанымі, завязанымі ў такі вузел, што і развязаць нельга.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 76]*

***

Усякае стаянне на месцы пераходзіць у звычайны застой.

*Колас Я. Казкі жыцця [36, с. 86]*

Репозиторий БрГУ

# *ДУМКА ДУМКУ ВЫКЛІКАЕ… (з уласнага)*



Рэпазіторый БрДУ

***

Афарызм – слова на ўсе часы.

***

Адзін любіў, другі кахаў, а ад трэцяга сама збегла.

***

Па тым, як мужчына ставіцца да сваёй сям'і, можна меркаваць пра адносіны яго да сваёй Айчыны.

***

Нам усім чагосьці не хапае: камусьці грошай, камусьці голасу каханага.

***

Старасць – гэта калі хочацца больш жыць, чым спаць.

***

Чалавек не можа быць усюды сваім. Часам ён бывае лішнім.

***

Можна доўга глядзець на ваду, на агонь і на тое, як працуе іншы чалавек.

***

Усе гісторыі, што адбываюцца з намі, здаюцца непраўдападобнымі.

***

Для таго каб даведацца, што дома лепш, чым дзе б тое ні было, трэба хаця б ненадоўга з'ехаць адтуль.

***

Калі два чалавекі ведаюць, то гэта яшчэ таямніца, а калі ведаюць тры чалавекі, то гэта ўжо плётка.

***

У кожнага чалавека ў жыцці свая роля, і тое, як ён пражывае жыццё, залежыць ад таго, наколькі добра ён вывучыў тэкст ролі.

***

Твой дом там, дзе твае бацькі.

Репозиторий БрГУ

***

Што такое жыццё? Гэта працяжнік паміж датай смерці і датай нараджэння.

***

Час – рэч адносная: калі яго не заўважаеш, ён ляціць, а калі сочыш за ім, ён цягнецца павольна.

***

Для жанчыны самае цяжкае і няўдзячнае – купляць падарунак чужому мужу.

***

Старасць не ўпрыгожвае чалавека, хоць павінна.

***

«Потым» губіць многіх.

***

У таго, у каго не атрымліваюцца сачыненні, добра атрымліваюцца афарызмы.

***

Тое, што не можа растлумачыць медыцына, тлумачыць Біблія.

***

Рэдка выходзяць замуж па каханні, у асноўным – ад адчаю.

***

На юбілеі толькі юбіляр шчыра радуецца, толькі чаму?

***

Нецікавы той чалавек, пра якога не гавораць – ці дрэнна, ці добра.

***

Калі бачу, што ў майго вучня ёсць чаму павучыцца, – радуюся.

Репозиторий БрГУ

## ПАКАЗЧЫК ІМЁНАЎ

**А**
Адамчык В. 16, 39, 75, 115, 123, 143, 164, 182, 226
Ажэшка Э. 63, 94, 100, 110, 128, 134, 141, 146, 192
Акудовіч В. 42
Аляхновіч М. 59, 120, 126, 147, 180, 202
Афяроўскі А. 75, 123, 164, 165, 169, 193, 226
**Б**
Баршчэўскі Я. 32, 65, 66, 94, 95, 111, 112, 120, 121, 128, 129, 141, 150, 210
Белая А. 42, 58, 154
Брыль Я. 9, 12, 16, 20, 29, 32, 39, 42, 48, 58, 59, 74, 86, 90, 92, 100, 108, 109, 126, 132, 135, 140, 168, 174, 175, 180, 182, 188, 199, 200, 201, 202, 225, 226
Бядуля З. 8, 42, 58, 82, 100, 108, 140, 198
**В**
Васілевіч А. 26, 36, 38, 43, 49, 63, 64, 86, 91, 94, 100, 101, 111, 120, 121, 146, 150, 156, 157, 168, 175, 180, 181, 184, 207
**Г**
Гарэцкі М. 129, 134, 158, 210
Гілевіч Н. 9, 17, 24, 29, 33, 40, 56, 79, 80, 83, 88, 97, 105, 116, 117, 123, 136, 137, 144, 148, 152, 166, 172, 178, 190, 232, 233, 234
Гніламёдаў У. 13, 26, 49, 56, 66, 67, 94, 112, 120, 130, 141, 142, 146, 150, 159, 169, 181, 192, 210, 211
Грахоўскі С. 64, 65, 86, 91, 96, 101, 102, 111, 124, 134, 141, 150, 158, 176, 181, 188, 189, 208, 209, 210
**Д**
Дайнека Л. 16, 29, 33, 39, 40, 55, 75, 76, 77, 96, 97, 104, 115, 123, 132, 135, 136, 143, 151, 165, 171, 177, 185, 189, 193, 226, 227, 228, 229
**З**
Зізюк М. 120
**К**
Кажадуб А. 94
Казлоў А. 33, 40, 52, 77, 92, 105, 115, 116, 147, 165, 171, 177, 189, 229, 230, 231
Казько В. 24, 26, 32, 52, 59, 60, 82, 86, 92, 109, 123, 126, 140, 168, 184, 202, 203
Калюга Л. 32, 40, 48, 52, 90, 94, 100, 108, 140, 146, 151, 154, 174, 180, 184, 199
Касцюкевіч М. 8, 20, 26, 36, 42, 43, 48, 52, 61, 62, 63, 82, 86, 110, 121, 126, 127, 128, 138, 141, 146, 152, 155, 156, 175, 184, 188, 192, 203, 204, 205, 206
Колас У. 16, 223
Колас Я. 17, 80, 83, 97, 105, 106, 124, 132, 137, 138, 144, 148, 152, 166, 231, 234
Кудравец А. 16, 22, 24, 29, 33, 38, 39, 49, 52, 73, 74, 87, 92, 115, 131, 143, 147, 164, 170, 185, 224, 225

Репозиторий БрГУ

| | |
|---|---|
| Куляшоў А. | 28, 33, 39, 45, 73, 87, 104, 114, 135, 163, 164, 189, 223 |
| Купава М. | 16 |
| **Л** | |
| Ластоўскі В. | 8, 12, 38, 90, 109, 120, 126, 148. 168, 175, 184, 192, 203 |
| Левановіч Л. | 12, 26, 54, 60, 61, 90, 140, 148, 152, 154, 155, 168, 193, 203 |
| Ліпскі У. | 32, 36, 38, 42, 48, 52, 56, 58, 82, 90, 108, 120, 150, 154, 168, 174, 184, 198 |
| **М** | |
| Мажылоўскі У. | 26, 54, 63, 94, 110, 144, 192 |
| Марчук Г. | 8, 13, 14, 15, 20, 21, 24, 26, 27, 32, 33, 36, 38, 44, 45, 52, 54, 67, 68, 69, 70, 71, 82, 83, 87, 91, 95, 96, 102, 112, 113, 121, 122, 130, 131, 134, 135, 142, 147, 150, 151, 159, 160, 161, 162, 169, 170, 176, 181, 182, 184, 189, 192, 193, 196, 211, 212, 213, 214, 215, 216 |
| **П** | |
| Папека М. | 29, 75, 115, 132 |
| **Р** | |
| Рубанаў У. | 22, 29, 40, 77, 78, 87, 88, 97, 105, 116, 123, 136, 144, 148, 165, 166, 172, 177, 185, 231, 232 |
| Рублеўская Л. | 8, 9, 15, 16, 21, 22, 27, 28, 36, 38, 45, 54, 55, 71, 72, 87, 96, 102, 103, 104, 114, 122, 131, 135, 142, 143, 151, 162, 163, 170, 176, 182, 185, 196, 216, 217, 218, 219, 220, 221, 222 |
| **С** | |
| Сачанка Б. | 8, 12, 13, 24, 61, 90, 100, 109, 120, 126, 140, 141, 146, 175, 198, 203 |
| **Т** | |
| Татарынаў Ю. | 43, 49, 56, 64, 91, 101, 128, 138, 141, 157, 158, 169, 181, 207, 208 |
| **Ш** | |
| Шыцік У. | 146 |
| **Я** | |
| Ярмольчык Н. | 169 |


Репозиторий БрГУ

## СПІС КРЫНІЦ

1. Адамчык, В. Год нулявы : раман / В. Адамчык. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 396 с.
2. Ажэшка, Э. Хам : аповесць / Э. Ажэшка. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 207 с.
3. Аляхновіч, М. М. Святло дарогі : вершы / М. М. Аляхновіч. – Брэст : Альтернатива, 2010. – 98 с.
4. Афяроўскі, А. Р. Любачка : раман / А. Р. Афяроўскі. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 494 с.
5. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Белкнігазбор, 1998. – 418 с.
6. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 383 с.
7. Белая, А. Кніга жонкі паэта / А. Белая. – Баранавічы : Баранав. гар. арг. грам. аб'яд-ня "Т-ва беларус. мовы імя Ф. Скарыны", 2007. – 132 с.
8. Брыль, Я. Запаветнае : выбр. творы / Я. Брыль. – Мінск : Беллітфонд, 1999. – 448 с.
9. Брыль, Я. Пішу як жыву : аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 363 с.
10. Бядуля, З. Выбраныя творы / З. Бядуля. – Мінск : Белкнігазбор, 2006. – 496 с.
11. Васілевіч, А. Выбраныя творы : у 3 т. / А. Васілевіч. – Т. 1 : Аповесці. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 479 с.
12. Васілевіч, А. Выбраныя творы : у 3 т. / А. Васілевіч. – Т. 3 : Аповесці. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 493 с.
13. Васілевіч, А. Мыс Добрай Надзеі : апавяданні, аповесць / А. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 352 с.
14. Гарэцкі, М. Прысады жыцця : апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.
15. Гілевіч, Н. Выбраныя творы : у 2 т. / Н. Гілевіч. – Т. 1 : Вершы, паэмы, п'есы. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 478 с.
16. Гілевіч, Н. Выбраныя творы : у 2 т. / Н. Гілевіч. – Т. 2 : Родныя дзеці : раман у вершах. Перажыўшы вайну : аповесць. Эсэ. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 471 с.
17. Гніламёдаў, У. В. Вяртанне : раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 429 с.
18. Грахоўскі, С. Выбраныя творы : у 2 т. / С. Грахоўскі. – Т. 1 : Вершы. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 382 с.
19. Грахоўскі, С. Дзве аповесці: Ранні снег. Рудабельская рэспубліка / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 448 с.

Репозиторий БрГУ

20. Грахоўскі, С. Зона маўчання / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 328 с.
21. Грахоўскі, С. Лірыка / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 176 с.
22. Грахоўскі, С. Паэма дарог : вершы і паэма / С. Грахоўскі. – Мінск : Беларусь, 1970. – 128 с.
23. Грахоўскі, С. Тры вымярэнні : выбр. лірыка / С. Грахоўскі. – Мінск : Беларусь, 1967. – 296 с.
24. Грахоўскі, С. Чаканне : вершы / С. Грахоўскі. – Мінск, 1960. – 114 с.
25. Дайнека, Л. М. Меч князя Вячкі. След ваўкалака : раманы / Л. М. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 606 с.
26. Дайнека, Л. М. Назаві сына Канстанцінам : раман / Л. М. Дайнека. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2010. – 448 с.
27. Зізюк, М. Кароль Капайла і яго атачэнне / М. Зізюк // Маладосць. – 2012. – № 12. – С. 38–62.
28. Кажадуб, А. Ваўкалакі / А. Кажадуб // Выкраданне Чарадзея : сучас. фантаст. апавяданне. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 319–327.
29. Казлоў, А. С. Той, хто абганяе сны : аповесці / А. С. Казлоў. – Мінск : Маст. літ., 2014. – 286 с.
30. Казько, В. Суд у Слабадзе : аповесць / В. Казько. – Мінск : Сталія, 2002. – 192 с.
31. Калюга, Л. Ні госць ні гаспадар : апавяданні і аповесці / Л. Калюга. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 290 с.
32. Касцюкевіч, М. Геній – Божы хам?.. / М. Касцюкевіч // Верасень. – 2012. – № 6. – С. 78–87.
33. Касцюкевіч, М. Колеры : паэзія і проза / М. Касцюкевіч. – М. : Рус. путь, 2013. – 381 с.
34. Касцюкевіч, М. Яшчэ жывая Песьня... / М. Касцюкевіч // Дзеяслоў. – 2007. – № 6. – С. 27–161.
35. Колас, У. Перамога // Нар. воля. – 2004. – 2 ліп. – № 120. – С. 2.
36. Колас, Я. Казкі жыцця : апавяданні / Я. Колас. – Мінск : Нар. асвета, 1976. – 110 с.
37. Колас, Я. Раніца ў нядзельку : вершы, апавяданні, казкі / Я. Колас. – Мінск : Беларусь, 1969. – 224 с.
38. Кудравец, А. Сачыненне на вольную тэму : раман, апавяданні. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 285 с.
39. Куляшоў, А. Выбраныя творы / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 206 с.
40. Купава, М. На звалку вывозілі… нашу памяць // Нар. воля. – 2004. – 1 ліп. – № 119. – С. 3.

Репозиторий БрГУ

41. Ластоўскі, В. Бяздоннае багацце : апавяданні, легенды, казкі, аповесці / В. Ластоўскі. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 204 с.

42. Левановіч, Л. Сіняе лета : раман, апавяданні, эсэ / Л. Левановіч. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 358 с.

43. Ліпскі, У. Мы: аповесць пра нашы прозвішчы / У. Ліпскі. – Мінск : Беларусь, 2006. – 262 с.

44. Мажылоўскі, У. Праклён мітрапаліта Феафіла / У. Мажылоўскі // Маладосць. – 2012. – № 10. – С. 13–40.

45. Мажылоўскі, У. Праклён мітрапаліта Феафіла / У. Мажылоўскі // Маладосць. – 2012. – № 11. – С. 13–43.

46. Марчук, Г. Кветкі правінцыі : раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 416 с.

47. Папека, М. Чарнавікі… / М. Папека. – Брэст : Брэсц. друк., 1992. – 92 с.

48. Рубанаў, У. Светлы ручай любві : аповесці / У. Рубанаў. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 413 с.

49. Рублеўская, Л. І. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. І. Рублеўская. – Мінск : Звязда, 2012. – 272 с.

50. Рублеўская, Л. І. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. І. Рублеўская. – Мінск : Звязда, 2014. –320 с.

51. Рублеўская, Л. І. Ночы на Плябанскіх млынах : раман, аповесць, апавяданні / Л. І. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 526 с.

52. Рублеўская, Л. І. Пярсцёнак апошняга імператара : раман, аповесць, апавяданні / Л. І. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 279 с.

53. Сачанка, Б. Апошнія і першыя : аповесці, раман у навелах, апавяданні / Б. Сачанка. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 447 с.

54. Сачанка, Б. Карчоўнік / Б. Сачанка // Выкраданне Чарадзея : сучас. фантаст. апавяданне. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 289–304.

55. Сачанка, Б. Тыя / Б. Сачанка // Выкраданне Чарадзея : сучас. фантаст. апавяданне. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 305–318.

56. Татарынаў, Ю. А. Княгіня Мянжынская : трылогія / Ю. А. Татарынаў. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 286 с.

57. Шыцік, У. Агеньчык у цемры / У. Шыцік // Выкраданне Чарадзея : сучас. фантаст. апавяданне. – Мінск : Маст. літ., 1994. – С. 272–288.

58. Ярмольчык, Н. Абразкі / Н. Ярмольчык // Маладосць. – 2012. – № 12. – С. 25–28.

Репозиторий БрГУ